ЛІТАРАТУРА
І МАСТАЦТВА

ЛіМ

ГАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ

28 лістапада 1997 г. № 48/3924 Кошт 3 000 руб.

"ВУЧУСЯ... ШЧЫРАСЦІ Ў КУПАЛЫ"

Нататкі пра творчасць лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Дануты БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВАЙ з нагоды яе юбілею

6—7

ШРАМЫ НА СЭРЦЫ

Абразкі Леаніда КАЛОДЗЕЖНАГА

8—9, 12

РАТУЙМАСЯ

Уладзімір ІВАНОЎ: "Я не за сухі закон, але я ўсё ж хачу заняць аб'ектыўную пазіцыю і сказаць, што дзяржава можа і павінна ўплываць на гэтыя працэсы і не дапускаць татальнай дэградацыі нацыі".

14—15

"ЛІТАРАТУРА І ПАЛІТЫКА — РОЗНЫЯ РЭЧЫ..."

Таіса БОНДАР: "Патрыятызм для мяне — гатоўнасць аддаць сваю працу, свой талент дзяржаве. Не ўвесь жа ён у тым, каб бегаць з лозунгамі".

16

БУДЗЬМА РАЗАМ!

Шаноўныя чытачы! Працягваецца падпіска на наш тыднёвік на першую палову 1998 года. Падпісацца на "ЛіМ" можна ў любым паштовым аддзяленні.

Кошт тыднёвіка для індывідуальных падпісчыкаў на месяц — 15 тысяч, на квартал — 45 тысяч, на паўгоддзе — 90 тысяч, для ведамасных падпісчыкаў на месяц — 25 тысяч, на квартал — 75 тысяч, на паўгоддзе — 150 тысяч.

Наш індэкс — 63856.

Снягамі засыпаны сцежкі, пагоркі,
Рачулкі святлыня схавана пад лёд...
Гляджу на прастор і мне сумна і горка,
Бо я не бываў тут каторы ўжо год.

І гэтай зімою, відаць, не збяруся,
Каб хоць бы на хвілю згубіцца ў снягах,
У белых, у светлых снягах Беларусі,
Нібыта ў сівых і завейных вяках...

КОЛА ДЗЁН

Адразу пасля падпісання Белавежскіх пагадненняў напрыканцы 1991 года многія незалежныя аглядальнікі і палітыкі сцвярджалі, што СНД — часовая з'ява на абшарах былога СССР і створана гэтая "садружнасць" толькі дзеля таго, каб падзел "саюза рэспублік" на суверэнныя краіны прайшоў для савецкіх людзей не так балюча, быў расцягнуты ў часе. Сёння гэта ўжо стала відавочным. СНД — фікцыя, з соцень падпісаных за амаль шэсць гадоў дакументаў — не "працуе" практычна ніводзін, а незалежныя краіны ў сваёй знешняй і ўнутранай палітыцы становяцца ўсё больш незалежнымі і ад СНД... Дарэчы, вынікам якраз "недзеяздольнасці" СНД і сталі гэтак званыя "саюз чатырох" і "саюз двух", у якія ўвайшла Беларусь, кіраўніцтва якой, складваецца ўражанне, адно толькі і верыць сур'ёзна ў мажлівую рэальную значнасць і жыццяздольнасць СНД. Гэта ў нейкай меры пацвярджаюць і падзеі нядаўніх дзён.

ЗАЯВА ТЫДНЯ

Задоўга да прызначанай на 23 студзеня будучага года сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў-удзельніц СНД прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выступіў з заявай, у якой выказаў сваю занепакоенасць будучыняй садружнасці. Заява гэтая выглядае ўжо як спроба рэанімацыі не СССР, а СНД... Калі і надалей дзяржавы-ўдзельніцы будуць ігнараваць сумесныя рашэнні, то праз 2-3 гады СНД можа зусім знікнуць, сцвярджае А. Лукашэнка. Беларускія СМІ гэтую заяву назвалі сенсацыйнай і выказалі ўпэўненасць, што яна будзе мець гучны рэзананс. Аднак гэтыя надзеі пакуль не апраўдаліся. Затое з нетраў СНД прыйшло іншае паведамленне: Грузія, Украіна, Азербайджан і Малдова вырашылі ўтварыць свой "саюз чатырох" пад імем ГУАМ (першыя літары назваў дзяржаў). Прычым саюз гэты будзе створаны найперш насуперак інтарэсам Расіі (а значыць, і Беларусі, як яе саюзніка).

АДМОВА ТЫДНЯ

Трашчыць па швах і "саюз двух" — Саюз Беларусі і Расіі. Прызначанае на 29 лістапада пасяджэнне Выканаўчага камітэта саюза, на якім меркавалася разгледзець праект агульнага саюзнага бюджэту, не адбудзецца. Прэм'ер-міністр Расіі В. Чарнамырдзін у час візіту ў В'етнам паведаміў, што ў Мінск не паедзе. Яно і зразумела: пра які агульнасаюзны бюджэт можна гаварыць, калі не прыняты ні бюджэт Расіі, ні бюджэт Беларусі на наступны год, калі, зноў жа, не "працуюць" ранейшыя інтэграцыйныя дакументы, калі прорва між эканомікамі Расіі і Беларусі расце і пашыраецца штодзень...

КАНФУЗ ТЫДНЯ

Чарговую мажлівасць заявіць пра сябе як пра рэальную легітымную палітычную сілу на Беларусі зноў не скарысталі дэпутаты Вярхоўнага Савета 13-га склікання, якія не падтрымалі ў лістападаўскія дні 1996 года А. Лукашэнку. Роўна праз год пасля тых дзён яны сабраліся з намерам прыняць рашэнне аб аднаўленні сваіх паўнамоцтваў. Аднак пры галасаванні менавіта па гэтым пытанні ў Вярхоўным Савеце адбыўся раскол: "за" прагаласавалі ў асноўным дэпутаты, якія прадстаўляюць фракцыю "Грамадзянскае дзеянне", "супраць" — камуністы. Каб аднавіць паўнамоцтвы ВС, не хапіла ўсяго двух галасоў. У тым ліку і голаса старшыні былога парламента (так, цяпер ужо дакладна — былога) Сямёна Шарэцкага, які зноў паказаў сябе сапраўдным памяркоўным беларусам, а не лідэрам апазіцыі...

ЗАКРЫЦЦЁ ТЫДНЯ

Гэта здарылася нечакана хутка: у мінулую пятніцу, 21 лістапада, газета "Свабода" паведаміла пра два папярэджанні, якія прыйшлі на яе адрас з Дзяржкамдруку, а ўжо ў панядзелак, 24 лістапада, як напісала сама "Свабода", — "суд выканаў волю прэзідэнта: "Свабоду" закрылі"... Суддзі Вышэйшага гаспадарчага суда для прыняцця гэтага рашэння спатрэбілася ўсяго 15 хвілін. Адною з асноўных прычын закрыцця самай апазіцыйнай газеты стала нібыта парушэнне артыкула 5 Закона аб друку — "распальванне сацыяльнай варожасці ў грамадстве". Дарэчы, "тлумачэнне" гэтага самага 5-га артыкула можа быць настолькі шырокім, што пад яго дзеянне могуць патрапіць не адзін дзесятак публікацый у незалежнай і дзяржаўнай прэсе штодзень. Рэдакцыя "Свабоды" пасля суда заявіла, што газета ўсё роўна будзе выходзіць — падпольна альбо пад новай назвай.

ПРЫЗНАННЕ ТЫДНЯ

Старшыня Вярхоўнага суда Беларусі В. Сукала, выступаючы ў Магілёве на канферэнцыі суддзяў вобласці, сказаў, што апошнім часам узмацніўся ціск дзяржавы на суд, а роля суда ў грамадстве стала прыніжацца. Акрамя дзяржавы, прызнаў В. Сукала, судовыя структуры адчуваюць уціск з боку... сродкаў масавай інфармацыі і апазіцыйных сіл...

ЛІЧБЫ ТЫДНЯ

Газета "Рэспубліка" 26 лістапада г.г. перадрукавала з газеты "Правда-5" артыкул "Укралі "грошы Ельцына": амаль 2 мільярды рублёў". Размова ідзе пра грошы, якія прэзідэнт Расіі паабяцаў перавесці беларускім ветэранам Вялікай Айчыннай вайны на выданне кнігі-падарунка "Сваімі рукамі". Паабяцаў яшчэ ў 1995 годзе, і нібыта слова сваё стрымаў, але гэтыя грошы да ветэранаў па сёння так і не патрапілі: згубіліся недзе пры міжбанкаўскіх аперацыях... Але нас зацікавілі ў гэтым артыкуле іншыя лічбы. Аўтар яго А. Сцепаненка сцвярджае, што на Беларусі з каля 300 тысяч франтавікоў, партызан, удоў загінуўшых — 170 тысяч **рускіх**. Больш за палову. У той час, калі рускія ў насельніцтве Беларусі складаюць крыху больш за 10 працэнтаў. Лічбы — дзіўныя, але не верыць карэспандэнту "Правды" ў іх праўдзівасці — неяк не выпадае...

"ВІДОВІШЧА" ТЫДНЯ

Хоць і позна ноччу, але Беларускае тэлебачанне паказала справаздачу пра рэспубліканскі конкурс КВН, які праходзіў у Магілёве пад эгідай БПСМ. Сумнае, трэба сказаць, было відовішча. Паколькі камандам, па ўсім відаць, было забаронена "жартаваць" на тэмы палітыкі, эканомікі і г.д., то "жарцікі" ў асноўным былі "пра гэта" — г. зн. пра тое, чаго некалі ў СССР не было зусім, альбо пра гарэлку ды п'яніц... Больш чым непрыемна было назіраць за спаборніцтвам у прымітыўнай пошласці, і міжволі ўспаміналіся назаўсёды, здавалася б, мінулыя часы, калі на сцэне і ў друку "нават цэнзура ішла пад цэнзуру..." І з гэтым БПСМ разлічвае пашыраць свае шэрагі?..

НАЗІРАННЕ ТЫДНЯ

Выпаў першы грунтоўны снег. І ўпершыню за апошнія гады вуліцы Мінска некалькі дзён былі нячышчаныя. Калі дарогі сяк-так раз'ездзілі машыны, то на тратуарах мінчукі доўга мясілі мокры снег. Як вядома, дворнікаў у нас даўно не хапае, ды і заробкі ў іх малыя, але дзе ж тыя дзесяткі тысяч беспрацоўных, якія, каб атрымаць дапамогу, згодна з дэкрэтам прэзідэнта, абавязаны штомесяц адпрацаваць 15 гадзін на грамадска-карыснай працы? Тут адно з двух: альбо тых беспрацоўных раптам не стала, альбо ім проста рыдлёўкі забыліся выдаць...

АНОНС

Гайда ў Віцебск!

Колькі ж у нас фестывальных сталіц? У разгары "Беларуская музычная восень", і Мінск зусім слушна завецца ейным цэнтрам. Пошум нядаўняга "Залатога шлягера" спарадзіў пагалоску пра новую "фестывальную сталіцу" — Магілёў. Аднак ніхто не пазбаўляў гэтага бліскучага тытула знаны ў шырокім культурным свеце Віцебск. І горад застаецца Меккай для людзей творчых прафесій, для аматараў самых розных відаў мастацтва, для гісторыкаў культуры...

З панядзелка іх у Віцебску заўважна паболее: першы зімовы месяц пачынаецца тут адразу дзвюма міжнароднымі імпрэзамі. Традыцыйныя, яны сёлета чамусьці супалі па часе правядзення, і праграмы давялося нават "разгружаць". Дзевяты музычны фестываль імя І. Салярцінскага пачнецца 3 снежня — у гэты дзень будзе адзначацца 95-годдзе з дня нараджэння славутага нашага земляка. Назаўтра замоўлены канцэрт Полацкага камернага хору пад кіраўніцтвам Л. Жукавай. І — паўза. Працяг падзей — аж 8-га. Тым часам у цэнтры ўвагі будзе Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі, удзельнікаў і гасцей якога Віцебск прыме з 2 па 6 снежня.

Фестываль імя І. Салярцінскага сёлета прадоўжыцца да 14 снежня і абяцае стацца сапраўднай навукова-асветніцкай акцыяй. Падчас яго, ужо ў шосты раз, пройдуць навуковыя чытанні на тэму "Віцебскі рэнесанс пачатку XX стагоддзя" з удзелам беларускіх навукоўцаў, дзеячаў культуры і мастацтва, а таксама піцерскіх ды маскоўскіх гасцей. Рыхтуюцца выстаўкі мастакоў-педагогаў Віцебшчыны, а таксама іх калегаў з Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга. У планах — разнастайныя канцэртныя праграмы.

Міжнародны ўзровень фестывалю імя І. Салярцінскага ягоныя арганізатары на чале з дырэктарам абласной філармоніі У. Правілавым годна трымаюць. Побач з нязменным удзельнікам імпрэзаў беларускім ансамблем салістаў "Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам У. Байдава выступяць прызёры Усегерманскага конкурсу "Юнацтва музіцыруе" — фартэпіяннае "Фрыдэг-трыо"; дуэт са Швейцарыі Б. Меер (флейта) ды Х. Ёнкерс (гітара); расійскія музыканты — "Санкт-Петэрс-трыо", кампазітары І. Сакалоў (Масква) ды Б. Цішчанка (Пецярбург), спевакі В. Кондзіна (Пецярбург), С. Савенка (Масква) ды інш.

Будзе гучаць музыка М. Радзівіла, Н. Орды, Я. Голанда, М. Кл. Агінскага, В. Моцарта, Ф. Шуберта, Я. Брамса, П. Чайкоўскага, М. Рымскага-Корсакава, Д. Шастаковіча, Г. Свірыдава, Г. Гарэлавай, А. Літвіноўскага, В. Войціка, В. Кузняцова... Тут і еўрапейская класіка, і даўніна беларуская, і наша сучаснасць.

Сапраўдныя інтэрнацыянальныя праграмы прысвячаюцца 200-годдзю з дня нараджэння Г. Гейнэ, 200-годдзю з дня нараджэння Ф. Шуберта: удзельнічаюць у іх беларускія, германскія, швейцарскія музыканты, студэнты Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, дзеячы культуры Віцебска...

Выступленне ансамбля салістаў Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі — духавога квінтэта пад кіраўніцтвам Б. Нічкова завершыць фестываль. І — прагучыць своеасаблівай уверцюрай да Дзён творчай інтэлігенцыі Віцебска "Сузор'е Музаў", абвешчаных на другую палову снежня.

С. Б.

ЮБІЛЕІ

...З ноткамі маркоты

"Ну, і як уражанні?" — "Розныя..." Рэплікамі такога кшталту маглі абмяняцца тыя, хто не патрапіў на ўрачысты канцэрт з нагоды юбілею Беларускай дзяржаўнай філармоніі, і тыя, хто там быў.

Пайменавалі імпрэзу менавіта ўрачыстым канцэртам, што засцерагала яе ад панавання размоўнага жанру і не абавязвала трымацца межаў манатонна-бадзёрага мажору. Магчымасць выказацца мелі ў той вечар многія, але — праз музыку. Пераважна. І нават напачатку было не слова: гукі арганнай прэлюдыі нібыта сышлі ў залу з нябачных вышыняў урачыста-мінорным казаннем філосафа Баха... І толькі потым выйшаў на сцэну вядучы — нязменны У. Шаліхін! — і назваў добра вядомае імя выканаўцы: Алег Янчанка.

Міністр культуры А. Сасноўскі кароткім словам павітаў шматлікіх рупліўцаў філарманічнага мастацтва, параўнаўшы яго з крынічнаю вадой, і прачытаў віншаванне ад Прэзідэнта А. Лукашэнкі. (Яно шырока публікавалася ў перыёдыцы як на мове арыгінала, так і ў перакладзе на беларускую).

З бляскам выступілі ў той вечар гадаванцы маэстра В. Роўды — лаўрэат міжнародных конкурсаў хор студэнтаў Беларускай акадэміі музыкі; лаўрэат міжнародных конкурсаў студэнт акадэміі Андрэй Паначэўны; Ансамбль салістаў Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі — духавы актэт пад кіраўніцтвам Б. Нічкова. Авацыю выклікала фантастычнае гранне аўстрыйскай скрыпачкі Доры Шварцберг у далікатным партнёрстве з нашым піяністам Юрыем Гільдзюком. І як зямны Боскі цуд успрымалася майстэрства Аркестра каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі з салістамі-скрыпачамі Алегам Яцынам ды Ксеняй Бельцюковай, віяланчэлістам Аляксеем Кісялёвым — пад кіраўніцтвам непараўнальнага Уладзіміра Перліна!

Акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі з дырыжорам Мішам Кацам, Дзяржаўны камерны хор пад кіраўніцтвам Ігара Мацюхова, капэла хлопчыкаў каледжа пры БАМ пад кіраўніцтвам Уладзіміра Глушакова, шырмаўцы з Людмілай Яфімавай, салісты-жыновічаўцы, "залаты" трубач Андрэй Кавалінскі, вядучы бас Нацыянальнага тэатра оперы Алег Мельнікаў — гэта яшчэ не поўны спіс удзельнікаў таго ўрачыстага вечара.

Вечара, які сабраў разам далёка не ўсіх сяброў, прыхільнікаў, артыстаў, гасцей Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Вечара, які поўніўся ўзорамі заходнееўрапейскай і рускай праваслаўнай музыкі (дарэчы, са сцэны было зачытана віншаванне Мітрапаліта Філарэта) і ў атмасферы якога ледзь не згубіўся голас беларускіх творцаў. (Не-не, упікнуць у "непавазе да свайго, нацыянальнага рэпертуару" не выпадае: быў жа інструментальны найгрыш У. Курыяна, была песня Ю. Семянякі...).

Вечара, які надараецца раз на 60 гадоў і які не стаўся падзеяй, вартай увагі роднага Беларускага тэлебачання...

Так што калі вам не пашчасціла спрычыніцца да аншлагавай атмасферы юбілею, не спадзявайцеся "дагнаць" падзею хаця б праз паўгода з дапамогаю экрана...

С. БЕРАСЦЕНЬ

ІМПРЭЗЫ

У гонар Пашкевічанкі

Дылогія Валянціны Коўтун "Крыж міласэрнасці" выйшла не толькі ў Мінску, але і ў Вільні ў перакладзе на літоўскую мову. Так што ў музеі Янкі Купалы адбылася як бы "падвойная" прэзентацыя. Ёй папярэдчала прэс-канферэнцыя ў Доме літаратара, якая больш нагадвала сустрэчу даўніх сяброў: з невялікай, але прадстаўнічай дэлегацыі Літвы амаль усе мелі творчыя і асабістыя кантакты з беларускімі калегамі. Можа, таму і прадстаўленне іх прайшло жыва і нязмушана. А прыехалі да нас Альма Лапінскене — старшыня суполкі беларусістаў Літвы, перакладчыца беларускай прозы, у тым ліку — "Крыжа міласэрнасці"; Броня Бальчэне — перакладчыца з англійскай, латышскай і іншых моў, супрацоўніца прыватнага выдавецтва "Alma littera", якому В. Коўтун і абавязана перакладным выданнем; Пятрас Бражэнас — вядомы крытык, прафесар і акадэмік, яго ведаюць і па Доме творчасці "Іслач"; і нарэшце сам старшыня Саюза пісьменнікаў Літвы Валянцінас Свянціцкас, таксама крытык і — мяркуючы па дасціпнасці — вялікі гумарыст.

З нашага боку ўдзельнічалі, разам з кіраўнікамі саюза, А. Разанаў, С. Законнікаў, Х. Лялько, А. Пісьмянкоў, Г. Далідовіч, М. Шавыркін, аташэ па культуры пасольства РБ у Літве В. Жлутка, прадстаўнікі газет і часопісаў.

На ўласна прэзентацыі да названых далучыліся народныя: Ніл Гілевіч адкрываў вечарыну, а Марыя Захарэвіч прачытала ўрывак з рамана. Аташэ па культуры пасольства Літвы ў РБ Д. Трынкунас падараваў В. Коўтун альбом пра старую Вільню, а адтуль пасольства Беларусі прыслала аўтарцы 50 асобнікаў яе новай кніжкі.

Вось што казалі госці пра твор, прысвечаны адной з пачынальніц нашай літаратуры — Цётцы.

Б. Бальчэне: "Гэтую кнігу нарадзіла любоў — любоў Алаізы да свайго народа, любоў Валянціны Коўтун да сваёй гераіні. Сваёй настольнай кнігай назваў "Крыж міласэрнасці" адзін з сённяшніх прэтэндэнтаў у прэзідэнты літоўскай дзяржавы".

А. Лапінскене: "Ідэя перакладу ўзнікла ў мяне яшчэ ў 1988 годзе, калі была напісана першая частка дылогіі. Паўплывалі тэматыка, мастацкія якасці твора, літоўскія старонкі ў ім і, вядома ж, тая акалічнасць, што А. Пашкевіч была жонкай першага літоўскага дэмакрата С. Кейрыса. Праца была па-сапраўднаму творчай, бо перакладаць давялося не толькі Коўтун, але і Цётку".

У імпрэзе прынялі ўдзел пасол Балгарыі М. Ганчаў, консул Эстоніі У. Рэдпал, госці з Польшчы, Расіі, ЗША, прадстаўнікі літоўскай і ўкраінскай дыяспар. Мясцовыя ўкраінцы хораша праспявалі некалькі песень, такім быў іх дарунак пісьменніцы.

Аўтарцы заставалася адно дзякаваць усім, хто спрычыніўся да выдання рамана і хто прыйшоў на яго прадстаўленне ў гасцінны дом Купалы. "Я толькі пасрэднік паміж Алаізай і вамі", — сціпла сказала яна. Партрэт маладой Пашкевічанкі ў атачэнні жывых кветак па-свойму пацвярджаў шчырасць такога прызнання.

Г. К.

КІНО

Пачуць рэха

Мінскі Інстытут імя Гётэ і кінастудыя "Таццяна" наладзілі ў Мінску прагляд фільмаў, якія атрымалі ўзнагароды IV Міжнароднага фестывалю жаночага кіно. Частка фільмаў дэманстравалася з 19 па 21 лістапада ў канферэнц-зале "Белінтурыста". Працяг будзе там жа 8 — 10 студзеня. Фільмы дакументальныя, ігравыя, анімацыйныя. Гэта культурная панарама сённяшняй Германіі. Стылістыка фільмаў значна адрозніваецца ад той, да якой прызвычаіўся наш тэле- і кінаглядач і за савецкі час і падчас "амерыканізацыі" нашага тэле- і кінаэкрана. У некаторых выпадках нават незразумела, чым кіравалася журы фестывалю, адзначыўшы менавіта гэтыя фільмы. Але тыя, хто патрапіў на прагляд, маюць падставы быць удзячнымі арганізатарам за вось такое знаёмства з Германіяй. Да прагляду фестывальных фільмаў была прымеркавана прэм'ера відэафільма Юрыя Хашчавацкага "Рэха маўчання". Фільм прысвечаны, а дакладней — зроблены па матывах аднайменнай фотавыставы да дзесяцігоддзя чарнобыльскай катастрофы. І здымкі фільма, і арганізацыя зроблены па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам Веры Багальянц, дырэктара Нямецкага культурнага цэнтра імя Гётэ (звычайна яго называюць проста "Інстытут Гётэ") у Мінску. У выставе "Рэха маўчання" бралі ўдзел Ігар Саўчанка, Сяргей Кажамякін, Галіна Маскалёва, Уладзімір Шахлевіч. І выстава, і відэафільм былі спробаю ўбачыць чарнобыльскую трагедыю ў нязвыклым ракурсе, сказаць аб ёй іншымі словамі, асэнсаваць філасофскі нашу рэчаіснасць, якую Святлана Алексіевіч назвала "светам пасля Трэцяй сусветнай вайны". Менавіта так і выказалася пісьменніца па абмеркаванні відэафільма Ю. Хашчавацкага: "З намі адбылося тое, чаго яшчэ ні з кім не было. Мы народ, які жыве пасля Трэцяй сусветнай вайны. Мы шмат гаворым пра тое, з чым Беларусь прыйдзе ў сусветную супольнасць. У сусветную супольнасць мы прыйдзем менавіта з гэтым вопытам. Чарнобыль памяняў усё. У нас дагэтуль культура пакрыўджаных, культура тых, хто скардзіцца свету на лёс. Але стагоддзямі скардзяцца свету Індыя, Афрыка — і што з таго? Нам трэба выйсці з гэтага заганнага кола. А для гэтага на філасофскім узроўні асэнсаваць, што ж з намі адбылося".

Юрый Хашчавацкі лічыць, што фактычна і псіхалагічна мы жывём у розных цывілізацыях і аднойчы рызыкуем адчуць, што нашы каштоўнасці нікому непатрэбныя, у тым ліку і нам самім. Нельга ісці на атам з рыдлёўкамі, нельга ісці з нашымі стэрэатыпамі ў XXI стагоддзе.

Прагляд будзе працягнуты ў студзені. Перад сеансамі будзе дэманстравацца відэафільм Ю. Хашчавацкага "Рэха маўчання".

П. ВАСІЛЕЎСКІ

ВЕЧНАЕ

Скарбы святой зямлі

У гэтыя дні на факультэце тэалогіі Еўрапейскага Гуманітарнага Універсітэта куды шмат людней, чым у звычайныя дні. Падставай таму — выстава "Ад святой зямлі да ўсіх народаў. Распаўсюджванне хрысціянства ў першыя стагоддзі", прысвечаная 2000-годдзю Хрысціянства. З экспанатамі можна пазнаёміцца самому, а можна, калі завітаў не адзін, і разам з экскурсаводам. У гэтай ролі выступаюць студэнты згаданага факультэта.

Пачатак выставы быў пакладзены ў сакавіку 1996 года, калі Асацыяцыя "Форум за дружбу народаў" арганізавала ў Раміні (Італія) экспазіцыю, больш 350 экспанатаў якой, узятых з 30 музеяў свету, расказвалі пра гісторыю ранняга хрысціянства. А паглядзець было што. Далёка не кожнаму можа надарыцца магчымасць завітаць у Брытанскі музей, ці тым больш, у Іерусалімскае ўпраўленне старажытнасцей, або пазнаёміцца з багатымі скарбамі, якія захоўваюцца ў Папскай свята-археалагічнай камісіі.

Тады ж, прымаючы пад увагу вялікую цікавасць да выставы і разумеючы, што экспанаты ніяк не выпадае вазіць з месца на месца, былі прыняты захады, каб матэрыялы, прадстаўленыя на ёй, сфатаграфаваць. І вось Беларускі Рэспубліканскі Хрысціянскі Узорны фонд імя святых Мяфодзія і Кірылы пры садзеянні цэнтра "Хрысціянская Расія" з Італіі і Хрысціянскай духоўнай бібліятэкі з Расіі арганізавалі выставу "Ад святой зямлі да ўсіх народаў" у Мінску.

Чатыры раздзелы выставы — быццам чатыры прыступкі, якія вядуць у храм духоўнасці і дазваляюць душэўна ачысціцца ад друзу паўсядзённасці, задумацца над вечным. Можна даведацца якой была Палесціна ў часы Хрыста, пра жыццё Царквы ў II і III стагоддзях, вандраваннях алосталаў, у выніку чаго з'явіліся хрысціянскія абшчыны там, дзе перакрыжоўваліся шляхі розных народаў...

Уражваюць фрагменты папіруса з Кумранскай пячоры с тэкстам Евангелля, які датуецца 68 годам, прадметы першых хрысціян, творы мастацтва розных часоў. Нельга прайсці міма копіі надпісу, што захаваўся праз стагоддзі на камені і сведчыць аб тым, што Понцій Пілат быў рэальнай асобай.

Н. К.

СУСТРЭЧЫ

"Беларусы Сакольшчыны"

16 лістапада беларускую грамаду сустракала польская Саколка. Горад гэты добра вядомы беларусам, што па розных справах едуць у Польшчу, як адзін з першых памежных прыстанкаў. Большасць з іх успрымаюць Саколку, ці па-польску — Сакулку, як чужы замежны край, і не маюць ніякага ўяўлення пра беларускія карані на Сакольшчыне. Каб запоўніць гэтыя "белыя плямы" ў нашых ведах і была арганізавана ў Саколцы навуковая канферэнцыя "Беларусы Сакольшчыны". Арганізатарам яе было Беларускае гістарычнае таварыства ў Польшчы і, найперш, яго кіраўнік, гісторык, грамадскі дзеяч Алег Латышонак з Беластока. Пасяджэнні адбываліся ў Сакольскім Доме культуры. Прысутнічалі беларускія навукоўцы з Польшчы і з Беларусі.

Са змястоўнымі дакладамі выступілі Эдвард Зайкоўскі, Уладзімір Сосна і Валянцін Голубеў з Мінска, Генадзь Семянчук, Сяргей Токць і Ігар Жук з Гародні, Алена Глагоўская з Гданьска, Вячаслаў Харужы і Алег Латышонак з Беластока.

Была наладжана выстава дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Сакольшчыны. Гэты рэгіён у беларускай гісторыі займае своеасаблівае месца. Сакольшчына дала жыццё многім вядомым беларускім дзеячам. Адсюль паходзяць — Зоська Верас, Мікалай Чарнецкі, Уладзіслаў Казлоўскі, Янка Чарапук, кампазітар Янка Тарасевіч і інш.

Як падкрэслівалі многія дакладчыкі, Сакольшчына з даўніх часоў славілася сваім вольным духам, тут быў большы чым у іншых месцах працэнт вольных сялян. Па свайму нацыянальнаму складу Сакольшчына адрознівалася найбольшай колькасцю менавіта беларускага насельніцтва: больш 80 працэнтаў пра яе гаварылі, як пра самы беларускі рэгіён. Ішла размова і пра беларускую праваслаўную царкву на Сакольшчыне. У канферэнцыі браў удзел айцец Уладзімір Місеюк, які працуе ў царкве ў Саколцы. Айцец Уладзімір запомніўся многім сваім палымяным выступленнем на Першым з'ездзе беларусаў свету ў 1993 годзе.

На завяршэнне канферэнцыі адбыўся канцэрт вядомага опернага спевака, кіраўніка "Беларускай капэлы", даследчыка гісторыі беларускай музыкі Віктара Скорабагатава і яго акампаніятара Ганны Каржанеўскай. В. Скорабагатаў выступіў на канферэнцыі з дакладам пра кампазітара Яна Тарасевіча. Яму ўдалося знайсці таксама гэтым разам і магілку кампазітара.

Зроблены яшчэ адзін важкі крок у вывучэнні гісторыі беларускай прысутнасці на Беласточчыне. Гэтая прысутнасць не павінна адысці ў нябыт. Агеньчык беларускага нацыянальнага жыцця яшчэ гарыць у гэтым краі.

Ганна СУРМАЧ

ЗВАРОТ

Падтрымайце творчую моладзь

Калектыў рэдакцыі часопіса "Першацвет" і ўсе першацветаўцы Беларусі звярнуліся з адкрытым лістом да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў сувязі з прынятым 12 лістапада 1997 г. на нарадзе ў намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь рашэннем аб немэтазгоднасці ўключэння часопіса маладых літаратараў Беларусі "Першацвет" у пералік перыядычных выданняў, што фінансуюцца праз Дзяржкамдрук у 1998 г.

"Як можна лічыць немэтазгоднай справу, — гаворыцца ў лісце, — якая скіравана ў будучыню, калі ва ўсім свеце ідзе арыентацыя на творчасць у выхаванні і адукацыі? І ці не супярэчыць, урэшце, прынятае рашэнне Вашай палітыцы падтрымкі моладзі?

Мы — дзяржаўнае выданне. Такім наш часопіс засноўваўся і такім, на нашае меркаванне, ён павінен застацца — незалежным ад якіх бы там ні было камерцыйных ці палітычных інтарэсаў.

Прынцыпова разабраўшыся ў нашай справе, Вы праявіце клопат не толькі аб беларускай моладзі і яе часопісе, але і аб Беларусі, на будучыню якой мы працуем".

НОВАЕ

Электронная БелЭн

Дагэтуль у Беларусі адсутнічае практыка рэгулярнага перавыдання энцыклапедычных кніг. Надрукаваныя энцыклапедыі з-за невялікага тыражу хутка становяцца рарытэтамі. Эканамічная і палітычная сітуацыі ў краіне не абяцаюць большай увагі да перавыданняў паўнацэнных беларускіх энцыклапедый. І гэта робіць вельмі каштоўным праект Беларускага інстытута праблем культуры (структуры Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь) па стварэнні электроннай энцыклапедыі беларускай культуры. Ідэя стварэння яе нарадзілася ў Беларускім інстытуце праблем культуры ў 1996 годзе. Ініцыятары праекта матывуюць яго з'яўленне беларускім адраджэннем, неабходнасцю тыражаваць беларускія выданні і праблемамі з тыражаваннем, а таксама магчымасцю з дапамогай сучаснай электроннай тэхналогіі даць грунтоўны агляд беларускай культуры для шырокага спажыўца. Упершыню ў гісторыі будзе прадстаўлены агляд духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў у мультымедыйнай форме, якая спалучае друкаванае слова, статычны й рухомы вобраз, а таксама музыку. Стваральнікі электроннай энцыклапедыі Беларусі разлічваюць на матэрыяльную дапамогу дзяржавы. Першы прарэктар Беларускага інстытута праблем культуры, доктар філалагічных навук Арнольд Міхневіч расказаў пра праект:

— Першыя выпускі дыскаў энцыклапедыі беларускай культуры будуць пра беларускі абраз, беларускі іканапіс, беларускі касцюм і архітэктуру Беларусі. Гэта вельмі дарагое мерапрыемства, і хацеў бы адразу сказаць, што задума распачаць стварэнне такой энцыклапедыі атрымала падтрымку Міністэрства культуры. Яно падтрымлівае нас не толькі на словах, маўляў, рабіце хлопцы, гэта карысная справа, але і матэрыяльна. Мы ўжо набылі пэўную тэхніку, абяцаюць яшчэ. Паскардзіцца на няўвагу не можам. Для працы над зместам і якасцю электроннай энцыклапедыі беларускай культуры створаны групы прафесіяналаў — мастацтвазнаўцаў, музыказнаўцаў, тэхнічная група. Для пачатку серыі дыскаў выбраны беларускі іканапіс. Наш абраз патрабуе прапаганды, бо абраз з'яўляецца не толькі элементам культуры, але й праявай вялікага мастацтва, да ўсяго ж, гэты дыск будзе добрым аксесуарам для храмаў. Ужо ў наступным годзе дыск беларускі іканапіс павінен паявіцца на рынку. Цяпер распачынаецца праца над шэрагам новых тэматычных дыскаў — беларускі тэатр, гісторыя беларускага мастацтва, беларуская музыка народная і прафесійная, урэшце, асобна — беларуская мова. Я хацеў бы зрабіць дыск "Беларуская мова. Энцыклапедыя". Дапоўніць яго тым, што патрабуе сённяшні час. Гэты дыск можа стаць незаменным у школе, на кожным уроку мовы.

Выпуск электроннай энцыклапедыі — гэта адначасова ініцыятыва і эксперымент маладога навукова-даследчага інстытута, якому толькі шэсць гадоў. Паводле слоў прафесара Міхневіча, калі ўдадуцца першыя дыскі энцыклапедыі культуры Беларусі, яе стваральнікі возьмуцца й за стварэнне асобнай школьнай серыі. Напрыканцы першы прарэктар Беларускага інстытута праблем культуры доктар філалагічных навук Арнольд Міхневіч падкрэсліў, што стваральнікам электроннай энцыклапедыі беларускай культуры вельмі патрэбна належная зацікаўленасць грамадскасці да іх справы.

Вольга КАРАТКЕВІЧ

З НАГОДЫ

І дома, і замужам...

Мінуў год з тае падзеі, якую адны называюць усенародным рэферэндумам, другія лічаць дзяржаўным пераваротам, у выніку якога ў Беларусі ўсталявалася дыктатура. Улада адзначыла гадавіну сваёй перамогі шэсцем і мітынгам адроджанага камсамола, апазіцыя гадавіну сваёй паразы — таксама шэсцем і мітынгам. Абодва мітынгі прайшлі на пляцы перад тэатрам оперы і балета. Па афіцыйных дадзеных у першым мітынгу бралі ўдзел каля трох тысяч. Мітынг апазіцыі сабраў людзей значна болей. Калона рухалася ад плошчы Коласа па вуліцы Чырвонай, потым па Камуністычнай і Куйбышава — да плошчы Парыжскай камуны. Шэсце не адхілялася ад запланаванага маршруту. Правакацый і наступу з боку міліцыі гэтым разам не было. Над грамадою луналі нацыянальныя сцягі Беларусі і сінія з залатымі зоркамі ў крузе сцягі аб'яднанай Еўропы.

Гаворка на мітынгу ішла аб пагаршэнні жыцця за год, што прайшоў з часу "рэферэндуму". Вінцук Вячорка зачытаў зварот лідэра БНФ Зянона Пазняка, у якім галоўнай мэтай апазіцыі называецца ліквідацыя інстытута прэзідэнцтва ў Беларусі, вяртанне да парламенцкай рэспублікі. У выступленнях былі спадзяванні на новую вясну, на тое, што незадаволенасць, якую людзі сёння выказваюць на сваіх кухнях, выльецца на гарадскія вуліцы. На заканчэнне ўдзельнікі мітынгу растапталі пудзіла, якое сімвалізавала дыктатуру. Шэсце і мітынг яшчэ раз засведчылі наяўнасць у краіне апазіцыі, але застаецца пытанне: на што сёння апазіцыя здольная, ці можа яна перамяніць сітуацыю на сваю карысць? Шчыра кажучы, падстаў для аптымізму мала. Кожны свядомы "нацыяналіст" недзе ў глыбіні душы спадзяецца, што аднойчы на мітынг апазіцыі з'явіцца тысяч сто народу, і пытанне, што называецца, будзе вырашана. Але вулічныя баталіі ў нашых умовах толькі фон для той барацьбы, што ідзе ў калідорах улады. Дэманстранты гэта ў нейкім сэнсе — паспалітае рушэнне, а бюракраты, чынавенства — рэгулярная армія, моцная сваёй арганізаванасцю. Ці былі ў гісторыі выпадкі, калі армія мела паразу ад паспалітага рушэння? Былі, але звычайна бывала наадварот. Пэўныя поспехі дэмакратыі ў Беларусі ў нядаўні час былі абумоўлены той акалічнасцю, што інтарэсы народа аб'ектыўна супадалі з інтарэсамі чынавенства. Таму і была абвешчана Незалежнасць, Вярхоўны Савет зацвердзіў Белавежскія пагадненні, таму над урадавымі ўстановамі лунаў бел-чырвона-белы сцяг.

Не выключана, што своеасаблівы падарунак апазіцыі зробіць прэзідэнт, крок за крокам "запрыгоньваючы" чыноўніка, робячы стан чынавенства ўсё больш няпэўным і нават небяспечным. Гэта яшчэ будзе... А пакуль апазіцыя няздольная нават скарыстаць сітуацыю "двухуладдзя", калі ў вачах сусветнай супольнасці адзінай легітымнай уладай застаецца Вярхоўны Савет. Дэпутатам ВС, што засталіся пры Канстытуцыі-94, падабаецца сітуацыя, калі яны легітымныя, але неправамоцныя. Бо ў такім выпадку можна быць, як кажуць у народзе, і дома, і замужам. І з апазіцыяй лічыцца і з рэжымам не сварыцца. Быць на самай справе клубам адстаўных палітыкаў, але раз'язджаць па свеце ў якасці законнай улады Беларусі. І спакойна чакаць, калі народ пры змене палітычнай сітуацыі немаведама за якія заслугі зноў пакліча іх "на царства".

Напярэдадні гадавіны "рэферэндуму" ВС зноў ухіліўся ад вырашэння пытання сваёй правамоцнасці, хоць вырашыць яго можна было простым галасаваннем. Што ж, калі парламентарыі не зрабілі ніякіх высноў з падзей леташняй восені, дык чаго ж крыўдаваць на электарат...

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

ЛіМ ЧАСАПІС

"Мы ўдзячны Вам..."

Увесь гэты тыдзень праводзіліся на Віцебшчыне літаратурныя сустрэчы, прысвечаныя ўгодкам Уладзіміра Караткевіча. Наладзіў сустрэчы і паклапаціўся пра іх матэрыяльнае забеспячэнне, як ні дзіўна, не Саюз пісьменнікаў, а Беларускі народны фронт.

На мінулым тыдні адзначыла сваё 75-годдзе сястра У. Караткевіча Наталля Сямёнаўна. З літаратараў нашых гэта зноў жа нікому не сталася да галавы, а вось аднакурснікі Караткевіча з Кіева прыехалі павіншаваць юбілярку, не забыліся пра яе і землякі, даслалі віншаванні:

"Мы ўдзячны Вам за тое, што Вы захоўваеце памяць пра вашага брата, за шчодрасць душы, дапамогу, якую вы аказваеце даследчыкам у вывучэнні творчай спадчыны У. С. Караткевіча... Для нас Вы з'яўляецеся прыкладам бездакорных, строгіх і чыстых адносін да захавання ўсяго, што звязана з яго імем... Дазвольце пажадаць Вам выдатнага здароўя, бадзёрасці, шчасця і доўгіх гадоў жыцця".

Рэдакцыя "ЛіМа" далучаецца да гэтых шчырых слоў віншавання аршанцаў.

На здымку: сястра У. Караткевіча Наталля Сямёнаўна з мужам Іванам Мікалаевічам.

Заслужаная ўзнагарода

У Нямеччыне добра ведаюць творчасць Святланы Алексіевіч — там выдадзена пяць кніг беларускай пісьменніцы. Нядаўна прыйшло прыемнае паведамленне — за кнігу "Чарнобыльская малітва. Хроніка Будучыні". Святлане Алексіевіч прысуджана міжнародная прэмія "За еўрапейскае ўзаемаразуменне", заснаваная нямецкімі кніжнымі ярмаркамі. Прычым у якасці кандыдатаў на гэтую прэмію разглядалася больш за трыста кніг, што робіць перамогу яшчэ больш значнай.

Прэмія будзе ўручана 27 сакавіка, у дзень адкрыцця знакамітай кніжнай ярмаркі ў Лейпцыгу. Дарэчы будзе згадаць, што на Беларусі "Чарнобыльская малітва" Святланы Алексіевіч дагэтуль не выдадзеная. Сумная традыцыя любавацца на адлюстраванае святло працягваецца? Некаторыя параўноўваюць творчасць Святланы Алексіевіч з шокатэрапіяй — настолькі моцнае, неадназначнае ўражанне пакідаюць у чытача яе кнігі. Што ж, лячэнне праўдай — не самая лёгкая працэдура. Але яшчэ горш для здароўя грамадства баяцца і пазбягаць яе.

Н. К.

Запрашаем на канферэнцыю

15 снежня а 10 гадзіне ў Мінску ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя "Лёс нацыянальнай культуры на паваротах гісторыі".

Заяўкі да ўдзелу прымаюцца да 5 снежня 1997 года.

Па дадатковую інфармацыю звяртацца па тэлефоне 34-07-61.

Адрас музея: 220029 г. Мінск, вул. М. Багдановіча 7-а.

Творцы — супраць СНІДа

Працягваюцца мерапрыемствы, накіраваныя супраць хваробы XX стагоддзя — СНІДа. Сярод іх — дабрачынная акцыя "Дзеячы культуры, мастацтва і творчая моладзь супраць СНІДа", якая адбудзецца 29 лістапада 1997 года ў Палацы лёгкай атлетыкі, што знаходзіцца ва Уручы на вуліцы Спартыўнай, 8-а.

Уваход свабодны, пачатак — у 18 гадзін.

У акцыі прымуць удзел маладзёжныя калектывы "Пані Хіда", "Троіца", "Метэор", "P.S.", а таксама вядомы выканаўца Аляксей Шадзько.

МЕРКАВАННЕ

Ці надыдзе час "збіраць камяні"?

16 лістапада вёска адзначала сваё "прафесійнае" свята з надзвычай доўгай афіцыйнай назвай — Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу. На месца ў кнізе рэкордаў Гінеса назва гэтая "не цягне", але ў саміх "работнікаў", мусіць, выклікае пачуццё законнага гонару, бо даўжэйшай назвы свята, бадай што, у іншых "отраслей" народнай гаспадркі няма.

З якімі поспехамі прыйшлі да гэтага свята "работнікі" і іх начальства? Што да начальства, прычым самага галоўнага, то яно якраз напярэдадні свята "загрымела пад фанфары", пакінуўшы размовы пра тыя поспехі іншым. І іншыя гаварылі, і нават вельмі пранікнёна і прыгожа. Адно толькі — было трохі меней, чым звычайна, згадак пра "выдающиеся" поспехі. Што да саміх хлебаробаў, то яны ў асноўным слухалі. Прычым вельмі ўважліва і з вялікім даверам, што і засведчыла Беларускае тэлебачанне ў святочны дзень на прыкладзе аднаго "асобна ўзятага" калгаса, слава якога раней грымела не толькі па ўсёй Беларусі, але і па ўсім СССР. Трэба прызнаць, што сцэна была надзвычай кранальная, асабліва калі камера паказвала выраз твару слухачоў і аратараў буйным планам. І быў той выраз даволі пэўным.

Дарэмна аўтар "святочнага" артыкула ў недзяржаўным сродку масавай інфармацыі "Народнай волі" рытарычна "вопрошает" у гэтых уважлівых слухачоў, маўляў, "няўжо ім не надакучыла такое жыццё і такія трафарэтныя падсалоджаныя размовы?..", і "ці не час ужо спытацца ў традыцыйных аратараў пра тое, што ўсіх нас моцна турбуе?" Дзіўныя, трэба сказаць, пытанні паважанай газеты, кіруемай такім шаноўным зубрам журналістыкі, як І. Сярэдзіч. Як быццам "Народная воля" сёння з неба звалілася і зусім не бачыць, што "не час", нават "зусім не час" ні "збіраць камяні", ні, тым больш, іх "раскідаць".

У гэтым аўтару гэтых радкоў давялося пераканацца падчас наведвання з пэўнай нагоды сваёй роднай вёскі, што на Гродзеншчыне.

Мае землякі — людзі надзвычай працавітыя і руплівыя. Пра гэта сведчаць, напрыклад, дабротныя і ладныя хаты ў вёсцы, зробленыя, як кажуць, "на вякі" — і для ўнукаў, і для праўнукаў. Іншая справа, што тыя ўнукі і праўнукі сёння жывуць далёка ад тых хатаў. Сведчылі калісь і сады, якія былі амаль у кожнага вясковага жыхара — вялікія і багатыя, з разнастайнымі (вочы разбягаліся!) гатункамі яблык, груш, сліў, вішань і г.д. А ўжо які смак у іх быў...

Сёння тых садоў засталося няшмат...

Мясцовы старшыня калгаса — сімпатычны і разумны чалавек, які зусім нядаўна прыйшоў "на должность", выказаўся ў гэтым сэнсе адназначна: "Стваральны народ! Але пастарэў моцна..." Ва ўсім калгасе (а гэта, акрамя маёй вёскі, яшчэ 7) на 450 працаўнікоў — 720 пенсіянераў. Назваў старшыня і лічбы цяперашняга заробку маіх землякоў-стваральнікаў, якія, дарэчы, істотна адрозніваліся ад "сярэдніх", прыведзеных ва ўжо згаданым намі матэрыяле ў "Народнай волі" (1 млн. 446 тыс. рублёў). "Звычайныя" калгаснікі і калгасніцы маюць заробак 700—800 тыс. рублёў у месяц, толькі механізатары і даяркі — "мільянеры". Адзін з маіх аднагодкаў, што застаўся воляю лёсу ў калгасе і працуе спецыялістам па эксплуатацыі жывёлагадоўчае фермы, мае, як ён сказаў, "стабільны лімон", які, праўда, "стабільна" затрымліваюць. Затое трымае карову, цялушку, некалькі свіней ("Трэба ж дзяцей нечым карміць!").

Што да "сярэдняй" лічбы, то, па ўсім відаць, яе і сёння істотна вызначаюць усё тыя ж сумна вядомыя "сямёра з лыжкай", якіх наўрад ці прыкметна паменела.

Землякі, вядома, не ўпусцілі магчымасці распавядаць пра сваё жыццё-быццё. Усё больш скардзіліся на яго. Якое яно, маўляў, сёння цяжкае і безвыходнае і як было добра раней. Праўда, далей гэтай мудрай канстатацыі не сягалі і на пытанне, чаму так здарылася і хто вінаваты, толькі па-філасофску паціскалі плячыма: "Хто яго ведае?" Увогуле, у плане традыцыйнага вызначэння вінаватага мае землякі знаходзяцца сёння ў даволі складанай сітуацыі, асабліва ў дачыненні да сваёй занядбанасці і беднасці. Яшчэ паўгода таму яны "валілі ўсе бочкі" на ранейшага старшыню, які, маўляў, "нахапаўся, колькі мог". А на "новенькага" ў іх пакуль рука не падымаецца. Калі ж размова заходзіць пра начальства больш высокае, то тут хлебаробы і жывёлаводы імгненна ператвараюцца ў "работнікаў".

Напрыклад, працаўнікі калгаснай фермы (а гэта ў асноўным жанчыны) шчыра і апантана спявалі асанну нашай самай высокай уладзе, горача падтрымліваючы яе апошнюю акцыю па "нейтралізацыі" іхняга міністра. Захапленне было непадробным і нязмушаным, здавалася — вось-вось закрычаць: "Распні!" Яны традыцыйна вераць, што, распінаючы, можна "навесці парадак". Даяркі і цялятніцы аказаліся зусім нядрэнна "падкаванымі" і ў пытаннях вялікай палітычнай стратэгіі, слушна давёўшы недасведчанаму мінскаму журналісту, што "каб не мяшалі", то даўно ўжо... Прызнацца, у нейкі момант нават трохі сорамна стала: можа, мы ў сталіцы нечага не разумеем і таксама несвядома "мяшаем"? Пад канец нашай цікавай размовы я даведаўся, што на ферме сёння працуюць у асноўным "прыезджыя" з усходніх абласцей Беларусі, з Украіны, з Расіі. Сваіх, мясцовых, аказалася вельмі мала.

Мужыкі ж на калгасным пляцы былі значна менш аднадумнымі ў сваіх палітычных поглядах. Сярод іх знайшліся нават сапраўдныя "апазіцыянеры", якія настойліва прапаноўвалі нават свае прозвішчы назваць "у мінскай газеце, калі будзеш пісаць". Не, браткі, прозвішчы вашы я не назаву. Прынамсі, пакуль што. Хто яго ведае, чым тое для вас павернецца...

Вясковыя "апазіцыянеры", сам факт існавання якіх стаўся для мяне нечаканым, а трохі пазней і адзіны вясковы фермер (у раёне засталося з 13 усяго 3), гаварылі проста і бясхітрасна пра тое, што жыццё пагаршаецца, як ні працуй, што яны сёння знаходзяцца на ўзроўні прыгонных (асабліва тыя, хто жыве ў калгасным жытле), калі з калгаса нікуды не вырвацца. Каб прыватызаваць, напрыклад, калгасную кватэру ў так званых "катэджах", кватэру, дарэчы, вельмі нізкай якасці, неабходна выплаціць калгасаў 85 мільёнаў рублёў, пры зарплаце, як мы ўжо згадвалі, 1 млн. у месяц. Перспектыву пралічыць нескладана... Толькі маючы ўласнае жытло, чалавек мае нейкі шанц уладкавацца на працу, напрыклад, у раённым цэнтры.

У мясцовага фермера пажаданне было адно — каб выконваліся законы. "Хоць пазнякоўскія, хоць ганчараўскія, хоць лукашэнкаўскія, але каб законы былі законамі і былі аднолькавымі для ўсіх..."

Зусім не святочным быў настрой маіх землякоў. Большасць з іх, прынамсі, з тых, хто не патрапіў у "заложнікі зялёнага змея", мала спадзяюцца на нешта лепшае. Гэты амаль масавы песімізм — з'ява раней незвычайная. Нават згаданыя работніцы калгаснай фермы — вялікія прыхільніцы сённяшняй нашай улады — глядзяць у будучыню з вялікай трывогай. Асноўныя спадзяванні — на свой падворак, на свае "соткі", на свае рукі.... "Выжывем неяк!" — сцвярджаюць мае землякі. "Неяк!" Страшнае, дарэчы, у сваёй няпэўнасці слова. Злавеснае. Страшна жыць "неяк", калі навокал усе бяруцца жыць па-сапраўднаму.

Але наўрад ці спытаюцца ў хуткім часе мае землякі ў "традыцыйных аратараў" пра тое, "што ўсіх нас моцна турбуе". Па-першае, таму яны і "традыцыйныя", што "традыцыя" жыве і квітнее. Па-другое, "турбуе", відаць, не надта "моцна"...

Ох, не час яшчэ "збіраць камяні" на калгасных палетках!..

Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ

Фота К. ДРОБАВА

ДРУК

"Наша слова" зноў выходзіць

На пашыраным пасяджэнні сакратарыята Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны ў шэрагу іншых надзённых пытанняў былі абмеркаваныя і два нумары практычна адноўленай газеты "Наша слова". Гэты па сённяшніх мерках подзвіг здзейсніла суполка ТБМ у Лідзе на чале са Станіславам Суднікам, які прызначаны выконваючым абавязкі рэдактара. У сваім звароце да чытачоў і ўсіх прыхільнікаў беларускай мовы лідскія выдаўцы "Нашага слова" пішуць, што "на сёння ў рэдакцыі няма ні аднаго метра жылплошчы, ні адной адзінкі выдавецкай тэхнікі, ні аднаго штатнага супрацоўніка, няма рахунку, няма рэдакцыйнага партфеля і ўсяго іншага для больш-менш нармальнай працы. Але за газетай ёсць горад Ліда, ёсць сябры ТБМ, ёсць беларускі народ". У газеце апублікаваныя прозвішчы тых, хто сваімі грашовымі ахвяраваннямі дапамог аднавіць выпуск "Нашага слова". У іх ліку гродзенская арганізацыя ТБМ, выдавецтва "Полымя", навукоўцы, настаўніцкія калектывы, пісьменнікі, святар Ян Матусевіч, жыхары г. Кобрына, прадпрымальнікі і іншыя прыхільнікі беларускага слова. З замежных суродзічаў ахвяраванні на выпуск газеты перадалі Зора і Вітаўт Кіпелі (ЗША).

У другім выпуску адноўленага "Нашага слова" надрукаваны спіс ахвярадаўцаў на карысць Таварыства беларускай мовы з ліку суродзічаў замежжа (у асноўным — са Злучаных Штатаў Амерыкі). Як вядома, у пачатку года ТБМ стала ў поўным сэнсе банкрутам. Фінансавай падтрымкі з боку дзяржавы яно не мела, а ў дадатак было пазбаўлена льготаў, у выніку чаго імгненна ў шмат разоў узраслі плацяжы за памяшканне, тэлефонныя перамовы, а таксама падаткі за гаспадарчую дзейнасць. Доўг ТБМ нарастаў бы снежны камяк, а ў дадатак і рахунак, як гавораць фінансісты, быў "пастаўлены на картатэку", што не давала магчымасць карыстацца ім дзеля працы кніжных кіёскаў і такім чынам нешта зарабляць. У газеце надрукаваны зварот старшыні ТБМ Генадзя Бураўкіна і сакратарыята таварыства да замежных суродзічаў, у якім выказваецца шчырая падзяка за сяброўскую падтрымку Таварыства беларускай мовы ў цяжкі для яго час. "Ваша спрыянне яго дзейнасці, — гаворыцца ў звароце, — дапамагло, у прыватнасці, і таму, што адноўлены выпуск газеты "Наша слова", і што зноў пачаў працаваць у цэнтры Мінска шапік, дзе прадаюцца практычна ўсе беларускамоўныя выданні".

У сваю чаргу рэдакцыя газеты звярнулася да сваіх прыхільнікаў з паведамленнем, што на 1998 год на "Наша слова" можна падпісацца. Але воляй абставін пра ўмовы падпіскі можна азнаёміцца ў каталогу на стар. 18 у раздзеле... "Абласныя газеты". Падпісны індэкс газеты "Наша слова" — 63865.

ШЛЯХІ

Вялікі скарб еднасці,

або Чаму партрэт Беларусі XVII—XVIII стст. носіць назву "Сармацкага"?

КАЛІ ЗВЯРТАЕШСЯ да генетычнай памяці з пытаннем — хто мы, і адкуль, што з намі было і што чакае, узнікаюць вобразы, летуценні, гістарычныя гіпотэзы. Адна з іх падвяла мяне да ідэі араба-ісламскай філасофіі сярэднявечча, якая сцвярджала эманацыю Мноства з Адзінства і вяртанне Мноства ў Адзінства — прысутнасць Адзінага ў Мностве. Арабскія філосафы былі перакананы ў структурным падабенстве цела чалавека і Космасу. Чалавека яны разглядалі як "малы Космас", а Космас — як "Вялікага чалавека".

У пошуках шчасця ім бачыўся "Ідэальны Горад", аналагічны целу Космасу. Асэнсаванне арабамі суцэльнасці як касмічнага закона прывяла да збору ведаў, кніг з Усяго Свету, пабудовы Дома мудрасці, у стварэнні якога побач з мусульманамі рашаючую ролю адыгралі сірыйскія хрысціяне. Таму невыпадкова, што на гэтай духоўнай глебе з прыходам да ўлады Абасідаў (VIII ст.) у згодзе і дабрабыце расквітнела дзяржава Арабскага Халіфата.

Але ж, здаецца, не так даўно, усяго з III ст. да н. э. — VII ст. н. э. ад эпохі Ахмянідаў да Сасанідаў на гэтых землях панавала магутная цывілізацыя Персія (Іран). Сама назва Іран — Ары-ан, "Арыйская краіна" — нагадвае аб старажытных арыях, якія тут жылі. Ад Малой Азіі да Балтыкі, ад Вялікабрытаніі да Алтая і Індыі ў V—I тыс. да н.э. распаўсюджваўся арэал носьбітаў і нашчадкаў інда-еўрапейскай моўнай еднасці. Арыі (як скіфы ці полаўцы больш позніх часоў) былі не асобным народам, а саюзам рознаэтнічных плямёнаў. Цікава, што першапачатковай тэрыторыяй іх качэў'я былі паўднёвыя землі Буга і Дняпра, аб чым сведчыць назва ракі Днепр, якая ў тыя часы звалася Індам (Сіндам). Назва Днепр ("рака") пакінута іранамоўнымі скіфамі. Яна азначае літаральна пераклад старажытнага Інда ці Сінда. "Рыг-веда" — духоўны, гістарычны даведнік старажытных Арыяў у сваім першым і галоўным гімне заклікае да Адзінства, Дабра і Згоды. Як і філасофія Арабаў, запаветы "Рыг-веды" спасцігалі Касмічныя законы Суцэльнасці, Гармоніі, Святла. Але з цягам часу чалавецтва здрадзіла законам і было пакарана Космасам на раз'яднанне. Паводзінамі чалавецтва ўзрушылася нават Маці-Зямля. І з суцэльнага адзінага прамацерыка (Пангея) раскалолася на мацерыкі, астравы і асколкі-астраўкі — як напамін людзям аб вяртанні да вытокаў Адзінства ў Сусвеце.

Але агеньчыкі святла тых плямён, што не страцілі мэты адзінства як умовы жыцця, што не пабаяліся ўзяць на свае плечы цяжар гістарычных падзей і прадоўжыць жыццё на зямлі, асеўшы на тэрыторыях стомленых, знікаючых цывілізацый, падкінулі паліва ў іх затухаючыя вогнішчы.

Так, у стэпах Ніжняга Задоння яшчэ да нашай эры з'явіліся плямёны, якіх грэкі абагульнена называлі "сарматамі". У рымска-візантыйскі час за імі замацавалася назва "аланы". Гэта быў кангламерат качавых плямёнаў, паляўнічых і жывёлаводаў, выдатных воінаў, сярод якіх і жанчыны поруч з мужчынамі ўдзельнічалі ў ваенных набегах і займалі ганаровае месца ў грамадстве. Менавіта жанчыны Сарматы сталі прататыпамі паданняў пра амазонак.

З IV—II ст. да н.э. частка сармацкіх плямён, аб'яднаўшыся ў магутны саюз, выцесніла скіфаў з Падоння і рушыла на захад. Актывізаваўся гандаль з прычарнаморскімі антычнымі гарадамі і Каўказам, наладзіліся сувязі са старадаўнімі цэнтрамі ўсходніх цывілізацый. У асяроддзі сарматаў утварылася свая знаць і магутныя конныя дружыны...

А цяпер пра тое, што і вымусіла мяне прыгадаць гісторыю сарматаў. Справа ў тым, што патомкамі іх называла сябе ў XVI ст. шляхта Рэчы Паспалітай, і такое атаясамленне не магло не зацікавіць.

Жываліс, графіка, партрэт Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай (і Беларусі) XVII—XVIII стст. носіць назву "сармацкага". Гэтыя назва і з'ява прывабілі мяне і збудзілі жаданне глыбей і падрабязней пазнаёміцца з ёю яшчэ і таму, што 600 год жывуць на Беларусі татары, нашчадкі прафесійных вояў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, якія мелі шляхецкія званні, радаслоўныя дрэвы, гербы, тамгі — атрыбуты, падобныя на тыя, што ёсць на "сармацкіх партрэтах".

А таямніцы прысутнасці ўсходніх рыс у вобразах і адзенні прывялі да пошукаў апісання відавочцамі нацыянальнага касцюма шляхты.

Французскі вандроўнік дэ Ламбурэр так малюе вобраз шляхты ў 1646 г.: "С великолепием, возбудившим всеобщее изумление, выступил отряд из 200 человек шляхты, принадлежащей к знаменитнейшим родам. Одежды их были большей частью персидские, златотканые с цветочным узором или из бархатов различнейших расцветок. Одежды были подбиты бесценными мехами, там были собольи спинки и пантеры. Под платьями — туники, сплошь из златотканого материала или бархата, золота, серебра или шелка, вышитые руками. Так же точно и головные уборы отделаны были куньим мехом, а плюмажи из перьев черной цапли схвачены были в зависимости от богатства аграфами из бриллиантов".

У культуры і побыце шляхты "ўсходні стыль" меў самае шырокае распаўсюджванне. Я. Тазбір піша, што нават мясцовая зброя аддавалася для апрацоўкі, каб прыдаць ёй "усходні каларыт": "Чем шляхтич богаче — тем больше наряд его напоминает убранство турецких вельмож и даже самого турецкого султана". І іншыя еўрапейцы, пабываўшыя ў Рэчы Паспалітай, дакладалі аб усходнім бляску і раскошы — характэрных якасцях шляхецкіх густаў. Дзівоснае багацце бачылі тут вандроўнікі. Яркім пацвярджэннем да сказанага з'яўляюцца ўсім вядомыя слуцкія паясы. Каб наладзіць вытворчасць гэтых шыкоўных твораў, Казімір Радзівіл у XVIII ст. прывёз у Слуцк персаў і турак. На вучобу ў Персію былі пасланы беларускія майстры Томас Хаецкі і Ян Гадоўскі, якія прывезлі адтуль матэрыялы, тэхналогію і абсталяванне. Мусіць, "нешта ёсць" у гэтай беларускай зямлі, што спрыяе не толькі выжыванню, але і росквіту ўсходніх парасткаў.

Каб зразумець, хто праклаў масток паміж славянамі і персамі, звернемся да Персіі III ст. да н.э. — III ст. н.э. — час Парфянскага царства, у склад якога ўваходзілі сарматы. У гэты перыяд наглядалася больш актыўная іранізацыя насельніцтва ўсіх блізкіх плямён і народаў. Дарэчы, слова "шляхта" мае іранскае паходжанне. У эпоху Сасанідаў шляхтай называлі багатых людзей, якія мелі павагу ў грамадстве і вялікія зямельныя надзелы. У верхненямецкай старажытнай мове шляхта азначала род, пароду. Цяпер зразумела, што "легендарныя продкі" ВКЛ — сарматы, яны ўзбагаціліся духоўнай, культурнай, вайсковай, моўнай спадчынай арыяў (дакладней Ірана, ці Персіі) і накіраваліся да Крыма ў пошуках новых заваёў. На той час (I ст. да н.э. — I ст. н.э.) скіфы, гаспадары прычарнамор'я, прыйшлі да заняпаду, яны не вытрымалі націску добра ўзброеных вершнікаў-сарматаў, ці аланаў. (Аланы — уланы, мяркую, ёсць сувязь між гэтымі словамі. Уланы — лёгкая конніца з татар у войску Вялікага княства Літоўскага).

Такім чынам, паўночнае ўзбярэжжа Чорнага (ці Сармацкага) мора, Крым займаюць сарматы, стварыўшы новую дзяржаву — Баспорскае царства. Багатыя сарматы, якія пасяліліся ў Баспорскай дзяржаве, сталі пасрэднікамі ў гандлі паміж мясцовым насельніцтвам і грэчаскімі гарадамі, садзейнічалі ўзаемапранікненню і ўзаемасувязі культур. Мастацтва баспорцаў уяўляла сабой адну з галін антычнага, але мела свае спецыфічныя асаблівасці. Жываліс вызначаўся вялікім дэкаратыўным майстэрствам. Асноўным, як у скіфаў, так і ў сарматаў, было ўжытковае мастацтва. Паліхромна-інкрустацыйны стыль увабраў у сябе асаблівасці "звярынага стылю" скіфскіх часоў. Косць — як самы танны матэрыял — апрацоўвалі са старажытных часоў: лыжкі, абкладкі калчанаў, амулеты. Захаплялі сваім выглядам створаныя сармацкімі майстрамі дарагія ўпрыгожванні з золата, інкруставаныя каштоўнымі камянямі. (Трэба адзначыць, што пачуццё дэкаратыўнасці, цяга да пышнасці, шыкоўнасці, раскошы наглядалася як у жыцці і побыце шляхты ВКЛ, так і ў іх "сармацкіх партрэтах").

Пранікненне мясцовых звычаяў у жыццё баспорцаў распаўсюдзілася і на выкананне надмагільных стэл, якія з аб'ёмных становяцца больш плоскімі. Верхняя частка такой пліты звычайна ўпрыгожвалася пальметай, шэрагам невялікіх разетак, а ў нішах арачнага тыпу размяшчаліся постаці памерлых. Зверху такая пліта нагадвае франтон. Усе гэтыя скульптурныя асаблівасці характэрныя для стэл ВКЛ, Рэчы Паспалітай, толькі ў больш тагачасным пышным, барочным стылі. У народным мастацтве сарматаў шырока распаўсюджваліся гліняныя пасудзіны з ручкамі ў выглядзе барана, каня ці птушкі. Сустракаліся таксама фігурныя пасудзіны ў звярыным стылі, што прасочваецца і ў сучаснай кераміцы Беларусі. А посуд, што носіць назву "гляк", таксама меў месца ў майстроў Баспорскага царства. Але самае цікавае, што сведчыць пра сарматызацыю мясцовага Крымскага насельніцтва, гэта загадкавыя знакі, якія неаднаразова сустракаліся на баспорскіх помніках. Некаторыя з іх расшыфроўваюцца як імянныя знакі баспорскіх цароў. Так у верхняй частцы пліты галоўнага сармацкага перакладчыка 208 г. н. э. змешчаны імянны знак Саўрамата II, які замяняе імя, тытул цара, — такім знакам звычайна пачыналіся падобныя афіцыйныя надпісы. Даволі часта з'яўляецца знак стралы ці кап'я, якія былі сімваламі мужчынскага бога яшчэ ў неалітычныя часы вераванняў індаеўрапейцаў. У крымскіх татар такія знакі сталі называцца тамга — адмеціна (цюрк). А на шматлікіх шыкоўных партрэтах XVI—XVIII стст. шляхціцаў Хадкевічаў, Весялоўскіх, Радзівілаў, Сапег, Тарнаўскіх — гербы з выявамі тамгі: стралы, кветкі, рога — сімвала духу, змяі — сімвала мудрасці, паўмесяца з зоркай і інш. Таму партрэт XVI—XVIII стст. з'яўляецца не толькі творам мастацтва, а яшчэ (можа, і найперш) генеалагічным дакументам, які ўвекавечвае прадстаўніка таго ці іншага роду і з'яўляецца яго своеасаблівым "пашпартам". Кожны буйны феадал імкнуўся не толькі да багацця, да ўплыву на дзяржаўныя справы, але і жадаў пакінуць сваім нашчадкам сведчанне сваёй вядомасці і славутасці. Такім сведчаннем мог стаць партрэт з адлюстраваннем на ім усіх атрыбутаў радавітасці, улады і багацця. Шляхта лічылася "рыцарскім саслоў'ем", закліканым абараняць дзяржаву і кіраваць ёй, таму што разглядала сябе як асобны шляхецкі народ, што вядзе сваё паходжанне ад антычных сарматаў.

У сувязі з гістарычнымі заканамернасцямі на змену адным цывілізацыям прыходзяць другія. Так і сарматы ў II ст. н.э. разам з готамі і славянамі стварылі дзяржаву ад Балтыкі да Дуная, якая пасля нядоўгага існавання распалася пад напорам гунаў, у перыяд вялікага перасялення народаў. Пасля распаду Баспорскага царства Крым трапляе ў залежнасць ад Візантыі, і паступова паўночную частку яго пачынаюць засяляць цюркамоўныя народнасці з Прычарнаморскіх стэпаў: у VII ст. — хазары, XI—XII стст. — полаўцы, татара-манголы, нагаі, туркі-сюльджукі. На час стварэння Крымскага ханства (1443 г.) там жылі грэкі-візантыйцы, армяне, італьянцы-генуэзцы, готы, туркі-асманы, чаркесы, грузіны, малдаване.

Крымскія татары сфарміраваліся ў выніку зліцця цюркамоўнага насельніцтва тутэйшых жыхароў, таўраў, кімерыйцаў, сарматаў. Назва "татары" аб'яднала і абагульніла шматлікую колькасць народаў. Вядомы цюрколаг Д. Ярамееў паходжанне гэтага этноніма звязвае са старажытнаперсідскім народам. У этноніме "татар" першы кампанент "тат" можна супаставіць з назвай аднаго з плямён старажытнага Ірана. Першапачатковае значэнне слова "тат" было хутчэй за ўсё "іранец", "размаўляючы паіранску", а затым гэтым словам сталі вызначаць усіх чужакоў. Шматлікія аўтары паходжанне слова "татар" вядуць ад кітайскай мовы. Пад назвай та-та, да-да ці татан яшчэ ў V ст. у Паўночна-ўсходняй Манголіі і Маньчжурыі жыло адно мангольскае племя. У асобных дыялектах кітайскай мовы іх называлі тартар і татар. Гэтая назва трапіла ў Еўропу да мангольскага нашэсця, дзякуючы вандроўнікам-купцам, якія пабывалі на ўсходзе. Больш таго, у часы сярэднявечча ў заходнееўрапейскай літаратуры і рускіх атаясамлівалі з татарамі. Масковію называлі Тартарыяй, паколькі рускія былі ў залежнасці ад Залатой Арды. Еўропа лічыла сябе цэнтрам зямлі і культуры, таму ўсе іншыя народы былі для яе варварамі — татарамі. Па сведчанні рускіх вучоных, слова "татары" ўжывалася замест скіф, сармат, варвар ці проста не рускі. Так, нават арочаў, якія жылі каля Ціхага акіяна, называлі татарамі — адсюль і назва Татарскага праліва. Пазней, па меры вывучэння Усходу, рускія і заходне-еўрапейскія вучоныя пачалі адрозніваць этнічны склад рэгіёна і этнонім "татары" ўжылі да абазначэння цюркамоўнага насельніцтва... Як відаць, частку старажытных здабыткаў прынеслі таксама і татары — ардынскія ханы і воі ў ВКЛ. У 1397 г. хан Тахтамыш са сваёй дружынай з-пад Азова і Крыма прыйшоў да Вітаўта.

А далей было агульнае жыццё, агульная гісторыя. Калі распачалася вайна з тэўтонцамі ў 1410 г. у шматлікай раці Вітаўта знаходзілася, па звестках летапісцаў, 30 тыс. саюзных татар хана Джэлал-эд-дзіна, сына хана Тахтамыша. Ад рукі хана Багардзіна загінуў апошні вялікі магістр ордэна — Ульрых фон Юнгінген. Джэлал-эд-дзін пасля перамогі пад Грунвальдам застаўся на нейкі час у Літве. Вітаўт паспеў зацвердзіць яго на ханства Кіпчака, а пазней яго дзеці паспыталі апекі вялікага князя. З тых часоў татары яшчэ больш зблізіліся з Літвою і засталіся вернымі яе саюзнікамі. Яны вызначаліся добрасумленнасцю, вернасцю, адданасцю ваеннай справе; служылі ў так званых, уланскіх палках, мелі высокія пасады, заслугоўвалі княжацкія званні.

Пасля аб'яднання ВКЛ з Польшчай заканадаўства прызнала і зацвердзіла за татарамі ўсе правы і прывілеі шляхты, хаця доступ у саслоўе быў магчымы толькі ў выключных выпадках за вялікія заслугі. Польскія каралі абапіраліся на рыцарства і таму былі вымушаны задавальняць яго патрабаванні і расшыраць правы.

Афіцыйнае зацвярджэнне шляхты адбылося ў XIII—XIV стст. пераважна з воінаў-прафесіяналаў (рыцараў). Сярод іх разам з мясцовымі рыцарамі была дружына хана Тахтамыша і іх нашчадкі. Гербы, пячаткі, знакі (тамгі) XIV—XVI стст. сведчаць пра існаванне каля паўсотні знакамітых татарскіх родаў. Істотна, што прозвішчы набылі беларускамоўнае гучанне, але назвы старажытных плямёнаў захаваны. Напрыклад: Александровічы з роду Іскандэр, Шабановічы — ад Шэйбан, Бараноўскія — ад Барын, Кандратовічы — ад Конград, Асановічы — ад Асан і г.д.

Гісторыя захавала шмат герояў ВКЛ, Рэчы Паспалітай, чые радаслоўныя пачыналіся з татарскіх каранёў: князі Глінскія, Якуб Ясінскі, Сапегі, Т. Касцюшка, Якуб Бабіч і інш. Патрабуецца больш пільнае даследаванне гэтых і іншых гістарычных асоб, як і радавода герояў "сармацкіх" (татарскіх) партрэтаў.

Праз пазнанне чалавека пазнаецца Сусвет, а праз асэнсаванне Сусвету адкрываюцца законы гармоніі, святла, адзінства, дабра і згоды, што такія сучасныя і неабходныя ў наш нялёгкі час.

600-годдзе адзінага гістарычнага лёсу — гэта вялікі скарб еднасці жыцця, светапогляду, псіхалогіі, характару, мовы, вывучэнне і адкрыццё якога неабходна для нас і нашчадкаў у справе адраджэння і ўзвышэння нашай Радзімы маці-зямлі — любімай Беларусі.

Айша АЛЕКСАНДРОВІЧ

Мы ўдзячны паэту...

У Мінскім дзяржаўным педагагічным каледжы адбылася сустрэча выкладчыкаў і навучэнцаў з Нілам Гілевічам, народным паэтам Беларусі, лаўрэатам Дзяржаўнай і Міжнароднай прэмій, вядомым грамадскім дзеячам, выдатным вучоным і фалькларыстам. Яна была наладжана прадметнай камісіяй выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры і намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце І. Сташулёнкам.

Жадаючых паслухаць і пагутарыць з Нілам Сымонавічам сабралася шмат — зала была поўная.

Вяла вечарыну Вольга Уладзіміраўна Зялёнка. Яна прадставіла госця, крыху расказала пра яго жыццё, грамадскую і літаратурную дзейнасць, пазнаёміла з выставай кніг майстра слова. Пасля чаго слова было дадзена госцю.

Усе мы з цікавасцю слухалі расказ паэта пра яго дзяцінства і юнацтва, пра першае каханне, якому ён, "на жаль, не прысвяціў ніводнага твора", пра сваіх настаўнікаў, пра вучобу ў педвучылішчы і ва універсітэце, пра многае іншае. З залы было шмат пытанняў, на якія Ніл Сымонавіч адразу ж даваў адказы. І, вядома ж, мы з увагаю слухалі вершы паэта, а ён чытаў іх шмат — пра каханне, пра любоў да роднай зямлі. З вялікай занепакоенасцю гаварыў наш шаноўны госць пра стан беларускай мовы ў дзяржаве. Мова — адна з самых балючых тэм для пісьменніка, ды, напэўна, не толькі для яго, але і для нас, бо "мілей, чым гукі роднай мовы — на свеце радасці няма".

Мы вельмі ўдзячны паэту і ўсім тым, хто наладзіў гэтую сустрэчу, якая дала нам шмат новага і цікавага.

Наталля СТАРЫНСКАЯ,
навучэнка 403-й групы МПК

На фоне родных краявідаў

15 лістапада ў Беластоку ладзілася адметная вечарына, галоўнымі прэзентантамі на якой былі знакамітыя Сакрат Яновіч і Лёнік Тарасевіч. Даўняе сяброўства аб'ядноўвае гэтых двух арыгінальных, таленавітых, творчых асобаў. Пісьменнік Сакрат Яновіч і мастак-жывапісец Лёнік Тарасевіч складаюць сапраўдны гонар беларускай культуры ў Польшчы. Абодва таксама вядомыя далёка па-за межамі краіны. Кожны мае за сабою плённыя творчыя набыткі. Але гэтым разам яны аб'ядналі свае таленты дзеля адной мэты — прэзентаваць у свеце культуру і прыгажосць зямлі Беластоцкай, дзе абодва нарадзіліся і жывуць цяпер кожны ў сваёй вёсцы: Сакрат — у Крынках, Лёнік — у Валілах.

Вечарына была прысвечана прэзентацыі кнігі Сакрата Яновіча "Мініяцюры" ў італьянскім перакладзе. Кнігу выпусціла выдавецтва "CAVALLINO" ў Венецыі. Аўтар перакладу Крысціяна Молдзі Равэнна. Пераклад зроблены з ангельскага выдання кнігі ў Лондане ў 1984 г. Як вядома, "Мініяцюры" па-ангельску пабачылі свет дзякуючы вядомай у нас прыхільніцы беларускай культуры Шырын Акінэр.

Італьянскае выданне зроблена ў двух моўных варыянтах — італьянскім і ангельскім. На вокладцы — арыгінальны партрэт пісьменніка на фоне родных краявідаў у ваколіцах Крынак. Кніга прыгожа ілюстравана многімі фотаздымкамі пейзажаў Беласточчыны. Аўтарам ілюстрацый з'яўляецца Лёнік Тарасевіч, які нечакана выявіў у сабе талент фотамайстра. Фота зроблена з глыбокаю, затоенаю, шчымлівою любоўю да дарагіх сэрцу мясцінаў. Гэта не проста адбіткі жыццёвых рэалій, а нібыта мастацкія палотны. Дзіўнае гэта ўспрыманне свету мастаком-жывапісцам праз аб'ектыў фотаапарата. Сілаю свайго таленту ён надзяляе пейзажы жывою, духоўнай сілаю жывапіснага твора. Вернісаж фотатвораў Лёніка Тарасевіча стаў арыгінальным працягам прэзентацыі кнігі, і абедзве прэм'еры ўспрымаліся ў лагічнай сувязі і адзінстве. Абодва аўтары шчыра радаваліся поспеху, а разам з імі і ўсе прысутныя. Публіка была адметная, элітарная, многа студэнтаў і творчай моладзі, інтэлігенцыі як з беларускага, так і з польскага боку. Досціпы Сакрата Яновіча, яго трапныя выказванні, тонкі гумар падабаліся прысутным.

Вечарыну ладзіла суполка "Галерэя 113" у будынку факультэта педагогікі і псіхалогіі Беластоцкага універсітэта. Прыемна было бачыць, як ідзе ў шырокі свет наша беларускае слова, наша мастацтва, што яно цікава і патрэбна іншым народам. Добра было б, калі б і мы самі шанавалі яго.

Ганна СУРМАЧ

ВІНШУЕМ!

"Вучуся... шчырасці ў Купалы"

ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВАЙ — 60

Многія сёння апраўдваюцца тым, што ў так званыя таталітарныя часы нярэдка вымушаны былі пісаць тое, да чаго не ляжала душа. Што праўда, то праўда: даводзілася "наступаць на горла ўласнай песні", і на гэта, зразумела, былі важкія прычыны. А згадваецца падобнае не дзеля таго, каб некага папракнуць, успомніць яго былыя грахі: глянь, якім быў учора і якім стаў сёння. Жыццё пражыць — не поле перайсці. Тым не менш... Адзінкі праходзілі тагачасныя выпрабаванні — і на прынцыповасць, і на сумленнасць годна і, як бы цяжка ім ні даводзілася, усё ж заставаліся самімі сабой.

Да іх належыць і Данута Бічэль-Загнетава. А каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова перачытаць творы паэткі (ужываю гэтае слова, бо так успрымае яго сама Данута Іванаўна, хоць мне куды бліжэй пісаць "паэт", асабліва ў дачыненні да такога таленту, якім валодае яна), напісаныя на самым пачатку яе творчага шляху, калі ці не ў кожнага маладога аўтара існуе спакуса абавязкова апляваць лісточкі, кветачкі і нешта ў такім родзе. Д. Бічэль-Загнетава пачынала з таго, што і па сённяшні дзень у яе творчасці вызначальнае. А гэта, як вядома, любоў да Бацькаўшчыны і да роднай сэрцу Гарадзеншчыны, да матчынай мовы, да ўсяго таго, што можна (і трэба) вызначаць адным словам — Беларусь!

І дэбютавала Данута Іванаўна (дарэчы, на старонках газеты "Літаратура і мастацтва") у 1958 годзе вершам "Роднае слова":

Пад казачным дубам над Нёманам сінім
хлапец прызнаваўся ў каханні дзяўчыне.
І рэхам той шэпт адгукнуўся між гаю:
Кахаю, кахаю...

Кранальна-пяшчотныя словы знаходзіла паэтка, каб перадаць хараство роднай гаворкі, адчуўшы яе непаўторнасць і вабнасць. Зразумеўшы яе глыбінную сутнасць, што пачынаецца з сівой даўніны, адтуль, дзе карані менавіта гэтай, а не іншай мовы, і якая варта асаблівага замілавання, бо твая, адзіная, і тваіх бацькоў, і дзядоў тваіх, прадзедаў:

Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае,
маё беларускае, роднае, кроўнае,
такое раптоўнае,
такое чароўнае,

У фае Дома літаратара з Лідзіяй Арабей, Вольгай Іпатавай і Аленай Васілевіч. 1981 г.

З Язэпам Семяжонам. 1973 г.

Падарожжа на драўляным коніку

...Чамусьці ў той прыезд у Гародню Нёман не падаўся такім ужо велічным — гэта быў кароль, чыё каралеўства напалову зваяванае, нахабны плебс ледзь нахіляе галаву перад былым грозным уладаром, але хада таго ўсё яшчэ ганарыстая. Са стромы славутая беларуская рака нагадвала перапоўненую веснавую ручаіну — шматлікія камяні і каменьчыкі паказваліся з-пад яе паверхні, здавалася, што, пераскокваючы па іх, можна перайсці раку ў любым месцы. Лодкі, перавернутыя дагары днішчамі, пах рыбы і ўсюдыіснай гарадской хіміі... Нашчадкі нёманскіх рыбароў сядзелі над сваёй ракой, палілі замежныя цыгарэты і не падыходзілі да вады, блізкі кантакт з якой гарантаваў скураное захворванне.

Каложа была зачынена. Да таго ж мне паведамілі, што лепш агледзець яе звонку і не заходзіць унутр, каб не расчароўвацца. У Катэдры вянчалі, і няёмка было змешвацца з натоўпам сваякоў і сяброў маладажонаў. На шпілях каралеўскага палаца красавалі зоркі, а рамізнік, шыкоўны рамізнік у цыліндры і сурдуце, пасля таго, як давёз мяне, дачку і пляменніцу на ўпрыгожаным пышнымі султанамі і званочкамі экіпажы да музея гісторыі рэлігіі, чуючы, відаць, як я размаўляю з дзяўчаткамі на беларускай мове, старанна вымавіў: "Чы добжэ пані пшыехала?"

Гародня раскрываецца паступова. Стары местачковы дух не памірае пад асфальтам. Па беларушчыну мы прыйшлі на ціхую вулачку, да зялёнага драўлянага дома. Напэўна, гэта мог быць звычайны дом, нават калі б на яго павесілі афіцыйную шыльду з каляровага металу. Правёў, маўляў, у гэтай будыніне свае дзіцячыя гады Паэт. Паглядзіце налева, шаноўныя экскурсанты...

Але знайшоўся чалавек, які стварыў цуд. І зрабіў дом — Домам. Паэт вярнуўся ў свой родны горад. Да яго можна прыйсці, далучыцца да яго часу і яго духоўных ідэалаў. Там жыве паэзія, жыве Беларусь. За стварэннем кожнага такога "культурнага цэнтра" — у нас, у іншых краінах — заўсёды стаіць Асоба...

Гародні пашанцавала. У ёй жыве паэтэса Данута Бічэль-Загнетава, спадарыня Данута, Данута Янаўна. Гаспадыня Дома, дзе жыў Паэт. Дома Максіма Багдановіча.

Мае дзяўчынкі — дачка і пляменніца, Вераніка і Алена, зачаравана хадзілі па светлых пакоях, разглядаючы — ніяк не падыходзіць тут слова "экспанаты" — рэчы, фотаздымкі, прадметы мастацтва. Пад пальцамі паэткі ажылі клавішы старажытнага музычнага інструмента — баюся па сваім музычным невуцтве няправільна назваць яго. А пасля Вераніка атрымала дазвол пагайдацца на старым драўляным коніку. На такім самым, напэўна, гайдаўся Максім Багдановіч.

Маленькая Вераніка на драўляным коніку маленькага Максіма...

Гародня ажыла, яе сэрца білася тут, у гэтым дамку. Нёман, Каложа, Стары Замак Вітаўта, Катэдра і каралеўскі палац былі адным жывым цэлым, прыўкрасным і неўміручым.

Таму што горад жывы, калі ў ім ёсць паэты.

Цяпер нярэдка гаворыцца пра тое, што літаратуру ўратуе рэгіянальнасць, ажыўленне мастацкага жыцця так званай правінцыі. І перш за ўсё — з'яўленне там аўтарытэтных імёнаў. Сцягванне беларускіх "песняроў вёскі" ў тлумную сталіцу даўно зрабілася прадметам сумных жартаў. А між тым я магу ўявіць, як гэта важна для маладога пачынаючага творцы ведаць, што побач, у яго горадзе, у яго раёне, вобласці жыве Мазэстра такога ўзроўню, што й лепшыя з лепшых у

Данута Бічэль-Загнетава. 1964 г.

такое ласкавае, цёплае, чыстае,
як сонца, агністае,
як Нёман, празрыстае,
як казка, быліна, як песня, жаданне,
дагэтуль зусім у жыцці не спазнанае,
вясновае слова ад шчырага сэрца...
Яно празвінела над хвалямі ў рэчцы.
Вятрыска шаптаў
яго з лісцем між гаю —
кахаю, кахаю...

Некалькі тэм лёгка паядноўваліся ў творы — каханне, захапленне роднай моваю і любоў да Беларусі. А таму і лёгка, што калі пісаліся гэтыя радкі, менш за ўсё думалася пра тэматычную напоўненасць твора, а нязмушана і ўпэўнена вылівалася, ператваралася ў споведзь тое, што вымагала даверу. Паэтцы хацелася, каб голас яе быў пачуты. Пачуты не ў тым сэнсе, што існавала заканамернае і зразумелае кожнаму творцу (асабліва маладому) жаданне надрукавацца. Хоць не без гэтага. На першым плане ўсё ж прысутнічала ўнутрана-набалелае, выпакутаванае ад усведамлення, што вельмі шмат тых, хто гэтай чароўнасці цураецца. А ў маладым узросце падобнае ўспрымаць асабліва балюча. І Д. Бічэль-Загнетава прамаўляла сваю песню аб мове. Менавіта песню, а не гімн. Бо гімн — гэта нешта ўрачыстае, узнёслае, а тут пяшчотнае, лірычна-засяроджанае, тое, за чым праглядваецца чулая душа і няўрымслівае сэрца:

Шапталі яго сенажаць і дуброва,
людзьмі перачутае, некаму нова,
адзінае, дзіўнае, светлае слова —
кахаю, люблю...
Кахаю... Люблю. Беларускаму краю
бясконца я слова "люблю" паўтараю.
Калоссям жытнёвым
і шчырым размовам.
У грукаце-ўздыме вялікім будовам.
Палеткам калгасным, зялёнай дуброве
кажу гэта слова на матчынай мове.

Словам "люблю" і напоўнена ўся творчасць паэткі. І якую кнігу ні возьмеш — "Дзявочае сэрца", "Нёман ідзе", "Запалянкі", "Доля", "Ты — гэта ты", "Дзе ходзяць басанож" (за яе, як вядома, Дануце Іванаўне ў 1984 годзе нададзена званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы), "А на Палессі" і іншыя — абавязкова скразным матывам праходзіць апяванне самой Беларусі і зямлі наднёманскай у прыватнасці. Ды і ў кніжках для дзяцей, а іх у Д. Бічэль таксама ладны стос набярэцца ("Перапёлка", "Грыб-парасон", "Дзічка", "Рыжая палянка", "Дагані на кані", "Лузанцы", "Габрынька і Габрусь"...) зноў жа не на апошнім месцы — згаданыя матывы. Маленькім прывіваецца любоў да ўсяго роднага, у іх выхоўваецца пачуццё адданасці зямлі, на якой яны нарадзіліся.

Пры жаданні можна знайсці нямала прыкладаў — і з "дарослых" кніг Д. Бічэль-Загнетавай, і з яе зборнікаў для дзяцей, каб падмацаваць правільнасць падобнай высновы. Асабліва з вершаў, напісаных апошнім часам, з тых, што пакуль у кніжкі не трапілі. Але, скажу шчыра, мне куды прыемней звяртацца да тых твораў паэткі, якія маюць "узрост" ужо не адзін дзесятак гадоў. А таму і прыемна, што яны не патрабуюць ніякай часавай карэкціроўкі. Быццам з сённяшняга дня ўзяты, нібыта нядаўна напісаны. А ці не гэта найбольш яскравая адзнака таленту, які, калі ён глыбокі ў сваёй сутнасці, ніколі на дробязі не разменьваецца. І апярэджвае свой час, і здатны глядзець наперад.

Пацвярджэнне таму і верш "Каложа". Гэта сёння напісана нямала твораў падобнага кшталту, сярод якіх, праўда, нярэдка сустракаецца і звычайная даніна модзе, а тады... Святлела на душы, харашэла на сэрцы, калі ўслухоўваўся ў голас паэткі кожны, каму, як і ёй, усё гэта аднолькава "балела". З-за ўсведамлення абыякавасці многіх да гісторыі:

Каложа!
Каложа мая прыгожая!
Ты і ў завею, як летам, пагожая.
Клёнам тваім, пэўна, сто гадоў.
А можа, іх пасадзіў Міндоўг?

З гэтага першага, у гады юнацтва, далучэння да нацыянальнай гісторыі пазней выраслі іншыя творы, у якіх ужо прысутнічаюць постаці знакамітых беларусаў Цёткі, Каліноўскага, Купалы, Хадыкі, Жылкі, Караткевіча... Па цаліку нацыянальнай даўніны Д. Бічэль-Загнетава ступала "басанож" — не баючыся, што найчасцей гэта мулка і няпроста. Ды інакш не магла. І не хацела, бо адразу, з першых твораў вызначыла ўласную творчую сцяжыну. У рэшце рэшт і жыццёвую таксама. І годна нясе свой крыж. І сумленна аддае талент народу, роднай зямлі. І працягвае — з верша ў верш, з кнігі ў кнігу — асэнсоўваць сутнасць таго, што ў адным з твораў, напісаных ужо ў гады творчай сталасці, вылілася ў такія радкі:

Людзі — аблокі.
Над выраем-краем
нас да магіл узвышае штосілы
з фрэскі азораны твар Еўфрасінні.
Маем свой край і нічога не маем.

...Ёсць у Дануты Іванаўны чатырохрадкоўе "Паясок":

Перасыпаю сонечны пясок,
вучуся простай шчырасці ў Купалы.
На кросенцах, дзе гукі не ступалі,
сную, не дыхаючы, паясок.

Яе паэзія і сапраўды "простая", калі мець на ўвазе адсутнасць ускладнёных вобразаў, не сверб эксперыментаваць са словам і мудрагеліць з ім. Але адначасова і неабходная. Штодзень патрэбная. Як тое ж слова Купалы...

Алесь МАРЦІНОВІЧ

сталіцы. Што да гэтага чалавека можна прыйсці, убачыць на свае вочы, параіцца...

Да таго ж, шчыра кажучы, я не магу ўявіць Дануту Янаўну жыхаркай Мінска, тлумнага, афіцыйнага Мінска з яго спальнымі раёнамі і цацачным Траецкім, дзе на месцы дома, дзе нарадзіўся той самы Паэт, стаіць збудаваны для саноўных бальшавікоў шэры будынак з гастраномам на першым паверсе.

Паэтэса падарыла нам сваю Гародню. Нібыта і сама — увасабленне, вобраз Гародні, шляхетнай, ціхай і таемнай.

Нядаўна атрымала з лімаўскай поштай сціплыя кніжачкі, выдадзеныя ў Гародні: творы Максіма Багдановіча і зборнік вершаў двух паэтаў, якія працуюць у Музеі Максіма Багдановіча, — Дануты Бічэль і Алеся Чобата, іх падарунак Паэту да дня нараджэння.

Я жыву ў Тваім доме, Максіме.
Гэта лёс мой, мяне не прасілі.
На твой голас іду Тваім следам.
Так, іду за вялікім Паэтам.

...Вось прыехала вёсачка з лета
у святое дзяцінства Паэта,
дзе іх кнігі, іх продкаў імёны,
дзе катае іх конік натхнёны.

Вось і нагадаў пра сябе той драўляны конік, на якім гайдалася Веранічка... Успомнілася Гародня, яе брукаванкі, храмы, палацы і замкі. Рамізнік у цыліндры. Лодкі на абмялелым беразе. Прыціхлае гучанне пажаўцелых клавішаў. Светлыя квадраты сонца на дашчанай падлозе. Васількі ў вазачцы.

Віншую Вас, Данута Янаўна, з днём нараджэння! Дзякуй Вам!

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

Фота Уладзіміра КРУКА

Данута Бічэль-Загнетава з Васілём Жуковічам, Нінай Мацяш, Янкам Брылём, Юліяй Канэ, Таццянай Кабржыцкай і Вячаславам Рагойшам. 1976 г.

КНІГАРНЯ

Спадзяванне на вячэру пад райскім дрэвам

Ці не гадоў дзесяць назад неўпрыкмет нарадзіўся недавер да дарожнай, пра чужы свет, публіцыстыкі. І сапраўды, адкуль той давер мог узнікнуць? Два-тры тыдні падарожжа, часам у дзве-тры краіны адразу хіба маглі даць вандроўніку падставы на ладны нарыс, а то і на сціплую кніжку? У выніку панавалі ў іх павярхоўнасць, ілюстрацыйнасць турыстычных, скажам так, адбіткаў памяці.

Праўда, прыкладу дзеля, хочацца згадаць і далёкія па часе, але вартыя ўважлівага прачытання і зараз, вандроўныя ўражанні Янкі Брыля — ад яго паездак па свеце. Тут, безумоўна, перамагае прыцягненне пісьменніцкага таленту. У Брыля — філасофскія развагі, трапныя назіранні, шчырыя і сумленныя высновы. Мо таму і ў яго, Брыля, многае з запісаў "не пабачыла свету з меркаванняў, ад аўтара незалежных". І вось гэта, запісанае ў 1960, таксама надрукавана толькі ў 1994-м ("Свае старонкі" ж друкаваліся, пачынаючы з 1977 года): "Наогул, забягаючы наперад, у Палерма, можна сказаць, што вельмі дзіўна, нават вусцішна глядзець на тое, як "міжкантынентальны англасакскі шавінізм" засмоктвае не толькі нашых беларусаў, не толькі непакорных украінцаў, але нават і рускіх, нягледзячы ні на багатыя традыцыі, ні на шчодрую дапамогу з Радзімы... Няўжо ім, канадскім беларусам і ўкраінцам, таксама дзіўна і вусцішна глядзець, бываючы ў нас, як руская стыхія засмоктвае і Украіну і Беларусь? І няўжо такі жаль — абавязкова нацыяналізм? Права дужага — ясна, але ж у нас была сацыялістычная рэвалюцыя!... І вельмі крыўдна чуць ад рускага таварыша: "А што, ты не мог бы адразу пісаць па-руску? Навошта потым перакладаць?.. " Асабліва складанае гэта пытанне для таго, хто і вельмі любіць Расію, рускую мову, літаратуру, і вельмі хоча быць самім сабою, сынам свайго народа, яго дастойным песняром"...

З новых вандроўных кніг — "Вячэра пад райскім дрэвам" Сяргея Законнікава, параўнальна нядаўна выдадзеная "Мастацкай літаратурай". Жанр сабраных пад адной вокладкай запісаў пісьменнік вызначыў наступным чынам: падарожныя нарысы, дзённікі. Кнігу адкрывае "Палын і васілёк". Сапраўды дзённік, у якім занатавана паездка на штогадовае літаратурнае свята, дзе ўручаюцца прэміі Мандэла. А гэта ў Італіі — на востраве Сіцыліі, у горадзе Палерма. Разам з Сяргеем Законнікавым у дэлегацыі — Ларыса Васільева, Уладзімір Кастроў, Сяргей Бабкоў (Масква), Раман Лубкіўскі (Украіна), а яшчэ перакладчык Яўген Салановіч, дагестанскі паэт Расул Гамзатаў. Падставай для ўдзелу ў міжнародным паэтычным свяце нашага земляка стаўся верш Сяргея Законнікава "Маміна хустка". Сам паэт так, досыць лаканічна і сціпла, выказаўся пра верш: "Ён імгненна выліўся з душы, і цяпер, калі я чытаю яго, то кожны раз здаецца, што зноў вярнуўся ў родную хату, зноў прытуляюся да мамінай хусткі, чую яе непаўторныя пахі". Італьянцы прыхільна сустрэлі перакладзеную на іх родную мову "Маміну хустку". Але ж, вядома, размова ў дзённіках — не пра ўласную творчасць. С. Законнікаў падрабязна, нанізваючы адну драбнічку да другой, расказвае пра ўласнае адкрыццё сучаснай Італіі. Услед за Палерма разам з аўтарам мы трапляем у Катанію, пасля ў Рым. С. Законнікаў уважлівы, назіральны да падрабязнасцяў. Нязмушана расказвае пра прыкметныя архітэктурныя, мастацкія помнікі. Узнаўляе альбо камусьці з чытачоў упершыню прыадчыняе веданне пра адметнасці, гістарычныя каштоўнасці Ватыкана, Сікстынскай капэлы. Расповед ніколі не падаецца лішнім, мажліва, з-за таго, што разам знітоўваюцца асаблівасці, якія нікому, акрамя самога аўтара, і ўгледзець нельга было, не ставала на тое яго, законнікаўскага, бачання Італіі.

Напрыканцы яшчэ адно ўражанне ад італьянскага нарыса. Напісаны ён у 1984 годзе. Але і сёння чытаецца лёгка, свабодна. Нарыс мяжу перамен вытрымаў, відавочна, па адной прычыне — у сваім публіцыстычным доследзе паэт не спяшаўся ганьбіць чужы лад жыцця.

"Сум па "Бранкавым коле" — падарожжа ў Югаславію. Тады яшчэ ў Югаславію. І вось у гэтым нарысе асабліва выяўляецца адна выразная адметнасць "міжнароднай", калі можна так сказаць, публіцыстыкі С. Законнікава. Пішучы пра далёкую краіну, пра сустрэчы з новымі людзьмі, паэт заўсёды памятае пра родны край, заўсёды параўноўвае. Але не гэтак формы жыцця, дабрабыт, колькі нацыянальныя характары, самасвядомасць, памкненні народаў да ўсталявання справядлівасці, суверэнітэту і незалежнасці ўласнай айчыны.

Дарога ў Югаславію звяла аўтара кнігі з літоўскімі пісьменнікамі. Пра гэта — адступленне- згадка пра выставу "Літва ў выгнанні", з якой С. Законнікаў пазнаёміўся яшчэ ў Вільні. Дазвольце з гэтай нагоды невялікую цытату: "Была на той выставе і фатаграфія, якая запомнілася мне. Я доўга ўглядаўся ў анёльскі, ясны тварык знясіленай, змардаванай, апранутай у рызэё, маладзенькай (мабыць, пятнаццаць ці шаснаццаць гадоў) дзяўчыны, якая на лесапавале, стоячы па пояс у глыбокім снезе, упёршыся доўгім калом у ствол, закусіўшы вусны, піхае сваімі тоненькімі, худзенькімі ручкамі падрэзаную ў камлі, тоўстую, у два абхваты, лістоўніцу...

Мяне, як галоўнага рэдактара часопіса, часта папракаюць: "Чаму вы столькі ўвагі надаяце тэме сталінскага тэрору і рэпрэсій? Пагаварылі — і хопіць". Не, не хопіць! Трэба ведаць як мага больш, каб жахлівае мінулае не паўтарылася ў яшчэ страшнейшым, пачварнейшым варыянце.

Сталінізм, як і фашызм, жывучы. Ён выходзіць сёння крывавым потам з цела нашага грамадства і доўга яшчэ будзе перашкаджаць нам жыць нармальна, па-чалавечы.

Сапраўды, чаму мы — беларусы — ніяк не можам падступіцца да будаўніцтва незалежнай дзяржавы? Ды таму, што надарвалася, знемагла Беларусь, як тая маладзенькая дзяўчына на лесапавале, захлынулася слязамі і крывёю сваіх лепшых, таленавітых дачок і сыноў..."

У нарысе, у якім С. Законнікаў расказаў пра літаратурнае свята "Бранкава кола", ёсць заключнае слова — "Пастскрыптум спадзявання". С. Законнікаў заўважае, пішучы пра Ваяводзіну, што не хацеў заглыбляцца ў палітычныя праблемы, абмяжоўваўся тым, што бліжэй яму як пісьменніку: культура, літаратура і мастацтва, архітэктура, традыцыі, быт людзей. Так, аўтар імкнецца да сапраўдных і вечных каштоўнасцяў народнага жыцця. Але ж гэта і ёсць палітыка. Усё, што акружае нас, што падштурхоўвае тыя альбо іншыя сілы на рэагаванне ў дачыненні да з'яў мастацтва, культуры, да праяў нацыянальнага і нават, калі хочаце, народнага...

Чаму кніга называецца "Вячэра пад райскім дрэвам" (аднайменны нарыс ці хутчэй нават дакументальная аповесць — пра сустрэчы пісьменніка з Германіяй, з нямецкімі міратворцамі)? Зноў жа, расказваючы пра новыя сустрэчы, С. Законнікаў не забываецца пра Беларусь, вяртае нас у гады ваеннага ліхалецця. Цяжка, няпроста жыць розным людзям і народам у міры. У добрасуседства ўмешваюцца многія жорсткія акалічнасці. Як жа вытрываць, як жа прайсці праз многія выпрабаванні?.. У царкве Марціна Лютэра ў Берліне вісіць палатно, на якім намалявана вячэра пад дрэвам. Пад дрэвам, крыху далей ад разасланага абруса, — маладая пара. Двое закаханых: юнак-турак і дзяўчына-немка. Царква адважылася павесіць такую карціну. А паэт і публіцыст згадвае яшчэ адну вячэру — пад райскім дрэвам, пад яблыняй-райкай у роднай пасляваеннай Глыбачцы. Таму і назва такая ў кнігі. Таму, відаць, і спадзяванне ў яе аўтара на адно: свет можа выратаваць міралюбівае добрасуседства, спрыянне розных народаў адзін другому.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

ЛіМ ЧАСАПІС

"Зорачкі Прыдзвіння"

Пад такой назвай ужо трэці раз адбыўся абласны конкурс юных паэтаў, празаікаў і кампазітараў Прыдзвіння. Вынікам двух папярэдніх стала калектыўная кніжачка лепшых вершаў яго ўдзельнікаў "Крынічка". Яна знайшла свайго чытача і нават стала прадметам увагі рэспубліканскага часопіса юных "Першацвет", на старонках якога з'явілася рэцэнзія на яе.

Трэці конкурс таксама праводзілі абласное аб'яднанне па пазашкольнай рабоце пры садзейнічанні ўпраўлення культуры аблвыканкама, абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры і абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў.

У конкурсе прынялі ўдзел 96 школьнікаў. Асабліва вызначыліся хлапчукі і дзяўчынкі з Ушацкага, Пастаўскага, Глыбоцкага, Аршанскага, Расонскага, Мёрскага раёнаў, з Оршы, Полацка і Віцебска.

Лепшыя з лепшых атрымалі дыпломы і падарункі. Апрача асобных удзельнікаў, журы вырашыла ўзнагародзіць літаратурны клуб юных паэтаў аб'яднання пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі Полацка (кіраўнік Н. Ярмак), літаратурны клуб "Вытокі" Балаёўскай СШ Пастаўскага раёна (кіраўнік В. Грыбовіч), літаратурны клуб цэнтра выхаваўчай работы г. Оршы (кіраўнік М. Дзмітранок).

Дасць Бог, пабачыць свет і знойдзе свайго чытача чарговы зборнічак юных літаратараў Віцебшчыны, бо гэты край, як і ўся Беларусь — край паэтаў.

А. САКАЛОЎСКІ

Швейк загаварыў па-беларуску

Выдавецтва "Ураджай" выпусціла ў серыі "Школьная бібліятэка" знакаміты раман Яраслава Гашака "Прыгоды ўдалага салдата Швейка". Творы Я. Гашака, у тым ліку і згаданы раман, узнаўляліся па-беларуску яшчэ ў 20—30-ыя гады, але менавіта цяпер у выдатным перакладзе Алеся Мажэйкі гэты твор набыў сваё непаўторнае, адметнае гучанне.

А. Мажэйка мае немалы вопыт у галіне перакладу. І не толькі з чэшскай, але і са славацкай, польскай моў. Найбольшага ж поспеху дасягнуў у пераўвасабленні твораў чэшскіх пісьменнікаў. Першыя яго пераклады ўвайшлі ў кнігу "Чэшскія і славацкія апавяданні", якая пабачыла свет яшчэ ў 1958 годзе. Дарэчы, укладальнікам тае кнігі быў Іван Мележ.

Сам жа А. Мажэйка ўклаў кнігу Я. Гашака "Госць у хату" ("Мастацкая літаратура", 1984) і пераклаў для яе некалькі твораў гэтага пісьменніка. Пераклады А. Мажэйкі змяшчаліся ў альманаху "Ветразь", у зборніку "Усмешкі сяброў". Разам з В. Крайко ён пераўвасобіў па-беларуску раман П. і В. Вояраў "Закаханыя".

Да ўсяго А. Мажэйка з'яўляецца аўтарам многіх артыкулаў пра сувязі беларускай і чэшскай літаратур, пра кантакты беларускіх пісьменнікаў з чэшскай літаратурай і пра сувязі чэшскіх літаратараў з Беларуссю.

Першая персанальная

У жыцці раз бывае васемнаццаць год. Таму і спяшаецца малады мастак з Гомеля Сяргей Радчанка. На персанальную выставу жывапісу і графікі, якая адкрылася ў выставачнай зале Гомельскага універсітэта, выхаванец мастацкага вучылішча імя Глебава прадставіў каля двухсот работ, столькі ж засталося ў запасніках.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА

ВІНШУЕМ!

Соф'і ШАХ — 50

Сапраўды ўжо: чалавек, незалежна ад прафесіі, калі мае талент, абавязкова заявіць аб сабе. Жыццё Соф'і Шах — пацвярджэнне таму. Лагапед па прафесіі — яна стала паэтам па прызванні. І яе вершы, што друкаваліся ў калектыўных зборніках і выходзілі асобнымі кніжкамі, — напоўнены шчырасцю, тонкім лірызмам і глыбокім роздумам, на якія здатна толькі жаночая душа. Пра што б ні пісала Соф'я Мікалаеўна, яна заўсёды знаходзіць адметныя словы, каб па-свойму выказаць і перадаць тое, да чаго часам звярталіся і іншыя. Ды пра паэзію лепей менш гаварыць, а трэба больш чытаць яе. Такую магчымасць рэдакцыя "ЛіМа" і дае сваім чытачам, выносячы на іх суд новыя творы С. Шах і віншуючы яе з 50-годдзем, жадаючы новых жыццёвых і творчых поспехаў.

Соф'я ШАХ

У свет вышынны, шматгалосы...

Санет

У "я" маім, здаецца, столькі моцы
і столькі прагі выспелай ляцець
і неўтаймоўна вышыні хацець,
у тым не адчуваючы пагрозы...

Такія з духам творацца дзівосы,
што і самой падчас не ўразумець,
і як яму ўдаецца не старэць,
а мкнуцца ў свет вышынны, шматгалосы.

У абалонцы дух, а ўсё ж — свабодны.
Ці не таму, аднак, што — богаўгодны,
што сам ён па сабе — бы гучны храм.

Здаецца, сілы спеўнае ў ім столькі,
што досыць і на даўнія вытокі,
што хопіць і аддаленым вякам.

Анёлы

Да карціны У. Вішнеўскага "Белы і чорны анёлы"

1

Змрок — і спадзяванне на святло.
Святло — і непазбежнасць змроку...
Так да нас вякі назад было,
так вякі наперад будзе зноўку.

Дзве стыхіі вечныя вакол,
дзве яны ў бясконцасці сусветнай:
ў змрочнай — чорны тоіцца анёл,
белы тоіцца анёл — у светлай.

І ніхто не бачыць кожны раз,
снуючыся ў мітусні штодзённай,
як змагаюцца яны за нас —
існа, неслабеюча, бяссонна.

Чорны з белым — каб узяць свой верх,
белы з чорным — каб не выйшла гэта.
Чорны сцелецца за чорным шлейф,
па-за белым — белы шлейф прасветам.

Барацьба, канца, бадай, якой
не было, няма, ды і не будзе,
бо мы ўсе дапамагаем ёй, —
хто за чорным, хто за белым, — людзі.

2

Змагаюцца непрымірыма анёлы, —
нямая, няўпынная скрозь барацьба.
Што ж чорны злой радасцю быццам
вясёлы?
Што ж белы, ў якога ў вачах бы журба!

За белым — выразна віднеюцца душы,
за чорным — не бачна, хаця яны ёсць.
І кожны сваёй неадступнасцю дужы,
бо стаць дабрынёй не згаджаецца злосць.

А хто пераможа па-над небасхілам, —
не проста сказаць і складана ўявіць.
За чорным — стаіць сатанінская сіла,
за белым — Гасподняя сіла стаіць.

Дарога

Да карціны М. Палянкова "Забытая дарога"

I

Адкуль вяла? Куды імкнула?
І што, урэшце, быў за час?
Напэўна ж, поўнілася гулам
ды трэскам-рокатам штораз.

Напэўна ж, кожны дзень жывілі
яе людскія галасы.
Напэўна ж — так! — па ёй кацілі
пустыя й поўныя вазы.

І брэх сабачы, смех дзіцячы,
і тупат конскі, — ўсё было.
І вось травой, травой, як бачыш,
жыццё дарогі зарасло.

Яе ад поля з неспадзеву
і не адрозніць бы ані,
каб не кусты наўзбоч, не дрэвы,
каб не вынослівыя пні.

Ляжыць ні мёртвай, ні жывою...
І страшна неяк уявіць,
што і дарогу доляй злою
магчыма назаўжды забыць.

2

А штосьці ж, напэўна, лучыла
на доўгім і цяжкім вяку.
А штосьці ж, напэўна, вяршыла
штораз пры святле й нацямку.

Камусьці ж была, пэўна, доляй,
выводзіла дзесь на бальшак,
а можа, каму і нядоляй
рабілася неяк няўзнак.

Ад вёскі да вёскі ляжала,
а можа, і ў горад вяла.
Дажджы, завірухі трывала,
пыліла наўсцяж ад цяпла.

Пясчаная, — колькі адчула
абутых і босенькіх ног...
Усё незваротна мінула, —
бы знікла пад гэты мурог.

І зараз нікога, нічога
не помніць яна і сама...
Дарога — ужо не дарога,
калі на ёй руху няма.

Туман

Да карціны У. Л. Зінкевіча "Цішыня"

I

Ці згушчаецца ён, ці радзее, —
гэты вечны, бязмежны туман?..
Скрозь яго валявы птах надзеі
мкне да ясных, збавенных палян.

Што за век, што наўкол за стагоддзе?
Эра нашая? ці да яе?
Неакрэслены птах бессмяроцця
то ўзнікае, а то растае.

Недзе ўспыхнуў, прабіўшыся, промнік,
недзе сталася даль чарнатой...
Птах свабодны ці ўсё ж птах-палоннік
прарываецца скрозь неспакой?

Клубы шэрай, напятай стыхіі, —
ні пачатку яе, ні канца.
Яшчэ міг — і здаецца, размые
яна лёткага птаха-ганца.

2

Мутная, маўклівая прастора, —
гасне-вязне ў ёй птушыны крык,
глушыцца і роспачнасць, і змора,
рвецца часу стоены адлік.

Не ўтрымаць у памяці адлегласць, —
непазбежны і бясконцы шлях.
Ніз і вышь — суцэльная няпэўнасць,
мройны вымысел, няўцямны страх.

Крылам ані маху, ні размаху,
хоць улева, хоць управа — зман, —
спробы і кароткага зігзагу
паглынае ўзвіхраны туман.

І адно, што ў бездані трымае,
не дае спыніць няўхільны рух, —
гэта прага далечы жывая,
ды нязгасны, неўтаймоўны дух.

ПРОЗА

ЗЛОДЗЕЙ

Ішоў Сцяпан Зубовіч скалелы, знашчаны, злы. Кляў пранізлівы скавыш і мароз, кляў міліцыянтаў, якія прыкрылі ягоны "бізнес": канфіскавалі ўвесь тавар — перакупленыя ў заезджых камерсантаў цыгарэты.

"Хоць дамоў не паказвайся, — скрушна думаў. — Загрызе Вера!"

І сапраўды, не пераступіў парог — жонка вырачылася. Заікаючыся, паведаміў пра няшчасце.

— Расцяпа, ёлупень! — залямантавала яна. — Скрозь яго крыўдзяць! Недарэмна выпхнулі і з завода.

— Няпраўда — скарацілі, — нясмела паправіў Сцяпан.

— Якая розніца: ці савой аб пень, ці пнём па саве! — зарвала Веру. — А выхваляўся: мяне паважаюць, я перадавік, ардэнаносец! Нос дзёр: мой партрэт на Дошцы гонару. Даскакаўся?

— Прафесія фармаўшчыка непатрэбная сёння.

— Іншую работу знайдзі!

— Дык шукаю. Толькі куды ні сунуся — глуха.

— Целяпень! — жончын твар ажно перакасіўся. — Людзі не працуюць, а жывуць — о-го-го! Вазьмі Хамянка. Спекулюе направа і налева, затое і мае. Адну машыну вымергаваў, другую намыльваецца прытарабаніць.

— Спрытны Хамянок, умее круціцца.

— А табе хто не дае?

— Не шанцуе мне. Паджгаў у Польшчу — рэкеціры абчысцілі, у Маскву ткнуўся — міліцыя штрафанула.

— Няўдаліца ты, — заплакала Вера. — Гора з табой!

Не жадаючы спрачацца і тым самым гнявіць жонку, Зубовіч прыкусіў губу. Разумеў: праўду кажа яна — невязучы ён. Не паспелі звольніць — з лецішча восенню бульбу, гародніну, слоікі з квашанінай, з варэннем ды кампотамі пакралі. Каб не галадаць, Сцяпан, услед за гарадскімі бічамі і выпівохамі, зачасціў з мяшком да бліжніх калгасных буртоў. Дык зноў жа — вартаўнікі смальнулі соллю па лытках.

— Патрывай, — памкнуўся суцешыць жонку. — Сезон наступіць — нехта пакліча печку зляпіць ці дах накрыць на дачы.

— А як трываць? Да вясны вунь яшчэ колькі, а мы ўжо лапу смокчам! — затрэсліся Верыны плечы. — Забылася, калі ўдосталь ела. Надта не пашыкуеш на маю фельчарскую палучку. За кватэру год не плачана. У Яні сукенкі няма, — указала пальцам на дачку, якая, віснучы над падручнікам, з-пад ілба зверавата, акурат вінаваты быў, працінала бацьку вачыма. — Сярожа праз тыдзень на канікулы прыкоціць, а яму і красоўкі купі, і з сабой дай.

— Якія красоўкі? За што, дзе мне ўзяць? — разгубіўся Сцяпан.

— Ты гаспадар — твой клопат!

— Ладна! — псіхануў Зубовіч, цапнуў на кухні паласатую сумку, рушыў да дзвярэй. — Пайду... пайду жабраваць... У пад'ездах людзей рабаваць!

— Даўно пара! — пачулася наўздагон. — Ідзі, каб ты не вярнуўся!

Ад знявагі, ад крыўды не памятаў сябе. Бег і бег, бы яго лазінай лупцавалі.

Спярша трухаў праз высозныя камяніцы. Потым пятляў між атуленых парканамі дамоў. Нарэшце выцерабіўся за горад. Пайшоў бездаражжу, ледзь значнай пуцявінай, полем. Неўзабаве дыбаў ускрайкам лесу.

Дзьмуў калючы вецер. Гнаў пазёмку. Сек па твары крупкай.

Непрыкметна заныла, зашчымела пад лыжачкай. То азваўся голад. Як паснедаў — мачыны ў роце не было. А што там глынуў: вермішэлі, прыдобранай алеем, і кефіру кубачак. Дык, канечне — зайграюць кішкі.

Сцяпан нахіліўся, хапнуў жменю снегу, скамечыў яго, каўтнуў. Нібы палягчэла. Здаецца, прапала нудота.

Брыў гадзіну ці больш.

Запыніўся, уздыхнуў сярод дачнага пасёлка супраць сваёй хмурай дашчанай халупіны і двухпавярховай цаглянай будыніны Андрэя Гарнака.

— "Чаго я сюды прыпёрся цемрачу? Якой трасцы мне трэба тут?" — пашкроб патыліцу.

Зноў запякло ўнутры, зарэзала куды вастрэй. І Сцяпан зноў згорбіўся, заняў шчопаць белай сыпкай жарствы, глытнуў.

"Прахіндзей Гарнак! — кашлянуў. — Слесарам быў. Валок усё, што дрэнна ляжала. Колькі месцаў перамяніў. Адусюль турылі. Судзіць меліся, ды вылузаўся. Бізнесменам вось зрабіўся. Меркам адчыніў. Дзве цырульні прыдбаў. Разбагацеў шэльма! Недарэмна палац адгрукаў, — абвёў вокам Гарнакоў мур. — Ліхач!"

ШРАМЫ НА СЭРЦЫ

Леанід КАЛОДЗЕЖНЫ

АБРАЗКІ

Зубовіч азірнуўся — ні гуку, ні агеньчыка наўкола. Зырыла лямпачка толькі праз пару хацін — у галоўнага інжынера камбіната Івана Сымонавіча Лук'янчыка.

"Піруе з кампаніяй сваёй", — каўтнуў сліну.

Пры напаміне пра яду гулка забурчэла ў жываце. Чамусь прыгадалася, як прымаразкамі Гарнак паклікаў яго пасабіць апусціць бочачку гуркоў у падвал. Сцяпана вельмі ўразіла тады Андрэева сутарэнне з мноствам паліц і стэлажоў, загружаных мяснымі ды рыбнымі кансервамі, імпартнымі і свойскімі закаткамі, бутэлькамі і глечыкамі віна, гарэлкі, каньяку. Міжволі ўсплыло, як яшчэ вясной, калі згубіў ад сваіх харомаў ключы, Андрэй, каб пранікнуць у памяшканне, вымаў акно. І ён, Сцяпан, не цямячы, не ўсведамляючы пакуль што мэты, адшчапіў кручок весніц і паклыпаў сцяжынай; абагнуў вугал веранды, з тыльнага яе боку, ад агрэсту, ступіў да таго самага акна, праз якое лез Андрэй, адагнуў прыгнутыя цвікі, выкалупнуў раму і — уздрыгнуў, жахнуўся: што раблю, я ж красці гнятуся! Але не запыніўся, не адмовіўся ад свайго намеру, бяздумна кульнуўся ў чорную зяпу; намацаў карабок, асцярожна церануў запалкаю; рыпнуў дзвярыма прыхожай, расхлябіў люк склепа, апусціўся па лесвіцы ўніз.

Ні хмельнага, ні салодкага не чапаў. Браў толькі тушонку. Цэлую сумку нагаціў ёю. Па бляшанцы нават у кішэні курткі ўвапхнуў.

Наверх выкараскаўся ацяжараны.

— Каго бачу! — асляпіў прамень ліхтарыка. — Сусед!? — агламуздзіў бас Гарнака.

— Ці не гаварыў я: злодзей арудуе на тваёй фазэндзе! А ты — не веру, прыдалося табе! — пачуўся кплівы смяшок Івана Сымонавіча. — Каб не прыспічыла мне, каб не выйшаў на ганак — абчысціў бы цябе Зубовіч!

— Хто б падумаў! — тхнула ад Андрэя спіртным.

Удар у сківіцу аглушыў Сцяпана. Ён выпусціў ношку, боўтнуўся. Аднак яго ўтрымаў, бы клешчамі, кароткімі дужымі рукамі Гарнак, узняў пад столю, шпурнуў у светлы аконны праём. Сцяпан шмякнуўся ля шыпаватага куста. Следам за ім выгупнуў Андрэй, раз'юшана пачаў таўчы, мясіць нагамі ляжачага. Той не прасіў літасці, не стагнаў, а курчыўся ніцма і маўкліва прыкрываў далонямі цемя.

— Хопіць, Міхайлавіч! Заб'еш, — перасцярог Лук'янчык сябра. — Адказваць давядзецца.

Гарнак імгненна астыў, згроб Зубовіча за каўнер, вывалак за варотцы, кінуў сярод вулачкі.

З носа, з рота ў Сцяпана цякла кроў, барвовіла снег.

НАЦЫЯНАЛІСТ

Прадуктовы нагадваў вулей. Мужчыны, жанчыны гаманілі, няўрымсліва таўкліся, тасаваліся. Асабліва тлумна было каля прылаўка. Калі адзаду панаваў спакой, то там чыніўся бедлам: чуліся крыкі, лямант, лаянка.

— Жах! Ну і дзянькі наступілі! — абуралася лупатая кабета. — Народ азвярэў!

— Чакай! Хутка палагаднеем, — чмыхнула другая, рыхлая, ацеслівая. — Падскочуць цэны — ураз падшчэмім хвасты.

— Пабойся Бога! Куды ўжо цэнам узнімацца?! І так канцы з канцамі не зводзім.

Сюды, у фірменны павільён, дзе можна купіць скароміны дзешавей, чым у іншым магазіне альбо на базары, кожнай раніцы сцякалася мноства людзей. Прыблуджвалі нават вяскоўцы.

— Фу, нет больше мочи, Антонина Сергеевна! — скардзіўся чапурыстай дамачцы, якая пераміналася побач, істэрычна-стузаны чалавек. — Ноги подгинаются. Скорее бы отовариться.

— Держите, Валерий Никонович, карман пошире, — скрывіла тая вузкія падфарбаваныя вусны. — Схватишь что из-за торбешников. Мало городской нищеты, так и колхозники лезут, — павяла яна брывом на хударлявую старую ў плюшавай жакетцы.

Бабуля ўздрыгнула, быццам яе ўдарылі, стуліла плечы, заміргала і, бы апраўдваючыся, прамовіла:

— Дык і я ж есці хачу. Я ж не маю ні парсючка, ні кароўкі. Трымаю чатыры курачкі і пеўніка.

— А кто мешает завести? — насупіўся кампаньён Антаніны Сяргееўны.

— Дык жа ж сілы нямашака... Здароўе паганае.

— Лечитесь, — тузанулася дамачка.

— Не грашыце, шаноўныя, — не стрываў я. — Пасаромеліся б.

— Ты чё-о возникаешь? — надыбурыўся мужчына. — В твою контору не звонят. Чо встреешь не в свое дело?

— Разве не видите — адвокат отыскался! — хмыкнула Антаніна Сяргееўна. — В адвокаты нанялся.

Мне зрабілася не па сабе. Закарцела асадзіць нахабаў. Але ўзяла верх развага, і я прыкусіў язык, адно падумаў: ці ж яны вінаватыя — набалела ў іх на душы.

Па меры таго, як пасоўвалася чарга, мацнела штурханіна.

— Стойце! Не цісніце! Пашкадуйце — задыхаюся!

— Гэй, жлабы, не прыцеся напралом!

Перад гладкай размаляванай прадаўшчыцай я ўчаперыўся за бліскучую нікеліраваную парэнчу:

— Будзьце ласкавы, кавалачак ялавічыны, — прагаварыў.

— Чаво?! — зморшчылася гандлярка.

— Гавядзіны і пару свіных ножак для студня, — паўтарыў гучней.

— Не панімаю цібя! — успыхнула маладзіца. — Аткуда такой?

— З неба зваліўся, — памкнуўся аджартавацца.

— Ано і відна, а ішчо галстук усчапіў!

Сярдзіта выгаворваючы, перасмешніца ўсё ж злітасцівілася, узважыла і тое і другое.

— І яшчэ сала з паўкілаграма, — заікнуўся зноў. — Вунь ад таго крайняга кавалка адрэжце.

— Не камандуй! Ат какова даюць — бяры і сматывайся, не задержывай астальных!

— Калі ласка, ад таго, што з праслойкам.

— Сколь можно глагольствовать?! — узбурыла мужчыну. — Гони его, девушка!

— Не отпускайте ему! — умяшалася і Антаніна Сяргееўна. — Пусть научится по-человечески говорить. Он — бэнэфовец. Осмелели! Раньше бы с ними не церемонились. Пора и сейчас прижать. Все непорядки из-за них!

Я выціскаўся з чаргі, а ўслед неслася:

— Националист... Проклятый националист...

ПЛЕЧАВАЯ

— Дурніца ты, Кларка! Каму са сваёй дзесяцігодкай ты патрэбная? Зараз такіх разумніц — гаць гаці! Колькі я казала: пойдзем на трасу, дык ты губу закапыльвала — не, не! А паслухалася б — даўно б цвіла і пахла. На мяне паглядзі: і сытая, і разадзетая. А хадзіла ж жабрачкай. Канечне, спачатку брыдка было: плечавая! Але скора сцерпілася, — пад глухаваты шэпт колаў, пад людскі тлум прастарэкала ля вуха Света. — Звыкнешся і ты. Галоўнае — валютай зашамаціш.

Слухала Клара і не слухала расфуфыраную сяброўку, маўкліва, адрачона таропілася ў акно, за якім праплывалі то квяцістыя лугавіны, то астравы шатрыстых ніцых лазнякоў, і мыліла ярка напамаджанамі вуснамі.

— У цябе для гэтага — стопрацэнтныя даныя: і мордачка, і фігурка, — буркавала дарадца. — Усе кадры ў драбадан будуць тваімі. Адно — не бянтэжся. Мужчыны — кабялі. Дзярбань іх без жалю. Асабліва старых казлоў. Захочуць такую лялю — раскашэляцца. Вадзілы — чувакі памяркоўныя. Старайся дальнабойшчыкаў ахмыраць, а лепей — чучмекаў розных.

З-за таполевай абсады вымільгнула скрыжаванне. У Клары неўсвядомлена затрымцелі рукі, ногі.

Выслізнулі з аўтобуса ля рэстарана "Сустрэча", дзе заўжды прытарможвалі і грузавікі, і легкавушкі, куды забягалі шафёры глытнуць кока-колы ці мінералкі, утаймаваць голад. Клару яшчэ больш заліхаманіла.

— Чаго калоцішся? — заўважыла Света.

— Н-ня ведаю, — дробна ляснула зубамі небарака.

Напарніца акінула яе кемным позіркам і рашуча сцяла запясце, павалакла ў прыветную будыніну.

— Гайда, вылечу!

Там узяла па фужэру іскрыстага віна, дзюбнула аб ейны сваім і загадала — сербані!

Выйшла Клара паспакайнелая. Шумела ў галаве. Па целе разлілася прыемная цеплыня.

— Ну, акрыяла? — локцем тоўхнула Света.

— Ага.

— Тады — ні пуха, ні пяра! Дзейнічай!

Першай падлаўчыла "кліента" і адчаліла з ім на тралеры Света.

Клара доўга і няўпэўнена тапталася ўскрай пляца. Тунькалася туды-сюды, не адважваючыся падысці да каго-небудзь. Можа б, і не асмелілася, можа б, пастаяла ды і рушыла прэч, калі б не ўпасвілі яе два коратка стрыжаныя жыхары поўдня — высокі, стройны і каржакаваты, пры вусіках. Яны крочылі ад "Сустрэчы". Высокі зашчэмліваў за рыльцы між пальцаў па пляшцы каньяку ў кожнай руцэ, а вусаты таўсцячок нёс бярэма бананаў і пачак "Мальбара".

— Далэко, дэвушка, пут дэржым? — зачапіў яе высокі.

— Адсюль не відно! — неадпаведна выгляду бойка выгукнула Клара.

— Дак садыс! — гоцнуў ён да жучковага лімузіна і паслужліва адчыніў заднія дзверцы.

Дзяўчыну ашаламіла: няўжо ўсё так проста?!

— Садыс, садыс — падкінэм! — скмеціўшы разгубленасць, далікатна папіхнуў яе ў салон і следам нырнуў сам. — Как тэбя завут? — пацікавіўся, ледзь вусач сеў за руль і рвануў з месца.

— Каця! — гулліва зманіла Клара.

— А мэня — Тэнгіз, а его, — ткнуў у спіну таварыша, — Рэваз. Мы — з Кафказа.

— Бачу, не сляпая! — рагатнула прасцячка.

Балбочачы, Тэнгіз пасунуўся цясней і быццам бы ненарокам паклаў на Кларына аголенае круглае калена валасатую пяцярню. Клара тузанулася, памкнулася адмежавацца, аднак апамяталася, устрымалася і, як вопытная спакусніца, блазліва выскалілася. Юрлівец імгненна ачмурэў і аблапіў яе.

— Рэваз, врэма б нам перэкусыт, — неўзабаве неяк здушана прахрыпеў і спытаў у Клары: — Ты, Катэнка, не жэлаешь?

— Не супраць. Можна! — адказала Клара.

Праз вярсту-паўтары Рэваз высачыў пакаты спуск, збочыў з асфальту, завіляў замуравелай сцяжынкай, затым крута звярнуў, пакіраваў калдобістай мяжой міма каласістага жыта і непралазных хмызоў; па палявых раманах, па касцяру праехаў трохі і запыніўся.

Весела, як добра знаёмыя, апусціліся ва ўтульным цяньку танклявай, абвітай да вершаліны пышным шышкаватым хмелем алешыны. Рэй павёў Тэнгіз. Не забэрсваючы язык, разгарнуў плітку шакаладу, адкаркаваў каньяк і набулькаў тры ёмістыя кволыя пластмасавыя стопкі.

— Прашу! — галантна працягнуў адну Клары і зухавата ўсклікнуў: — Будэм!

Дзяўчына не куражылася. Ахвотна чокнулася, без прынукі асушыла пасудак і войкнула, папярхнулася, хапнула разлузганую Рэвазам звабную бананавую кацелку.

Не дамаўляючыся, кампаньёны ажыўлена загаманілі, загулі. Клара расхрабрылася, расслабілася і, хоць цяміла гэта, рабіла і гаварыла зусім не тое, што было ёй уласціва: задзірыста смяялася, узвісквала, нават закурыла, пыхнула дымам, але закашлялася і шпурнула цыгарэту.

— Давай, Катэнка, лутшэ вып'ем! — прапанаваў Тэнгіз і, не чакаючы згоды, напоўніў толькі дваім. — Рэвазу болшэ нэлза, — патлумачыў. — Рэваз — за баранкай.

Пасля другой чаркі Клара раптоўна абмякла. Жылы яе набрынялі млявай стомай.

Чамусь спахмурнеў, унурыўся і, натужна сапучы, узняўся Рэваз.

— Я машыну пасматру... я — сэйчас... — буркнуў ён.

Яшчэ шалахаліся за ім альховыя галіны, а Тэнгіз ужо няўрымсліва згроб Клару, падкамечыў падыспад, зашнарыў па клубах, захакаў паўз скроню. Задыхаючыся пад ягоным цяжарам, пераадольваючы боль, яна папракнула сябе: эх, шкада, загадзя не намякнула пра таксу! Ды тут жа суцешліва падумала: ладна, потым... потым скажу! Затуманенымі вачыма яна мелькам абмацала бухматыя булахоўкі хмелю ўгары і пакутліва змружыла вейкі.

Не маючы сілы ні прараніць слова, ні зварухнуцца, яна адчувала, як адразу ж за Тэнгізам гэтак жа люта мяў, курчыў яе Рэваз, як трохі пазней, здаецца, ужо ўдвух, Тэнгіз і Рэваз глуміліся над ёй.

Ачомалася суцемкамі ад вечаровай свежасці, ад воглай расы. Ляжала яна прыкрытая дзеля прыліку знушчанай спаднічкай усё пад той жа алешынай. Вобліз жудліва блішчала пустая каньячная бутэлька і бялела бананавае лупінне.

Захліпаючыся ці то ад дрыжыкаў, ці то ад плачу, Клара ўкленчыла, пакволілася ўстаць, каб апрануцца, але страшная ламота працяла цела, пякотная рэзь апаліла ніз жывата, і яна са стогнам рухнула на зямлю.

НЯНАВІСЦЬ

— Малады чалавек, а малады чалавек! Ай-яй! І не сорамна вам? Куды прэце?

— Куды і ўсе — у аўтобус.

— Уважце старых! Дазвольце мне зайсці.

— Вушлы, баця! Вас прапусці, а сам адзінаццатым нумарам шуруй? Не, пардон!

— Я ж хворы, інвалід я.

— Дужа многа такіх зараз. Праходу ўжо няма. Паўсюль першымі шчэміцеся.

— Нам паложана.

— Чаму ж гэта?

— У нас ільготы.

— Далі вам волю.

— У нас правы.

— А нашы дзе?

— Заслужыце. Мы дзеля вас ні здароўя, ні жыцця не шкадавалі.

— Дзякуй! Яно і бачна — ашчаслівілі!

— Мы ваявалі.

— Хто?

— Я.

— У Ташкенце кроў мяшкамі праліваў ці ў паліцыі курэй за горла цапаў? Сапраўдныя франтавікі даўно зямлю параць. Тут яшчэ разабрацца трэба. Вунь ражка — хоць прыкурвай!

— У мяне цэлыя грудзі ордэнаў... медалёў!

— Знайшоў чым хваліцца! У каго іх няма?

— У цябе.

— Адкуль ведаеш? Я — афганец.

— У мяне... у мяне — граматы галоўнакамандуючага, самога Іофіса Вісарыёнавіча Сталіна! А ты... ты, смаркач, зневажаеш заслужанага чалавека! Ды я табе морду растаўку!

— Паспрабуй, казёл лысы! Урэжу раз — ласты склеіш!

— Іншага ад такога і чакаць нельга! Паслухайце, людцы, што сказаў гэты галаварэз! Ну і дзеткі, ну і дзеткі!

(Працяг на стар. 12)

ЛіМ ЧАСАПІС

Восень, Набокаў і музыка

Сціпла прылічваючы сябе да сапраўдных знаўцаў і аматараў сучаснай музыкі, а таксама і да кампазітараў, дзякуючы якім яна з'яўляецца на свет, я вельмі ўважліва сачу за дзейнасцю ансамбля салістаў "Класік-Авангард", чые канцэрты ўжо даўно сталіся для мяне самымі жаданымі.

Большасць новых твораў можна пачуць толькі ў выкананні гэтага калектыву. Зрэшты, для яго часцяком пішуць музыку спецыяльна, і таму амаль кожная прэм'ера — гэта не толькі першае выкананне на сцэне, а яшчэ і нараджэнне твора, яго матэрыялізацыя, увасабленне выканаўцамі аўтарскіх ідэй і музычных вобразаў. Наколькі я ведаю, мастацкі кіраўнік ансамбля Уладзімір Байдаў вельмі ашчадліва ставіцца да музычнага тэксту і патрабуе дакладнага выканання аўтарскіх заўваг. Дзякуючы гэтаму інтэрпрэтацыя твора часцей за ўсё цалкам адпавядае кампазітарскай задуме.

Той вечар падараваў слухачам адразу дзве прэм'еры. Першая з іх — маленькая фантазія для камернага ансамбля "Дзень на пачатку лістапада" Галіны Гарэлавай з эпіграфам Басё, японскага паэта 17 стагоддзя: "Вось і восень прыйшла", — шапнуў мне ласкавы вецер, дакрануўшыся да падушкі маёй".

Мяккі і пяшчотны твор — так выказваць свае думкі і пачуцці можа толькі жанчына. Майстэрствам гукапісу ў наш час авангарда і постэкспрэсіянізма валодае далёка не кожны. Аўтару трэба перадаць гукі жывой прыроды менавіта сродкамі музычнай выразнасці, зрабіць іх найбольш набліжанымі да арыгінала, і пры гэтым захаваць індывідуальнасць тэмбраў, іх колеравую непаўторнасць. Сустракаючыся з творамі такога кшталту, я цалкам прысвячаю сябе слуханню Музыкі — у гэты час мяне не цікавіць тэхніка ці драматургічныя канцэпцыі: толькі гукі, гарманічныя спалучэнні, меладычныя лініі, толькі вобразы — мары і ўспаміны — уладараць у маёй душы. Сузіранне жыцця, нават медытатыўнасць, узнікненне з нічога, з-за далёкага небасхіла, і знікненне ў нікуды, — прыкладна так мы ставімся да сваіх сноў: прачнуўшыся, спрабуем успомніць іх сутнасць, прыслухоўваемся да сваіх адчуванняў, асабліва, калі яны прыемныя. І даволі часта ўсведамляем, што хацелася б убачыць гэты сон яшчэ раз, паспрабаваць вярнуць той час ізноў, каб паспець запытацца ў сябе пра ўсё, што мае значэнне ці асаблівую каштоўнасць, прайсці своеасаблівы абрад ачышчэння — перад уласнай душой, перад жыццём і сумленнем.

Як жа добра трэба ведаць і ўяўляць сабе існасць душы наогул, каб, аналізуючы асаблівасці сваёй, прымусіць слухача зазірнуць ва ўласную! Дзякуючы гэтаму твору, які я ўспрыняў як аўтарскую споведзь, зрабіліся зразумелымі некаторыя праблемы, што даўно займалі мой розум і ўвесь час пра сябе нагадвалі. Цяпер яны далёка, дзесьці за небасхілам...

Другая прэм'ера — новы твор Вячаслава Кузняцова — гукавое ўвасабленне фрагментаў рамана Уладзіміра Набокава "Запрашэнне на кару". У адрозненне ад папярэдняга, гэты твор — цалкам праграмны, таму слухаць яго было значна лягчэй: успрымаць новы твор, наперад ведаючы яго "сюжэт" да таго ж і асабліва цікава. Так ці інакш, задаешся пытаннем: у якой ступені аўтару ўдаўся твор, які можна лічыць адпаведным асноўным сюжэтным лініям першакрыніцы. Скажу адразу: аналізаваць яго з традыцыйнага пункту гледжання нельга — гэта зусім новы твор.

Якія менавіта фрагменты рамана леглі ў яго аснову, пасля першага праслухоўвання сказаць адназначна нельга. Мабыць, асноўную ролю тут выконвалі вобразы: тупы і сыты натоўп, што ўладарыць над грамадствам і асуджае на знішчэнне ўсіх тых, хто непадобны на яго, ды Цынцынат Ц., дзівак, які парушыў спакой ды пахіснуў сістэму. Набокаў ставіцца да натоўпу ў вышэйшай ступені пагардліва, супрацьпастаўляючы яму сваіх герояў, — так ён выказвае свой пратэст, але добра разумее, што яны асуджаныя яшчэ з моманту свайго нараджэння, бо сістэма не даруе ім, нават і не прыслухаецца да іх, не паспрабуе хаця б зразумець, чаму з'яўляюцца на свет іншыя, не падобныя да ўсіх, людзі? Лягчэй за ўсе зніштожыць выпадкова ўзнікшую перашкоду і супакоіцца. Што ў рамане і адбылося.

Тры тыдні чакаў галоўны герой таго моманту, калі кат месье П'ер запросіць яго на кару. Разгублены герой не мог зразумець, што рок насоўваецца на яго хутка і няўмольна і што нічога нельга змяніць. Гэтым тром тыдням адпавядаюць тры музычна-драматургічныя хвалі, якія мэтанакіравана рухаюцца да моманту самой кары. Кампазітар вельмі дакладна перадаў тыя думкі і адчуванні, што перапаўнялі галоўнага героя, тое галёканне натоўпу, што прыбег на Цікавую плошчу па чарговую забаву, і тую чысціню душы Цынцыната, які ў самы страшны кульмінацыйны момант свайго жыцця ўзнёсся ў сваёй непаўторнай індывідуальнасці так высока, што нават перастаў адчуваць з рэчаіснасцю ўсялякую сувязь...

Георгій САСНОЎСКІ

Жывы гук — жывы!

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ФЕСТЫВАЛЬ ЭСТРАДНЫХ АРКЕСТРАЎ

А цікава: ці маглі б сабе ўявіць чытачы гадкоў 60 таму, ды і пазней, што міне час, і... І карэспандэнт "ЛіМа", пераступіўшы парог клубнай установы аднаго суровага ведамства і ледзьве не сутыкнуўшыся з прыгожай (бронзавай?) фігурай "жалезнага Фелікса", паспяшае на заваблівыя жывыя гукі — гэткую выбуховую сумесь бэндавага свінга, свавольных сола, пякучых воплескаў? Хто ж са старэйшых не памятае: "Сегодня он играет джаз, а завтра..."

Як усё ж такі жыццё мяняецца!

І заўтрашні дзень ужо, здаецца, не абяцае нічога пагрозлівага для нашых джазменаў. Толькі творчую перспектыву, радасць новых сустрэч з публікай ды фестывальных стасункаў з калегамі. Урэшце, усё гэта мелі яны ўжо сёлета — дзякуючы музычнаму фэсту, які прыдумаў маэстра Міхал Фінберг, падтрымала Міністэрства культуры, а зладкаваць дапамагалі музыканты і адміністрацыйна-пастановачная група Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі, дырэктар фестывалю, наш вядомы джазавы лаўрэат Аркадзь Эскін, гукарэжысёры Уладзімір Пазняк ды Алег Хромаў, мастак-сцэнограф Галіна Холад, вядучы праграм Дзмітрый Падбярэзскі.

Дарэчы, ён, вядучы, прыгадаў, як гадоў дзесяць таму намаганнямі камсамола ды нованароджанага Музычнага таварыства ўдалося ўпершыню сабраць разам джазавыя калектывы рэспублікі — на "Віцебскай восені". Тады іх было восем. Цяпер на падтрыманую дзяржавай сталічную імпрэзу сышліся-з'ехаліся размаітыя аркестры, ансамблі, якіх аказалася больш за дваццаць.

Інструменталісты і не толькі (давялося пачуць і джазавы вакал). Духавікі ды клавішнікі. Салісты з ладным стажам і амаль пачаткоўцы. Прафесіяналы класныя і не надта... Доўга можна разважаць пра тое, што ды як яны гралі, чым розніліся. Разважаючы, можна і паспрачацца. Пра густы, напрыклад. А вось калі адкінуць усё спрэчнае, дык можна вылучыць, бадай, адну абсалютную рэч, якая паяднала досыць стракатую фестывальную грамаду.

Гэта — **жывое** гучанне!

Фестывальная сцэна ўспрымалася чараздзейнаю выспай, на якой **жыве жывы гук** — даўні выгнаннік шоу-бізнесу, адвечны апазіцыянер камерцыйных эстрадных канцэртаў. І падзівіцца на гэтую выспу можна было нават неплацежаздольнаму студэнту: да каго "не дайшлі" запрашальныя білеты, маглі атрымаць іх проста... ля ўваходу. (Тым часам ёсць ахвотнікі ці не паўмільёна адшкадаваць — як тут выказацца больш дыпламатычна? — за амартызацыю "фанеры" нібыта валютных зорак-гастралёраў).

Жывы гук — гэта значыць няма гарантыі, што музыкант не памыліцца і публіка не пачуе фальшывую інтанацыю.

Але жывы гук — гэта гарантыя таго, што музыкант шчыры перад публікай, нават у сваіх памылках. Даруюцца хібы тэхнічныя, калі ёсць нефальшывае пачуццё.

Таму й не шкадавала перапоўненая зала ні эмоцый, ні далоняў — святочна, цёпла было ўсім. Канцэртнаму аркестру эстраднай музыкі з маэстра Мікалаем Сталяровым ды Юрыем Адзінцовым, трамбаністам Юрыем Дзегцяровым ды саксафаністам Дзмітрыем Бандарэнкам (Гомель). Магілёўскаму "Імпульсу" з унікальным вібрафаністам (а такса-

"Полацк-аніма-квартэт".

ТЭАТР

Дыягназ — эгакласіцыст

Прэса ды крытыка паставілі Дзмітрыя ЛАЗОРКУ на чале ўкраінскага тэатральнага авангарду. Маладога — духам, жаданнем, запатрабаваннямі. Лазорку любіць знаны мэтр Мітніцкі, вывучыўшы яго перадусім на сваім курсе ў вядомай мастацкай установе імя Карпенкі-Карага. "Проста любіць", — удакладняе Дзмітрый. Гэта значыць, апякуецца і падтрымлівае як бацька, дазваляе ставіць усё. Пытанне ў тым, ці ж пытае Дзмітрый дазволу...

"Славянскія тэатральныя сустрэчы" ў сёлетнім траўні Дзмітрый Лазорка скалануў, задаўшы фестывалю... пытлю. Ягоны спектакль "Дзень кахання, дзень свабоды" паводле Клаўса так узняў планку прафесійных намаганняў й магчымасцяў спадароў рэжысёраў, што "...сустрэчы" забыліся і на славянства, і на сяброўскія міжсабоі ў кулуарах. "Гэты спектакль робіць гонар фестывалю", — недвухсэнсоўна мовіла Вольга Скорачкіна, вядомая дакладнасцю й трапнасцю сваіх ацэнак не толькі ў родным Санкт-Пецярбурзе. Наталля Ермакова, украінскі крытык, кіеўская "мамка" Дзмітрыя ў Маладым тэатры на Праразной, сёлета глядзела "Дзень кахання..." дзевятнаццаць разоў і кожны раз неверагодна перажывала: спектакль, паводле Дзмітрыя, патрапіў змяніць, перайначыць спадароў акцёраў, а потым ён, рэжысёр, адчуў, як мяняецца сам...

Гісторыя шараговага інцэсту была распаведзена рэжысёрам як гісторыя кахання. Якое не выбірае. Там, дзе тэкст з акцёрскіх вуснаў мог спляжыць атмасферу гэтага трывожнага і незразумелага кахання, акцёры пераходзілі на мову жэстаў, на мову пластыкі. Дзіўныя танцы таньчыліся на пляцовачцы, засыпанай спелымі яблыкамі; час-почас якійсь з пладоў трапляў пад жаночы абцас і пырскаў натуральным сокам. Мужчыны ў гэтым спектаклі кахалі, як апошні раз у жыцці. Далікатна напіналіся повязі паразумення (сямейнікі падсвядома трымаліся адзін пры адным — маці; бацька, які адбыў тэрмін за грэбаванне агульнапрынятай маральнай нормай, за парушэнне табу, якое стагоддзі чалавечай гісторыі толькі мацавалі; дачка, якая ў кожным новым каханку шукае бацьку). Водгулле старажытных трагедый дачувалася ў дыялогах персанажаў, ды так, што яны пераходзілі да сапраўднага гекзаметра (воляй адмыслоўцы-перакладчыка). Персанажаў не пераследаваў рок, не ратавалі багі з машын, не джгалі мсціўкі-эрыніі. Хапала кахання, якое жорстка выпрабоўвала людзей на трывушчасць. Вывярала супраціўленне матэрыялу. Круціла, біла, цвяліла, пляжыла, знішчала, давала выспятка, збівала на горкі яблык... Запад мужчынскіх чаравікаў патаптаныя яблыкі разляталіся брудам. "Гваздзікі" Піны Бауш ставалі эстэтычным рэхам "Дня кахання...". Каханне падымала на ногі спакутаваных людзей. Трывалае ўяўленне аб прыстойнасці не пазбаўляла забароненых пладоў смаку: напраў-

ма клавішнікам) Сяргеем Лазарэнкам. Аркестру Беларускага культурнага цэнтра Таварыства інвалідаў па зроку на чале з кампазітарам Сяргеем Багданавым. Салонна-студыйнаму "Эліт сінкапэйшнз" пад кіраўніцтвам Сяргея Браўдэ, дзе спрычыняецца да джазавай вакалізацыі мінская студэнтка Кацярына Кошалева. Аркестру эстраднай і сімфанічнай музыкі Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. Аркестру Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі. Ансамблю Анатоля Радзюкова з яго "новым пакаленнем"...

Зала горача вітала незнаёмы, свежы ветрык з беларуска-польскага памежжа — "Капрыз" гарадзенскіх студэнтак (мастацкі кіраўнік калектыву Раіса Левіна). Калісьці Гародня дала беларускай эстрадзе "Чараўніц". Цяпер вось прэзентавала сталіцы незвычайны аматарскі калектыў, які з інструментальнага квінтэта вырас за чатыры гады, можна сказаць, у аркестр. Аранжыроўкі для яго робіць сам Уладзімір Ткачэнка, знаны музыкант Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі. Творчыя стасункі з "Капрызам" мае сам Уладзімеж Корч, знакаміты польскі песеннік. Дый мастацтва гарадзенскіх дзяўчат больш ведаюць у Польшчы, дзе ім ужо не раз даводзілася выступаць, чым на радзіме. Мінчукі нават не чакалі, якім прыемным "капрызам" парадуюць іхні слых салісткі калектыву Алена Стэльмах ды Наталля Клімовіч: у абедзвюх — адметная вакальная прырода, прыемная манера выканання...

І калі ўжо казаць пра вакалістаў, дык трэба добрым словам падтрымаць "Полацканіма-квартэт". Педагогі музычнай школы з Наваполацка пад кіраўніцтвам Аляксандра Старасценкава, вядомыя хіба толькі слухачам радыё ды гасцям сёлетняга "Славянскага базара", з першых жа хвілін свайго выступлення зрабіліся ўлюбёнцамі публікі. "Самазаводная" спеўная чацвёрка (часам далучаўся і раяль) уразіла і заўзятым выкананнем джазавых стандартаў, і густоўным перастварэннем беларускага фальклору ("Там, каля млына").

У жанры вытанчанага інструментальнага джаза таксама былі адкрыцці. Зрэшты, у цесным асяроддзі мінскіх знаўцаў гэтага жанру ведаюць і цэняць "String jazz Trio and others" пад кіраўніцтвам Віктара Пынцікава. Ансамбль сапраўднага "джазавага дыхання". Музыканты-імправізатары ад Бога. Які пластычны і пяшчотны бывае кантрабас (Віктар Пынцікаў), колькі зротыкі тоіць у сабе голас кларнета (Алег Крылоў), якой бязмежнай свавольніцай робіцца скрыпка ў руках віртуоза (Аляксандр Цэйтлін)!

Сталымі канцэртнымі калектывамі паказалі сябе такія розныя музычныя суполкі, як аркестр Мінскага дзяржаўнага цырка (галоўны дырыжор Вячаслаў Сярдзюк), сталічная "Няміга" пад кіраўніцтвам Вячаслава Міхновіча, дыксіленд Віцебскага гарадскога цэнтра культуры (кіраўнік Валерый Лебедзеў) і джаз-група "Віцебск". І дыксіленд, у якім іграюць выкладчыкі Баранавіцкай ДМШ N 3 пад кіраўніцтвам Аляксандра Бондара, — дарэчы, дыксіленд, ганараваны званнем "народнага", чаго, паводле дасціпнай заўвагі вядучага канцэртаў, не спадобіўся нават ніводны ансамбль традыцыйнага амерыканскага джаза на сваёй радзіме!

На хвалі авацый прайшло і выступленне ансамбля традыцыйнага джаза "Рэнесанс". Ён адзначае сёлета 20-годдзе свайго творчага жыцця. І найлепшым падарункам да гэтай даты сталася наданне "Рэнесансу" статуса калектыву Беларускай дзяржаўнай філармоніі. На пачатку наступнага года плануецца яго выступленне ў славутай маскоўскай Зале імя Чайкоўскага, і таму мастацкі кіраўнік "Рэнесанса" Мікалай Лапцёнак абнавіў і творчы склад, і праграму, у якой побач з класічнымі блюзамі арганічна пачуваецца дасціпная апрацоўка тэмы "Чаму ж мне не пець".

Свята ў клубе імя Дзяржынскага завяршалася выступленнем Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі — сапраўднага музычна-фестывальнага цэнтра, адкуль зыходзяць творчыя імпульсы для многіх і многіх нашых музыкантаў, адданых жывому мастацтву. За дырыжорскім пультам гэтага сузор'я салістаў, імправізатараў, творцаў — мазстра Міхал Фінберг. Ён сам не піша песень і не займаецца аранжыроўкай джазавых тэм. Ён — стыліст-аранжыроўшчык складаных працэсаў у размаітым музычным жыцці. Ён — прыхільнік і абаронца жывога гуку...

С. БЕРАСЦЕНЬ

P. S. Вопыт першага Беларускага фестывалю эстрадных аркестраў паспрыяе правядзенню чарговых Міжнародных "Дзён джаза" ў Мінску (люты наступнага года) на яшчэ больш адмысловым узроўні. Першы, але ўдалы фестываль мусіць зрабіцца традыцыйным. Таму яго арганізатары, паміж іншых спраў, павінны знайсці для новай імпрэзы годны беларускі назоў. А заадно і дапамагчы тым, хто шукае адметны рэпертуарны і творчы кірунак у неабсяжным мастацтве джаза.

С. Б.

Фота Кастуся ДРОБАВА

Аркестр Мінскага дзяржаўнага цырка. Дырыжор Вячаслаў СЯРДЗЮК.

Гродзенскі "Капрыз" і ягоная салістка Алена СТЭЛЬМАХ.

ду, чалавеку выпадае жыць па-чалавечы і не па-чалавечы, дык як, паводле якіх правілаў пра яго меркаваць? А ўжо судзіць... Героі спадара Клаўса ў вырашэнні спадара Лазоркі толькі кахалі і дамагаліся толькі свабоды выяўлення гэтага кахання. Хоць на адзін дзень...

Вучобу ў Эдуарда Мітніцкага маладзён Лазорка скончыў у 1995 годзе. Паставіў тры спектаклі. Цяпер, калі гэтыя радкі друкуюцца, магчыма, ужо ўзіраюцца ў гледачоў героі чацвёртага спектакля. Беручы пад увагу тое, што ў мастацтве тэмы ды стыль — гэта лад жыцця творцы, высвятляю, які лад жыцця мусімець трыццацітрохгадовы рэжысёр. "Беспрытульны", — адказвае Дзмітрый, танклявы, празрысты, усмешлівы (немагчыма ўявіць, як ён працаваў у тэатры манціроўшчыкам, — даўно, яшчэ ў родным Запарожжы, яшчэ да вучобы ў Пецярбурзе ды Кіеве).

— Беспрытульны?

— Для мяне чалавек вызначаецца сваёй здольнасцю да любові. Або яна ў ім ёсць, або яе няма. Прыдумаць, уявіць, згуляць яе — немагчыма.

— Я заўважыла, што вы прыхільнік рызыкоўных тэм і вострых, напружаных сітуацый на сцэне...

— Я і праўда аддаю перавагу небяспечным, рызыкоўным тэмам. Люблю важдацца з жорсткімі тэкстамі, са ссунутымі, памежнымі, вострымі пачуццямі. Люблю іх адкрываць, даследаваць. Усё — прадмет мастацтва. Чалавек сам робіцца прадметам самых дзікунскіх, самых праклятых, небяспечных сітуацый; якім мусіць быць ягоны спосаб існавання ў іх? Як мусіць шукацца выйсце? Пражыванне я стараюся збудзіць і ў сабе, і ў сваіх акцёрах.

— Як бы не хацела я ў жыцці ніякіх памежных сітуацый, жахаў, — напраўду, лепш іх кампенсаваць на сцэне.

— І я аддаю перавагу тэрыторыі тэатра. У мяне ўжо пыталіся, маўляў, ці не займаюся я псіхалогіяй, ці не садыст я, ці не мазахіст, ці ўсё ў маёй сям'і як мае быць... Так, у мяне двойчы на сцэне з'яўляліся інцэсты, — сцэна, яна ж прыдатная і для вайны, і для гвалту, і для ўсіх жорсткасцяў свету. Лепшага месца не знойдзеш, каб разабрацца з самім сабой! Чым далей ад рэальнасці, чым большая адлегласць ад побыту, тым трапнейшы "дыягназ" выстаўляецца... Але з рэальнага жыцця зусім неабавязкова кожную вар'яцкую падрабязнасць цягнуць на сцэну.

...Салдат Войцак паводле драматурга, спадара Бюхнера, вяртаецца з акопаў першай сусветнай вайны. Спектакль "Войцак", прадстаўлены ў кастрычніку публіцы фестывалю "Белая вежа", ніяк не меў на мэце дэманстраваць якуюсь пэўную вайну і ейныя наступствы. Паводле рэжысёра, Войцаку застаецца зусім няшмат і... усё: не адбудаваць, не адрадзіць, не аднавіць, але зрабіць намаганне хоць як сабраць, зляпіць свет, бо трэба жыць. З нейкіх падабенстваў свяцільняў, нібыта сонца і нібыта поўні, Войцак (Віктар Легін) збірае сваю сістэму... сусвету: лепіць прадмет да прадмета, чалавека да чалавека. Жудлівыя персанажы — кудлатыя паненкі ды істэрычныя вайскоўцы — па-лялечнаму заводзяцца, рухаюцца, вымаўляюць словы ды прамовы. Самастойны і нават самадастатковы толькі Доктар (Станіслаў Боклан): ён быццам сілкуецца ад усіх, хто апынаецца побач. Доктар перапоўнены прагай доследу, так бы мовіць, апакаліпсісу пасля апакаліпсісу: роскіду, знішчэння рэштак жыцця пасля не-жыцця (вайны). Доктар нагадвае хатняга д'ябла. Але не Войцаку адыгрываць Богаву ролю: ягоны апошні свет распаўзецца, раскідаецца, толькі срэбнае месяцовае святло, арэчаўленае ў танюткай тканіне, сцягнецца чалавечаю рукою з-пад каласнікоў, надзьмецца, раскінецца, як рака, накрые парэшткі людзей ды рэчаў на сцэне...

...Між тым спектакль "Войцак" так і не прыняты мастацкай радай Маладога тэатра ў Кіеве. У тэатры, мовім так, спакойным, разважлівым, пэўным аж да шараговасці... Дзмітрый Лазорка са сваім беспрытульным існаваннем ледзь-ледзь уштукоўваецца ў ягоныя інтэр'еры. Летась у Маладым тэатры апынулася крытык Наталля Ермакова, — яна прыйшла не даваць парады, а працаваць. Патрэбныя Дзмітрыю людзі не паспелі з тэатра звольніцца. Для Ганны Расстальной, Мікалая Боклана, Алены Узлюк надышоў "Дзень кахання, дзень свабоды..." Яму ўслед рушыў "Войцак". "Але рэальны стан тэатра я не паважаю, — цягнуў сваё Дзмітрый, — шмат падстаў для недаверу мне ў самых дабрабытных чыннікаў трупы. "Войцак", паводле трупы, — правал. "Дзень кахання..." — блізкі да нецэнзурных выразаў. Я — чужаніца". Хіба сённяшняя работа Дзмітрыя ў Цэнтры Леся Курбаса дае магчымасць... марыць, што ён здолее і зможа арганізаваць свой тэатр, што ягоныя акцёры застануцца з ім.

— Дзмітрый, вы — чалавек украінскай культуры?

— Мае прадзеды паходзілі з Заходняй Украіны і цяпер я пэўна ведаю, што яны захапляліся тэатрам. Знайшоў фота 1905 года. Яны — у народных строях, іграюць Крапіўніцкага ў правінцыйным гарадку Гарадэнка (Іванава-Франкоўская вобласць). Тэатрык — напалову аматарскі, напалову прыватны...

— А як у вашым уяўленні побач з Бюхнерам, з Клаўсам, з Дастаеўскім суседзяцца ўкраінскія класікі?

— У мяне быў спектакль паводле "Карыфея" Крапіўніцкага, якім я добра ляснуў Кіеву... па галаве (за гэты спектакль Дзмітрый атрымаў шэраг "Пектараляў" — вышэйшых узнагарод Украінскага СТД. — **Ж. Л.**). Просталінейна любую нацыянальную класіку чытаць няможна, трэба звяртацца да ейнай існасці, да канфлікту, да дзеяння, закладзенага ў яе. А там, ва ўкраінскай нацыянальнай класіцы, масткі масціліся не толькі ў еўрапейскасць, — у самую антычнасць! Продкі былі куды больш далікатныя, тактоўныя. Так, яны бралі каснікі ды зрэбныя кашулі як знакі, як аздобы (!), бо ведалі канон, бо спавядалі традыцыю... Ёсць цяпер паняцце сучаснай гарадской мовы, — яна цікава развіваецца яшчэ і намаганнем групы маладых пісьменнікаў ("Бу-Ба-Бу", кшталту вашага беларускага "Бум-Бам-Літа": Ірванец, дарэчы, мой асабісты перакладчык, Андруховіч, Іздрык). Дык вось, менавіта яны робяць пераклады сусветнай класікі з патрэбамі сучаснага ўкраінскага. А перакладаць ім трэба нават з той украінскай мовы, якую ў свой час набліжалі да рускай. Скажам, дасканаліць і вывучаць пераклады класікі вядомых савецкіх часоў...

— Дзіма, вы так апантана адстойваеце свой тэатр; вы жывяце толькі ім?

— Для маіх акцёраў такая работа — не чарговы тэатральны раман, які яны перажылі, а нешта куды большае. Ермакова кажа, што я вельмі жорсткі ў сваіх прэтэнзіях да людзей, забіраю іх жыццё дарэшты ў тэатр, не пакідаючы прасторы, скажам, для сям'і... У мяне няма сям'і.

— А вы ўжо думалі, як прадставіце вашы творчыя намаганні сярод кірункаў, сярод тэатральных мадэляў?

— У Сашы Сакалянскага ёсць цудоўны тэрмін — "эгакласіцызм". Значыць — я і класіка. Там няма кірункаў, плыняў, школ. Ёсць асоба, якая з сябе вырабляе мадэль, асабістую, прыватную, інтымную. Умова — аддаць усяго сябе. Дарэшты. Гэта — Васільеў, Някрошус, іхнія тэатральныя мадэлі. Вялікая спакуса — змяніцца. Яшчэ большая спакуса — паспакойнічаць. Але трансфармаваць свет, або ствараць свой свет — гэта дар адметны. Ён вымагае слугавання.

З Дзмітрыем ЛАЗОРКАМ сустракалася, размаўляла, глядзела спектаклі Жана ЛАШКЕВІЧ

P. S. Дзмітрый Лазорка мае намер наведаць Мінск пры канцы сёлетняга года. Яго прыватныя дамовы ды сувязі маюць падставу ператварыцца ў дзелавыя.

Ж. Л.

На здымках: сцэна са спектакля "Войцак"; Дзмітрый Лазорка і Мікалай Яроменка.

Фота Эдуарда КАБЯКА

ЛіМ ЧАСАПІС

Родам са школы...

Таццяне ГАРЭЛІКАВАЙ — 50

Родам Таццяна Іванаўна з вёскі Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна. Пасля сканчэння мясцовай сярэдняй школы ў 1964 годзе паступіла на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Дыплом аб вышэйшай адукацыі атрымала завочна ў 1970 годзе — з 1968 года працавала бібліятэкарам у Мінску, а з 1972-га — старшай піянерважатай, арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы Трасцянецкай сярэдняй школы. У 1976 годзе Т. Гарэлікава была прызначана дырэктарам Ракуцевіцкай сярэдняй школы, у 1978-м — інспектарам Мінскага райана. З 1979 года працавала намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі, з 1980-га — сакратаром Мінскага райкома КПБ. З 1985 года з'яўлялася рэдактарам аддзела часопіса "Полымя".

Першае апавяданне Т. Гарэлікава надрукавала яшчэ школьніцай — у 1962 годзе ў газеце "Піянер Беларусі". Выступала ў рэспубліканскай перыёдыцы. Аўтар кніг прозы "Дзе лес шуміць" і "Пры святле расстанняў".

З поўднем веку, шаноўная Таццяна Іванаўна! Поспехаў Вам у жыцці і творчасці!

Юбілей сябра

У полі зроку вядомага рускага крытыка, літаратуразнаўцы, доктара філалагічных навук Анатоля Бачарова і беларуская літаратура. Пачынаючы з 1959 года, калі ён выступіў у перыядычным друку з першымі публікацыямі, Анатоль Георгіевіч асноўную ўвагу ўдзяляе тэме вайны ў літаратуры, што, у прыватнасці, засведчылі такія яго артыкулы, як "Логіка гісторыі і логіка мастацтва", "Праз прызму поліканфліктнасці", "Па законах нялёгкага веку", у якіх гаворка ідзе і пра творы беларускіх пісьменнікаў. У "Литературной газете" і часопісе "Дружба народов" А. Бачароў выступаў з рэцэнзіямі на кнігі І. Мележа, В. Быкава, А. Зарыцкага, Н. Пашкевіча, А. Бялевіча і іншых. Беларуская тэматыка гучыць і на старонках кніг А. Бачарова "Патрабавальная любоў. Канцэпцыя асобы ў сучаснай савецкай прозе", "Чалавек і вайна. Ідэі сацыялістычнага гуманізму ў пасляваеннай прозе аб вайне".

Анатолю Георгіевічу Бачарову споўнілася 75 гадоў.

Дзесяцігоддзе музея

Сотні каштоўных экспанатаў — унікальных ікон, першадрукаваных і пісаных ад рукі старадаўніх кніг, прадметаў побыту стараабрадцаў — выстаўлены ў Веткаўскім музеі народнай творчасці, якому спаўняецца дзесяць гадоў.

На здымку: ткацкі стан, на якім выраблялися славутыя неглюбскія ручнікі, аднавіў загадчык рэстаўрацыйнымі майстэрнямі Анатоль Чэмезаў.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА

Па роднай зямлі

У кнігу Віталя Вольскага "Падарожжа па краіне беларусаў", выпушчаную выдавецтвам "Юнацтва" ў серыі "Школьная бібліятэка" увайшлі яго творы, што знаёмяць з багатай гісторыяй нашай краіны. Апублікавана дакументальна-мастацкая аповесць "У лясах над Бярозай" і ўрывак з кнігі "Падарожжа па краіне беларусаў" пад назвай "Па дарогах Палесся". Дарэчы, гэтая кніга В. Вольскага ў нечым закранае аспекты, што пазней больш шырока прагучалі ў знакамітым нарысе "Зямля пад белымі крыламі" Уладзіміра Караткевіча.

ПАЭЗІЯ

Алесь ЛІСІЦКІ

"Светлых пачуццяў мальба"

●

Хто пра былое не згадваў,
згледзеўшы след сівізны?
Хіба ж забудзецца радасць
тое далёкай вясны?

Хто пра былое не згадваў,
ноччу не маючы сну?
Даўняй пяшчоты паглядаў
нашым вачам не вярнуць.

Хто пра былое не згадваў?..
Раптам пад сэрцам кальне:
Вам не даруецца здрада...
Што не даруецца — мне?

Хто пра былое не згадваў,
чуючы крык жураўля?..
Хай і пакрыўджаны, рад Вам
быў і заўжды буду я!

●

Што важна, а што і не важна
да самага суднага дня?
Цяпер разумею: мне Ваша
за ўсё даражэй цеплыня.

На холадзе рукі калелі,
я іх апякаў ля агню.
Але астудзіць не здалелі
гады Вашы рук цеплыню.

Далічвае век мой патроху
гады свае, месяцы, дні.
Хапае ўсяго мне, яй-богу,
найбольш — Вашых рук цеплыні.

Паплакаць — не проста ў адведкі —
ля свежай магілы маёй
Вы прыйдзеце, з рук Вашых кветкі
сагрэюць мой прах цеплынёй!

●

А можа, высніў вобраз Ваш
я на зары свайго юнацтва,
як прывід нейкі ці міраж?
Мне хіба ў ім расчаравацца?

Як нізка ластаўка ляціць...
О, вось і дождж ужо цярушыць.
Слязой маёю Вам свяціць,
а не расою
будуць ружы.

●

Пасцеле восень на Палессі
з лістоў кілімы
і травы.
І можа здарыцца, што дзесьці
мяне згадаеце зноў Вы.

Не знаю, хто — шпакі ці ластаўкі,
а можа, нават журавы,
Вам нагадаюць: быў я ласкавы,
і замаркоціцеся Вы.

І будзеце таемна пошты
чакаць і думаць, ці жывы
я, і дакараць сябе: "Навошта
ён не выходзіць з галавы?!"

●

З Вамі мне больш не сустрэцца.
Гэта — мой сум і журба.
Сэрцу хоць зрэдку сагрэцца
ў одуме толькі хіба.

Хай анідзе не кранецца
Здрада Вас альбо кляцьба.
Сэрцу хоць зрэдку сагрэцца
толькі ў мінулым хіба.

Лёс мой нялёгка снуецца —
позніца ўдачы сяўба.
Сэрцу хоць зрэдку сагрэцца
у прыпамінах хіба.

Песня, што сёння ліецца, —
светлых пачуццяў мальба.
Душам расстайным сустрэцца
зноўку на небе хіба!

г. Петрыкаў

ПОШТА

Час нашай ідэі надышоў

Газету "ЛіМ" чытаю даўно (цяпер атрымліваю яе дзякуючы Беларускай нацыянальнай бібліятэцы, за што ёй вельмі ўдзячны). Газета і ейны працавіты калектыў памагае мне разумець сутнасць цяперашняга крызісу беларускае культуры й мовы.

Акіян расейшчыны захлынуў усе плыні й галіны гаспадаркі, навукі, культуры, творчасці. Беларуская мова, калі ў абарону яе будуць выступаць, — як дагэтуль, — адно толькі асветчаннямі й дэкларацыямі, у недалёкай будучыні адыдзе ў нябыт.

Мяне зацікавілі артыкулы, змешчаныя ў газеце 29-га сёлетняга жніўня: "Захаванне мовы — сёння палітычнае пытанне" (інтэрв'ю з Вольгай Іпатавай) і "Трагедыйны звон па беларускай кнізе" ("круглы стол" у выдавецтве "Мастацкая літаратура").

Як жа і хто павінен бараніць дзяржаўную мову Рэспублікі Беларусь? Маецца на ўвазе практычнае дзеянне, штодзённае і дальнабачнае, дзе вымагаецца дысцыпліна, вытрываласць, планаванне і адвага, супрацьстаянне з тымі, што "харчуюцца" нянавісцю да беларускага нацыянальнага й культурнага адраджэння, гатовы адбудоўваць "імперыю зла", знішчыць незалежнасць Рэспублікі Беларусь ды аддаць яе ў вечнае ярмо тых, што прыйшлі й прыходзяць заўсёды "от лукавого".

Артыкул 17 Канстытуцыі, прынятай у 1994 годзе, гаворыць: "Дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь з'яўляецца беларуская мова. Рэспубліка Беларусь забяспечвае права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін". Значыць, трэба абараняць дзяржаўную мову, змагацца за яе выжыванне, практычнае штодзённае карыстанне ўсімі, у тым ліку й найперш — уладамі дзяржавы.

Як змагацца? Прыклад: вас за нешта абвінавацілі й пацягнулі ў суд. Ага! Небяспека для роднай мовы і вас асабіста. Ёсць жа нагода карыстацца дзяржаўнай мовай, прытым у такой высокай дзяржаўнай установе, як суд. Калі ён, суд, карыстаецца мовай "міжнацыянальных зносін", а вы жадаеце бараніць сваю родную-дзяржаўную, патрабуйце перакладчыка!

Гэта нялёгка! Гвалтаўнікі ўсіх вашых чалавечых правоў і ворагі беларушчыны, што прыйшлі "от лукавого" й адбудоўваюць "імперыю зла", зробяць усё, каб вас загнаць у патрэбную ім зону. Але ж — куды вам адступаць? І тут славутая беларуская талерантнасць вам адно пашкодзіць!

Прыгадваецца вядомая, не памятаю кім спачатку выказаная аксіёма: "Няма больш магутнай сілы, чым ідэя, час якой надышоў!"

Ідэя — абарона беларускай дзяржаўнай мовы ўва ўсіх галінах жыцця Беларускай Дзяржавы, яе незалежнасці, будучыні нашага шматпакутнага народа. Памажы нам, Божа!

Жадаю вам усім як найбольшых поспехаў у працы, змаганні й добрага здароўя!

Жыве Беларусь!

Кастусь АКУЛА

Таронта, Канада

ШРАМЫ НА СЭРЦЫ

(Працяг. Пачатак на стар. 8—9)

ВЫБАРЫ

Хоць і нямнога пацюкала на дрывотні сякерай, а знемаглася, аж у грудзях запякло, ледзь да ложка даклыпала.

Не паспела прылегчы — у сенцах затупалі, ляснулі клямкай.

— Дзень добры! Ці ёсць жывая душа ў хаце? — прагучаў на парозе мужчынскі бас.

— Ё, ё, — рыпнула спружынамі матраца. — Ты, Савачка?

— Абазналася, Захараўна. Я — заатэхнік. Войцік я.

— То праходзь, дзетка. Устану вось.

— Захварэла ніяк?

— Не, стамілася дужа.

Старая спаўзла далоў і выткнулася з-за шырмы.

— Дык вы не адзін! — заўважыла побач маладзенькую танклявую дзяўчыну.

— Настаўніца Людміла Кірылаўна са мной, — пасміхнуўся мажны Войцік.

— Мы — з выбарчага ўчастка, — паспяшалася абвясціць напарніца з чырвонай скрыначкай.

— Ці чула ты, цётка, пра рэферэндум? — той жа момант пацікавіўся Войцік.

— Пра каго, каго?

— Пра рэ-фе-рэн-дум.

— Здаецца, гаварыў нешта Савачка, але ў маё правае вуха ўляцела, а ў левае вылецела.

— Гэта, Захараўна, кампанія па волевыяўленні народных жаданняў. Зразумела?

— Адкуль мне ведаць? Газет я не выпісваю, бо дрэнна бачу, каб чытаць, тэлевізара не купіла пакуль, а радыё ўнь ад зімы захліпнулася, маўчыць. Прасіла манцёра Куксянка — падчапі дрот, дык не выкраіў часу Куксянок. Я ж бы яму бутэльку віна паставіла...

Перапыняючы гаспадыню, умяшалася Людміла Кірылаўна:

— Мы бюлетэнь вам прывезлі. Вы павінны адказаць на некалькі пытанняў.

— Не, не! — узмалілася бабка. — Даруйце! Іншая справа раней: аддаў голас — і будзь здаровенькі. А тутка... Збаўце!

— Дарэмна млееш, Захараўна, — паўшчуваў заатэхнік. — Зараз куды прасцей. Дэмакратыя зараз.

Людміла Кірылаўна зноў цярпліва ўзялася тлумачыць, суцяшаць:

— Паверце, нічога страшнага няма. Наце ручку і выкрасліце непрымальнае для вас. Мы адвернемся.

— Баюся... баюся! Крый Бог — не тое чырыкну! Падвучылі б.

— Не маем права, — пахітала кучаравай галавой дзяўчына. — Самі глядзіце.

— Невідушчая я... сляпая! — па запалых, пашрамаваных глыбокімі раўчукамі шчоках старой пакаціліся слёзы. — Зрабіце ўсё без мяне.

Войцік гульнуў жаўлакамі і, ці то апрыкрала слухаць енк, ці, пэўна, злітасцівіўся, выхапіў у настаўніцы храбусткую паперчыну.

— Ладна. Услужу табе, Захараўна, — схіліўся над сталом.

Праз хвіліну ён разагнуўся, склаў папалам лісток і саўгануў у вузкую шчыліну плоскай, з сургучнай пячаткай, скрыначкі.

— Цяпер спі спакойна.

— Дзякуй... дзякуй! — акрыяла старая.

— Эх, маці, маці! — развітваючыся, наяршыў Войцік бровы. — Вось і дабіся з такімі даброт нейкіх.

— А я, сынок, і не хачу іх, — памкнулася кабета праводзіць гасцей. — Нам бы толькі пенсію не затрымлівалі. Толькі б аўталаўка з хлебам прыязджала да нас, бо далёка шлындаць у Кругі, ды няхай бы калонку адрамантавалі, а то калодзеж забурыўся, дык ваду цягаем ад Піліпавага двара...

Бабка мецілася яшчэ штосьці сказаць, аднак Войцік зачыніў за сабою дзверы, і яна папярхнулася.

Ці не самае складанае ў выхаванні дзіцяці — раскрыць і зберагчы ягоную індывідуальнасць. У свой час я з прыкрасцю заўважыла, што тыя, каго вучылі пісаць па новых, не такіх, як у нас, разлічаных выключна на шарыкавыя ручкі, пропісях, нават у дарослым узросце рэдка набывалі свой адметны почырк. Думала, што вінаватыя ў тым занадта стандартызаваныя пропісі. Але ж не толькі, а можа, і не столькі яны... Вучаць пісаць не пропісі, а настаўнік. І вось трапілі да мяне дзве запіскі, якія напісалі зусім маладыя жанчыны, у свой час выпускніцы, а цяпер выкладчыцы таго самага Рэспубліканскага каледжа мастацтваў (адна выкладае музыку, другая вядзе малодшыя класы). Адкуль у іх такі прыгожы, не падобны на тое, як пішуць іхнія аднагодкі, почырк? Цікава, хто вучыў іх пісаць? І адна, і другая ў розныя гады вучыліся ў Людмілы Мікалаеўны ШАХАВАЙ, якая шмат гадоў была настаўніцай малодшых класаў, потым намеснікам дырэктара, цяпер вось стала дырэктарам Рэспубліканскага каледжа мастацтваў... І мне захацелася пагаварыць з ёю не столькі з нагоды юбілею адной з самых шаноўных у рэспубліцы навучальных устаноў, колькі дзеля таго, каб паспрабаваць зразумець, як можна і трэба выхоўваць у наш час асобу, ды не проста асобу, а талент.

Таямніца адметнага почырку

ГУТАРКА З ДЫРЭКТАРАМ РЭСПУБЛІКАНСКАГА КАЛЕДЖА МАСТАЦТВАЎ ЛЮДМІЛАЙ ШАХАВАЙ З НАГОДЫ 35-ГОДДЗЯ КАЛЕДЖА І НЕ ТОЛЬКІ...

— Шаноўная Людміла Мікалаеўна, дазвольце звярнуцца да вас не як да дырэктара, а як да вопытнага педагога. Вы столькі гадоў працуеце з адоранымі дзецьмі. Ёсць нешта, што яднае ўсіх выпускнікоў Рэспубліканскага каледжа мастацтваў (раней Рэспубліканскай школы-інтэрната, потым Беларускага ліцэя мастацтваў), цяпер вядомых далёка за межамі нашай краіны мастакоў Фелікса і Валерыя Янушкевічаў, Уладзіміра Савіча, Вольгу Дзёмкіну, Рыгора Сітніцу, музыкантаў Ігара Сацэвіча, Сяргея Асташонка, Вольгу Сідаровіч, Вадзіма Гацко. І гэта не толькі і не столькі высокі прафесіяналізм, але і, я б сказала, проста неабходная сёння ў мастацтве трываласць асобы. Хоць у наш стандартызаваны час вельмі няпроста не тое што зберагчы, але нават разгледзець індывідуальнасць...

— Перш-наперш трэба стварыць такія ўмовы, каб яна, гэтая індывідуальнасць сама магла выявіцца, раскрыцца. І тут у нашага каледжа ёсць цудоўныя традыцыі. Я часта задумваюся, што такое ўвогуле ёсць талент? Да нас прыходзяць дзеці з самых розных сем'яў, з глухіх вёсак і буйных гарадоў... Чаму Бог адарыў абсалютным слыхам ці здольнасцю гарманізаваць колеры менавіта гэтае дзіця? І як дапамагчы яму стаць асобай? Таленавітыя дзеці як правіла, вельмі ранімыя, узвышаныя натуры. Калі яны паступаюць да нас вучыцца, каледж робіцца іхнім другім домам. А настаўнікі, педагогі на час вучобы павінны замяніць ім бацькоў. Дзеці давяраюць нам, і мы мусім іх падтрымаць.

Да таленавітых дзяцей трэба ставіцца вельмі асцярожна. Ну што зробіш, калі будучы кампазітар не заўсёды на "выдатна" адказвае на ўроку матэматыкі... Зрэшты, мы нават спрабавалі ўвесці 10-бальную сістэму адзнакаў, каб не прыніжаць, а наадварот нейкім чынам узвышаць кожнага...

— Вы вельмі хораша сказалі на прэзентацыі адной з апошніх выстаў (пра яе згадаем у канцы): "Тут, у нашым каледжы паўсюль царуе дабрыня"...

— І творчасць...

— Гэта, напэўна, датычыць не толькі вучняў, але найперш педагогаў? Наколькі ведаю, практычна ўсе яны яркія індывідуальнасці, асобы...

— Мы набіраем выкладчыкаў на конкурснай аснове. Вельмі небяспечна ўзяць чалавека злоснага, які не любіць дзяцей, не валодае прафесійна сваім прадметам. Выдатна, калі да нас на працу прыходзяць нашыя былыя выпускнікі. Яны, як правіла, лепш разумеюць сваіх вучняў, умеюць працаваць творча. Нашы педагогі ведаюць, што павінны максімум даць на ўроку (вольнага часу ў нашых дзяцей вельмі мала — яны ці займаюцца музыкай, ці малююць). І каб не было перагрузак, выкладчыкі актыўна засвойваюць новыя тэхналогіі і методыкі. Практыкуюць і лекцыі, і дэльтапланы, і развіваючае навучанне. Што ж датычыць самастойнай працы, мы імкнёмся навучыць дзяцей, асабліва старшакласнікаў самастойна шукаць веды, і падыходзіць да гэтых пошукаў творча. Уводзім у расклад новыя прадметы, аўтарскія курсы — такія, як "Культура мовы", "Прыкладная эканоміка" і іншыя, шмат увагі надаём вывучэнню моваў. Як прыемна было прысутнічаць сёлета на выпускных экзаменах! Нашыя выпускнікі хораша гавораць і па-беларуску, і па-руску, і па-англійску... Мы з Нацыянальным інстытутам адукацыі распрацоўваем новую праграму навучання і выхавання таленавітых дзяцей.

— Ваша навучальная ўстанова ўяўляе сабою на сёння унікальную мадэль школы будучыні. Як гучыць яе новая поўная назва?

— Беларускі рэспубліканскі вучэбны комплекс гімназія-каледж мастацтваў. І кожнае слова нясе пэўны сэнс. У нас, сапраўды заўсёды вучыліся і вучацца дзеці з усёй рэспублікі. З малодшых класаў ідзе ўзмоцненая (гімназічная) моўная падрыхтоўка. Варта тут нагадаць, што ў музычныя класы мы набіраем дзяцей з 7 гадоў, а выяўленчаму мастацтву пачынаем вучыць толькі з пятага класа. А вось пасля дзевятага ўжо і музыканты, і мастакі здаюць экзамены. Пры станоўчых адзнаках яны працягваюць вучыцца ўжо не ў гімназіі, а ў каледжы. Цяпер ужо не бацькі, а дзеці, дакладней, падлеткі самі свядома вырашаюць, кім ім быць. Вось, напрыклад, вучыцца ў нас хлопчык, які выключна ведае хімію. Пасля дзевятага класа ён мусіць вырашыць для сябе, будзе ён хімікам альбо музыкантам. Тут варта сказаць, што каб ніякім чынам не парушыць правы дзіцяці, мы імкнёмся даць кожнаму усебаковую адукацыю, каб дзеці маглі паспрабаваць сябе ў розных галінах дзейнасці... У распрацоўцы новых праграм нам вельмі дапамагае не толькі Нацыянальны інстытут адукацыі, але і Міністэрства адукацыі. Разам мы можам ставіць перад сабою і вырашаць вельмі складаныя задачы.

На музычным аддзяленні з нашымі старшакласнікамі працуюць прафесары з Беларускай акадэміі музыкі, што дазваляе навучэнцам цвяроза ацэньваць свае здольнасці і магчымасці паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Прыходзяць да нас на прагляды і выкладчыкі Беларускай акадэміі мастацтваў. Мы імкнёмся даць сапраўдным талентам, так бы мовіць, зялёнае святло, каб да мінімуму зменшыць траўмы на ўступных экзаменах. Дарэчы, з сёлетніх 24 выпускнікоў (у нас сёлета выпускаліся толькі музыканты), усе 24 паступілі ў ВНУ (15 — у нашу Акадэмію музыкі, адзін паехаў вучыцца ў Маскву, адзін паступіў у Беларускую акадэмію мастацтваў на акцёрскае аддзяленне), астатнія цяпер вучацца ва Універсітэце культуры і педагагічным універсітэце...

— Такім чынам, дыферэнцыраванае навучанне дае свой плён... Пра гэта, калі не памыляюся, ішла гаворка і на І Рэспубліканскім з'ездзе настаўнікаў.

— Вопыт работы навучальных устаноў новага тыпу (ліцэяў, гімназій) пацвердзіў, што толькі дыферэнцыраваны падыход дае магчымасць не толькі даць дзецям добрую адукацыю, але і максімальна развіць здольнасці кожнага.

— Калі не сакрэт, а як вы адбіраеце дзяцей, здатных вучыцца на музычным ці мастацкім аддзяленні? На што перш за ўсё звяртаеце ўвагу?

— Калі праходзіць субяседаванне, камісія, у складзе якой самыя вопытныя педагогі, мусіць правесці знешнюю дыферэнцыяцыю. Мы павінны беспамылкова разгледзець закладзены прыродай талент і адчуць, што дзіця можа і хоча працаваць. Жыццё пацвердзіла: нават з абсалютным слыхам без штодзённае працы, без сілы волі можна застацца вельмі пасрэдным вучнем, а потым нават зусім страціць дар божы. І хоць мы набіраем дзяцей на конкурснай аснове, першыя месяцы навучання можна лічыць адаптацыйнымі.

За дзецьмі назіраюць не толькі настаўнікі, выхавацелі, але і псіхолаг, медыкі. У канцы адаптацыйнага перыяду праводзім кансіліум, разважаем, хто як развіваецца ў прапанаваных намі ўмовах. Конкурсным можна лічыць увесь першы год навучання. І тут зноў жа галоўнае не столькі здольнасці, колькі працалюбства. Мы выпускаем не толькі выдатных выканаўцаў, але і педагогаў. І галоўнае, імкнёмся выхаваць з кожнага чалавека, асобу.

— Наколькі я ведаю, не толькі ўрокі, але і так званае пазашкольнае жыццё ў каледжы арганізавана на сапраўды творчай аснове. Цікавыя канцэрты, конкурсы, праца гурткоў...

— Дарэчы, і тут у нас выпрацаваны сістэмны падыход. Напрыклад, праграма "Вытокі" ставіць на мэце вывучэнне гісторыі Бацькаўшчыны, знаёмства з музеямі, сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі. Нашыя вучні — жаданыя госці ў сталічных тэатрах, таму што ўсе абмеркаванні спектакляў, якія мы наладжваем, гэта не проста гаворка, а прафесійная гаворка пра рэжысуру, мастацкае афармленне, музыку, акцёрскае майстэрства. У нас ёсць свая тэатральная студыя, студыя бальнага танца, фальклорны калектыў. А што ўжо казаць пра сапраўды высокапрафесійныя хор, аркестр народных інструментаў, духавы аркестр! Іх ведаюць далёка за межамі нашай краіны.

— А калі да гэтага дадаць, што ў вас вучацца, бяруць удзел практычна ва ўсіх канцэртах такія выдатныя юныя выканаўцы, як флейтыстка Таня Кармазінава, піяністы Паўлік Кашчэва і лаўрэат Міжнародных конкурсаў Святлана Лагачова, якіх мне даводзілася чуць, ваш каледж можна лічыць своеасаблівым культурным, духоўным цэнтрам. Але паназіраўшы за працаю вашых выкладчыкаў, я цяпер ведаю, што за кожнаю новаю музычнаю ці мастацкаю "зоркай" — вялікая, тытанічная праца педагогаў...

— Кожны з якіх, нагадаем, асоба, талент. Дастаткова згадаць тут Таццяну Сергіеўскую, Наталлю Сярмяжку, Галіну Цітову, Валерыя Сароку, Таццяну Мазанаву, Кацярыну Цюрыну, Міхаіла Макаранку...

— І нягледзячы на тое, што і вучацца, і працуюць у вас неардынарныя асобы, вы нейкім чынам зберагаеце вельмі цёплую, чалавечую атмасферу. Гэта адчуваецца і па тым, як прымаеце вучняў-першагодак, і як праводзіце на пенсію педагогаў. Мяне, напрыклад, да слёз расчуліў вальс, які станцаваў на сцэне з адною з вашых выкладчыц на развітанне ваш былы дырэктар Анатоль Філіповіч... Скажыце, шаноўная Людміла Мікалаеўна, а каб у вас у каледжы быў музей, ля якога б экспаната вы спыніліся?

— Музея пакуль што яшчэ няма, але мы яго робім. Каб берагчы, шанаваць тое, што маеш сёння, трэба памятаць, што было некалькі гадоў, дзесяцігоддзяў таму назад, з чаго ўсё пачыналася... Мы сёння маем не толькі шмат унікальных фотаздымкаў, але і дзякуючы намесніку дырэктара па гаспадарчай частцы Пятру Стэльмаху відэазапісы апошніх выпускных вечароў. Так што ў музеі можна будзе спыняцца не толькі ля стэнаў, але і глядзець відэастужкі. Вучоба ў нашым каледжы будзе для ўсіх пачынацца з экскурсіі па музеі... Што ж датычыць экспанатаў, асабліва дарагіх для мяне, то... Справа ў тым, што, калі школа-інтэрнат для асабліва адораных дзяцей (а значыць і сённяшні наш каледж) толькі пачынаўся, у ім працавала мая мама — Лідзія Васільеўна Верамейчык. Я, можна лічыць, расла разам з інтэрнатам. Тут праходзіла я сваю педпрактыку... Добра памятаю і схіляю галаву перад педагогамі тых і крыху пазнейшых гадоў, нашымі ветэранамі — Валянцінай Васільеўнай Двурэчанскай, Людмілай Мікалаеўнай Кахновіч, Ядвігай Іосіфаўнай Арлоўскай, Ганнай Васільеўнай Бярозкінай... І яшчэ шмат каго пазнаю я на старых фотаздымках. Будзе ў экспазіцыі шмат фотаздымкаў маіх выпускнікоў. І тыя маладыя, юныя твары... Гэта ці не самыя дарагія, шчымлівыя мае ўспаміны... З самага пачатку, яшчэ з тых гадоў, калі інтэрнат размяшчаўся на Абутковай вуліцы, калі і там працавала мая мама, я засвоіла, што гэта не проста школа, а дом, дом цяпла, дабрыні, справядлівасці.. Раней дырэктар жыў тут, на тэрыторыі школы-інтэрната... Мне вельмі хочацца захаваць усе добрыя традыцыі, якія заклалі ў нашай навучальнай установе тыя, хто стаяў ля яе штурвала да мяне, — Марыя Масальская, Уладзімір Ратабыльскі, Анатоль Філіповіч... Мне хочацца, каб у нас было чыста, прыгожа, утульна, каб у нас і надалей панавала дабрыня... Вы не ўяўляеце, як гэта прыемна, калі вучні прыходзяць да цябе падзяліцца сваёй, хай сабе маленькаю радасцю, і як адказна, калі мусіш даць камусьці з іх сур'ёзную параду. Я радуюся, калі першакласнікі па дзесяць разоў на дзень пры сустрэчы кажуць "Добры дзень", калі прыбягаюць пахваліцца новаю забаўкай. Вось англічане пераслалі для адной з нашых вучаніц рэдкую скрыпку...

— Наколькі я ведаю, ваш педагагічны, а можа, і жыццёвы прынцып — вельмі элегантная, строгая дабрыня... А скажыце, Людміла Мікалаеўна, калі вы былі вучаніцай, баяліся свайго дырэктара школы?

— Ды не, не баялася... Я заканчвала 63 мінскую школу. І там у нас, у старэйшых класах была сапраўдная садружнасць настаўнікаў і вучняў. І сёння памятаю па імёнах амаль усіх сваіх настаўнікаў, памятаю, як мы ставілі спектаклі... Усё, усё памятаю...

— Што ж, застаецца пажадаць, каб сённяшнія вашыя вучні таксама шмат чаго добрага маглі ўспомніць пра родны каледж і пра сваіх выкладчыкаў! Поспеху вам і натхнення! І са святам! Трыццам пяць гадоў — самы росквіт.

Мне шмат даводзілася сустракацца з выпускнікамі Рэспубліканскага каледжа мастацтваў. І тыя з іх, хто ўжо сказаў сваё яркае слова ў мастацтве, і тыя, хто яшчэ шукае сябе, сапраўды ўспамінаюць пра гэтую навучальную ўстанову, як пра родны дом і многія з былых выпускнікоў нават прыводзяць сюды вучыцца сваіх дзяцей.

Сёння, напярэдадні свайго 35-годдзя Рэспубліканскі каледж мастацтваў правёў шмат цікавых канцэртаў і выстаў, ён стаў адным з членаў Дзіцяча-юнацкай творчай асацыяцыі. На прэзентацыю дакументальна-мастацкай выставы, прысвечанай 180-годдзю памяці Тадэвуша Касцюшкі (адна з першых акцый гэтай грамадскай арганізацыі) прыйшлі прадстаўнікі амаль усіх замежных дыпламатычных прадстаўніцтваў. Пачынаецца новая старонка жыцця сапраўды цудоўнай навучальнай установы.

Галіна БАГДАНАВА

На здымку: Л. Шахава.

На "Вольнай сцэне"... жывапіс і малюнак

У галерэі сучаснага мастацтва, што пры тэатры "Вольная сцэна" адкрылася экспазіцыя жывапісных і графічных твораў мастака Паўла Бурды пад назвай "Сцежкамі Дон Кіхота". Павел мае мастацкую адукацыю, але мастацтва не стала ягонай прафесіяй. Прынамсі, на хлеб ён зарабляе іншым заняткам. Аднак і назваць ягоную творчасць словам "хобі" было б няправільна. Жывапіс і малюнак — частка ягонай натуры, ягонай сутнасці. Так, ён мае прафесійную адукацыю, але па шэрагу прычын пазбаўлены некаторых "комплексаў", уласцівых прафесійнікам. Ён не баіцца памыліцца. Зрэшты, не баіцца і быць шчырым. Многае ў ягоных работах ідзе не ад канцэпцыі альбо тэмы, але ад інтуіцыі. Шмат выпадковага, шмат ад спантаннага, несістэмнага пошуку. Аднак пры гэтым ён і надзвычай дакладна трапляе ў колер, каларыт, вобраз.

П. ВАСІЛЕЎСКІ

Да ўсяго была справа

Міхась Дуброўскі належаў да пакалення, станаўленне якога прыпала на першыя дзесяцігоддзі нашага стагоддзя. Выхадзец з сялянскай сям'і з вёскі Казелле цяперашняга Краснапольскага раёна, ён з 1915 па 1916 год працаваў паштальёнам у Харкаве, адкуль быў прызваны ў армію. Прымаў удзел у рэвалюцыйных падзеях на Смаленшчыне і Клічаўшчыне, пазней служыў у Чырвонай Арміі. У 1925 годзе скончыў творчае аддзяленне Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута імя В. Брусава ў Маскве і быў накіраваны на працу ў Мінск, дзе быў навуковым супрацоўнікам літаратурнай камісіі Інбелкульта. З 1926 па 1945 год М. Дуброўскі жыў у Маскве. У 1941 годзе скончыў аспірантуру пры Маскоўскім інстытуце гісторыі, філасофіі і літаратуры імя М. Г. Чарнышэўскага. З 1945 года выкладаў у Брэсцкім настаўніцкім інстытуце, 1949—1950 гадах — у Літаратурным інстытуце імя М. Горкага ў Маскве, а затым, да 1957 года, быў выкладчыкам Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы.

Яшчэ ў 1918 годзе выступіў у перыядычным друку з першымі вершамі. Пісаў літаратурна-крытычныя артыкулы, п'есы. У 1926 годзе ў яго перакладзе на беларускую мову выйшла асобнай кнігай паэма О. Уайльда "Балада Рэдынгскай турмы". Разам з П. Шастаковым напісаў п'есу "Уласнай рукой", што была пастаўлена ў 1919 годзе, а потым надрукавана на старонках газеты "Гудок".

3 кастрычніка з дня нараджэння М. Дуброўскага споўнілася 100 гадоў (памёр Міхась Георгіевіч 11 верасня 1983 года).

У тэатры імя Мележа

Для юных мазырчан, папулярнасцю якіх паспеў заручыцца малады драматычны тэатр імя Івана Мележа, артысты рыхтуюць цэлую праграму да маючых адбыцца навагодніх святаў і зімовых канікулаў. У тэатральных версіях па матывах беларускіх казак будзе задзейнічана і актрыса Паліна Баранская.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА

Рука цягнулася паставіць пасля вынесенага ў загаловак слова клічнік, а то і два-тры, ды, як кажуць, колькі ні крычы "халва", ад таго саладзей у роце не стане. Тым не менш — ратуймася. І ніякае іншае слова ці спалучэнне слоў у якасці загалоўка не знаходзілася. Бо гаворка ніжэй пойдзе пра п'янства. Нават не пра звычнае (скаланіцеся, людзі: ШТО мы пазначаем нейтральным, зусім спакойным словам "звычнае"!) п'янства, а пра жахлівую, невылечную, поруч са СНІДам і ракам (ды не поруч, а паперадзе, бо куды больш масавую), хваробу — алкагалізм.

Божа літасцівы, што ты робіш з намі? Завошта, за якія грахі ты насылаеш на нас такія жахлівыя кары? Дзеля чаго ты даў нам, неразумным, зведаць смак яго і адчуць смяртэльную радасць яго ўздзеяння? Ці быў хоць кароткі час у нашай, чалавечай гісторыі на зямлі, калі віно (праз алкаголь) прыносіла людзям адно радасць? Пэўна ж, не было, Божа! А ў каго сёння, цяпер, зараз павернецца язык гаварыць пра радасць ад сустрэчы з ім? Лекавыя, жыватворныя якасці алкаголю даўно пабляклі пад яго абвальным, як няведаны ў свеце землятрус, забойчым, разбуральным, знішчальным уздзеяннем. Усё, што дзеецца ў свеце благога, пачварнага, гвалтоўнага, дзікага, разбойнага, крывавага, смяртэльнага, дзеецца не без яго дапамогі. Пад яго адурманьваючым уплывам.

Штодня з экранаў тэлевізараў, са старонак газет на нас абрыньваецца нястрымны паток паведамленняў пра жахлівыя аварыі, дзікунскія гвалтаўніцтвы, страшныя забойствы, лютыя пажары, не кажучы пра шматлікія крадзяжы, вулічныя бойкі, сямейныя сваркі. І амаль за кожнай з гэтых сумных падзей і здарэнняў стаіць п'янства, алкагольнае ачмурэнне. Яно — усюдыіснае. Бясшумным ціхім гадам яно распаўзлося па ўсіх нашых весях і местах, прашылася літаральна пад усе стрэхі, ва ўсе хаты, кватэры, жытлы людскія. Прашылася і бязлітасна джаліць кожнага, не выбіраючы, не шкадуючы анікога: ні мужчын, ні жанчын, ні дзяцей...

Ратуймася

НЕ ПЕРАСТУПІЦЬ МЯЖУ

Мы, людзі, дзіўныя ўсё ж стварэнні. Чамусьці не надта адгукаемся мы на заклікі "вазлюбіць бліжняга свайго" ці стаць іншаму чалавеку "другам, таварышам і братам". Мілей нашаму сэрцу чамусьці ціхае, падспуднае нашэптванне: "Не будзь дурнем, не слухайся, свая кашуля бліжэй да цела..." І ў выніку не заўсёды — ой, не заўсёды! — зважаем на чужую бяду. Сусед п'е, калега перабірае меру, знаёмы аддае даніну зялёнаму змію? Дык хто цяпер не п'е! Шкада, вядома, што гэтак аддана служаць Бахусу, але ж — выпіць сяды-тады чарку-другую і не грэх... І толькі тады, калі гора, бяда гэтая прыходзіць у нашу хату, у нашу сям'ю, — толькі тады мы спахопліваемся, скідаем з вачэй ружовыя акуляры і роспачна пачынаем шукаць паратунку. І роспач наша надта ж хутка ператвараецца ў адчай, калі раптам апякае нас жахлівае, пякельнае адкрыццё: паратунку якраз і няма, немач гэтая — невылечная...

З чым можна параўнаць алкагалізм? Хіба толькі з багнай, дрыгвой бяздоннай. Ды, зрэшты, і гэтае параўнанне не перадае ўсяго зместу трагедыі. У "чортавым воку", у балотнай пелі можа загінуць чалавек. Алкагольная ж пеля зацягвае ў сваю чорную ненажэрную пашчу не толькі, так бы мовіць, цела чалавека, а і ягоны розум, мары, надзеі, а ў дадатак яшчэ — і ягоную сям'ю, дзяцей, сяброў, ягоную работу, ягоны набытак за ўсе пражытыя да хваробы гады.

У побытавым разуменні мы не робім розніцы паміж п'яніцам і алкаголікам. Аказваецца, сведчаць спецыялісты, розніца ёсць. П'яніца яшчэ мае хоць нейкі маленечкі тыл для адступлення — каб ачомацца, адумацца, узяць сябе ў рукі, паспрабаваць з дапамогай родных, блізкіх, сяброў выбавіцца з праклятай залежнасці. У алкаголіка ж тылу няма, ён цалкам у кіпцюрах сваёй хваробы, лекаў ад якой, нагадаем яшчэ раз, чалавецтва пакуль што не знайшло. Дваццаці працэнтам аматараў узяць чарку пагражае гэтая цяжкая, каварная немач. Захварэць на яе можа кожны, у каго ёсць біялагічная схільнасць да гэтага, у каго хто-небудзь у родзе быў алкаголікам.

Алкагалізм — хвароба менавіта каварная. Бо мяжа, якая падзяляе п'янства і алкагалізм, надзвычай празрыстая. Чалавек не заўважае, як і калі ён пераступае цераз яе і назаўсёды ператвараецца ў алкаголіка, — назаўсёды! Гісторыя чалавецтва не ведае аніводнага выпадку, каб алкаголік змог бы выпіваць, як "нармальны" чалавек, "толькі па святах". Урачы, спецыялісты-наркалагі, псіхіятры бязлітасна канстатуюць: калі ўжо хто стаў алкаголікам, то гэта назаўсёды, на ўсё ягонае жыццё. У алкаголіка асаблівага выбару практычна няма: калі ён не перастане, не кіне піць, то хвароба прагрэсіруе і чалавек апыньваецца на сацыяльна-грамадскім дне, у турме (пачынае красці, забіваць, бо на выпіўку трэба грошы), у бальніцы і ў рэшце рэшт заўчасна памірае...

Пра ўсё гэта мы доўга гутарылі з Уладзімірам Уладзіміравічам **Івановым**, псіхатэрапеўтам. Ён у свой час скончыў Ленінградскую ваенна-медыцынскую акадэмію па спецыяльнасці псіхіятрыя. Ёю займаецца з 1971 года. Працаваў амаль на ўсіх пасадах гэтай галіны медыцыны — ад участковага ўрача да галоўнага псіхіятра Міністэрства аховы здароўя Беларусі. Вывучаў вопыт лячэння наркалагічна хворых у многіх краінах Еўропы, ЗША, з'яўляецца членам Міжнароднай федэрацыі псіхічнага здароўя людзей. Цяпер працуе ў Мінскім гарадскім наркалагічным дыспансеры.

Пачуўшы ад суразмоўніка пра гэты жорсткі дыягназ (хвароба невылечная, залежнасць ад алкаголю — назаўсёды), я ўсё ж пытаюся:

— Уладзімір Уладзіміравіч, аднак жа хворыя прыходзяць да вас з надзеяй вылечыцца?

— Надзея памірае апошняй...

— Тады спытаю інакш: вы ім дапамагаеце?

— Хочацца думаць. Прынамсі — намагаюся, стараюся дапамагчы.

— Наколькі эфектыўна, Уладзімір Уладзіміравіч?

— Эфектыўнасць любога роду ўмяшанняў у алкагольную хваробу прыкладна аднолькавая. Пра яе можна гаварыць толькі ў тым выпадку, калі ў хворага ўзнікла жаданне кінуць піць. А яно, гэтае жаданне, можа ўзнікнуць па самых розных прычынах. Скажам: пагроза разводу, страты сям'і, працы (усё яшчэ любімай), прабыванне ў медвыцвярэзніку, напад бандытаў-рабаўнікоў... Такое жаданне можа ўзнікнуць і пад уздзеяннем парад тэрапеўта, да якога хворы патрапіў, скажам, з гіпертанічным крызам. Альбо пад уплывам спецыялістаў — псіхіятраў, наркалагаў. Асабліва гэта тычыцца тых асоб, якія ідуць, рашаюцца на так званае "кадзіраванне" ці "падшыўку". Дарэчы, хачу адзначыць вось што. Калі хворыя маюць духоўную ўстаноўку на цвярозасць, то гэтыя працэдуры — "кадзіраванне" і "падшыўка" — уздзейнічаюць на іх гэтак жа станоўча, як, скажам, зварот да святара. Мы ведаем досыць шмат прыкладаў таго, калі рэлігійныя дзеячы ратавалі тысячы і тысячы алкаголікаў. Прыгадаем хоць бы Іаана Кранштацкага. Ну, а калі гаварыць аб прыярытэтах падыходаў і метадаў дапамогі алкаголікам, дык я вылучыў бы прыярытэты маральныя і эканамічныя, калі гэтак можна сказаць.

— Патлумачце, калі ласка.

— Тлумачэнне, на жаль, вельмі простае. Эканамічныя прыярытэты ў нашай дзяржаве, якую мы павінны лічыць нібыта цывілізаванай, але якая не мае дастаткова рэсурсаў, інакш кажучы, не з'яўляецца багатай, адступаюць на задні план. У выніку мы павінны, а больш правільна — вымушаны аддаваць перавагу прыярытэтам маральным, якія адпавядаюць народным, нацыянальным традыцыям і культурным стандартам і, натуральна, з'яўляюцца самымі таннымі. Што такое маральнасць у гэтым кантэксце? Я стаю на пазіцыях сацыяльнай медыцыны. Лічу, што медыцына павінна служыць народу, аказваць людзям дапамогу па магчымасці бясплатна, бо сёння нашы людзі практычна не здольныя аплачваць клопат аб сваім здароўі так, як некаму хацелася б. Па гэтай прычыне дзяржава не павінна настойваць на двайным падаткаабкладанні. Гэта тычыцца і наркадапамогі. У гэтым плане нам ёсць чаму павучыцца на Захадзе.

— А што на Захадзе?

— На Захадзе існуюць дзве мадэлі наркалагічнай дапамогі. Адна, менавіта заходнееўрапейская, заснавана на дамінаванні прафесіяналаў. У краінах Захаду існуюць спецыялізаваныя цэнтры, у якіх высокакваліфікаваныя псіхіятры, псіхолагі, сацыяльныя педагогі, выхавацелі, брыгады сярэдняга медперсаналу праводзяць рэабілітацыю, гэта значыць, вяртанне хворых на алкагалізм у грамадства, з якога яны самі сябе выкінулі. Гэтая мадэль каштуе вельмі дорага, і таму нават у самых багатых краінах такіх цэнтраў няшмат, карыстацца іх паслугамі могуць дазволіць сабе толькі вельмі заможныя кліенты. Другая мадэль — праграма Мінесота, якая нарадзілася ў Амерыцы прыкладна трыццаць гадоў назад. Яна заснавана на рознага роду групавой псіхатэрапіі і грунтуецца на вопыце і філасофіі Сусветнага таварыства "Ананімных алкаголікаў". Групы таварыства "АА" працуюць па праграме "12 крокаў і 12 традыцый". Амерыканцы, як людзі вельмі практычныя, усвядоміўшы, што алкагалізм — хвароба невылечная, што медыцына тут бяссільная (а ў Амерыцы каля 16 мільёнаў алкаголікаў!), зразумелі, што няма сэнсу ўкладваць сродкі ў безнадзейную справу. Там прыйшлі да высновы, што аказанне дапамогі хворым на алкагалізм могуць і павінны рабіць непрафесіяналы, энтузіясты, найперш самі алкаголікі. Дзеля нагляднасці нагадаю некаторыя лічбы. Кошт знаходжання наркалагічнага хворага на бальнічным ложку ў ЗША складае 300 долараў у суткі, а кошт лячэння па Мінесоцкай праграме — усяго 70 долараў. Менавіта па гэтай прычыне 70—80 працэнтаў наркалагічных устаноў працуюць там менавіта па Мінесоцкай праграме.

— Уладзімір Уладзіміравіч, вы згадалі пра таварыства "Ананімных алкаголікаў". Колькі гадоў назад я трошкі чула пра яго, аднак так і не ўцяміла, што гэта такое. Што крыецца за гэтымі таемнымі літарамі — "АА"?

— Анічога таемнага! Усяго толькі — ананімныя алкаголікі. Падтэксту — аніякага. У таварыства ўваходзяць менавіта былыя алкаголікі. Зрэшты, не былыя — былых алкаголікаў не бывае, пра што мы ўжо гаварылі. Члены груп "АА" — гэта людзі самага рознага ўзросту, рознай адукацыі, грамадскага і матэрыяльнага становішча, полу. Яднае іх толькі адно — іх агульная бяда: алкагалізм. Ананімныя ж яны таму, што не пытаюцца адзін у аднаго, хто яны і што, для іх дастаткова таго, што яны — алкаголікі. Многія члены таварыства пілі цягам доўгіх гадоў, пакуль не зразумелі, што не пад сілу ім адным змагацца са сваёю бядою. Некаторыя звярнуліся ў групы "АА" толькі тады, калі ўжо зусім апусціліся, страцілі сям'ю і работу, пачуццё ўласнай годнасці, пабывалі ў турмах. Паводзіны многіх з іх былі злачыннымі ў дачыненні да сям'і, да саміх сябе, да грамадства ў цэлым. Філасофія "АА" пабудавана на прызнанні чалавекам свайго поўнага бяссілля перад алкагалізмам. На прызнанні таго, што калі чалавек страціў кантроль над дозай выпітага, ён страціў яго назаўсёды. Другая пазіцыя, можа быць, найважнейшая — чалавек прымае адказнасць за свае паводзіны на сябе. Адказнасць жа гэтая пачынаецца з прызнання: "Я — алкаголік"...

ГУЛЬНЯ АЛКАГОЛІКА

Магчыма, пра гэта варта было б сказаць (ці паразважаць) раней, на пачатку гаворкі. Але тады падалося яно дробяззю. Але чым глыбей (і бліжэй) знаёмілася з праблемамі п'янства і алкагалізму, тым больш пераконвалася, што дробязей у гэтай хваробе няма, бо кожная з іх урэшце абарочваецца адной і той жа страшэннай бядой.

Аказваецца, што алкаголікі не проста

п'юць, — яны яшчэ і вядуць пры гэтым своеасаблівую і, часта, адмысловую гульню, у якую ўцягваюць бацькоў, жонку, дзяцей, сяброў, міліцыю і г. д. Яму мала таго, каб узяць ды выпіць. Яму, каб рэалізаваць гэтае сваё жаданне, патрэбен яшчэ і нейкі знешні штуршок. Яму патрэбна пэўнае ўзаемадачыненне са знешнім светам, бо ён усё ж не жывёліна, а чалавек. І ён правакуе, скажам, жонку на канфлікт, каб пакрыўдзіцца і тым самым знайсці прычыну для выпіўкі: маўляў, выпіў з гора, ад крыўды. Пасля ён знойдзе мазахістычную асалоду, калі яго ў стане алкагольнай дэпрэсіі ўшчуваюць, сварацца на яго. У выніку родныя і блізкія людзі валаводзяцца з алкаголікам вельмі працяглы час, шкадуючы яго, ашчаджаючы, аберагаючы, спадзеючыся на ўласныя ўгаворы-ўшчуванні і ягоныя шматразовыя абяцанні, дакараючы ў тым, што ён чарговы раз "сарваўся", не яго, а часта сябе ці іншых.

І самае горшае ў тым, што значная роля ў гэтай гульні належыць і афіцыйнай медыцыне, нашай саўковай, гэта значыць усё яшчэ савецкай наркалогіі. Урач, заведама ўсведамляючы сваё бяссілле, таксама ўключаецца ў гульню, выконвае ролю выратавальніка, праводзіць сеанс гіпнозу, выкарыстоўвае таблеткі "антабус", падшывае прэпарат "эспераль". Усё гэта не лекі, гэта ўсяго толькі сродкі запалохвання.

У залежнай ад алкаголю асобы, якая пад націскам родзічаў, ці і без націску, рашылася на тую самую "падшыўку", скажам, у

псіхіцы па-ранейшаму захавалася цяга да выпіўкі. Да таго часу, пакуль існуе рэальная ці ўнушаная пагроза жыццю (жыць усё ж хочацца!), алкаголік устрымліваецца ад чаркі. Але як толькі час гэтай пагрозы мінае, "падшыты" ці "закадзіраваны" алкаголік тут жа "адпрацоўвае", ці "навёрстае", так бы мовіць, страчанае.

Сёння амаль ва ўсіх сродках масавай інфармацыі з дня ў дзень публікуюцца адрасы самых розных ратоўчых цэнтраў для алкаголікаў, распісваюцца цудадзейныя магчымасці іх аступененых ці не аступененых супрацоўнікаў. І шматлікія людзі, зняможаныя ад бяссільнага змагання з няшчасцямі сваіх блізкіх, адгукаюцца на гэтыя аб'явы, запісваюцца на чаргу, плацяць немалыя грошы ў надзеі на тое, што, можа, нарэшце Бог прынясе ім літасць. Што на гэта сказаць? На вялікі жаль, час даў прастору і магчымасці для праяўлення людской прадпрымальнасці, у тым ліку і для тых, для каго, як кажуць, грошы не пахнуць...

Адрознасць, нават унікальнасць метадаў працы з хворымі ў групах таварыства "АА" ад усялякіх іншых заключаецца якраз у тым, што тут падобныя алкагалічныя гульні немагчымы, яны выключаюцца цалкам. Згаданая праграма "12 крокаў" заснавана, як ні дзіўна прагучыць у дачыненні да членаў таварыства, на сумленнасці, шчырасці чалавека перад самім сабой. Перадумова, першы крок да выратавання ў групах "АА" для кожнага — гэта шчыра сказаць самому сабе: "Я — алкаголік. Быў ім, ёсць і буду. І ніхто мне не дапаможа, акрамя самога сябе і такіх жа, як я". Тут, пры такім стаўленні да сваёй хваробы, — не да гульняў. Адмаўленне, адыход ад алкагалічных, сацыяльных і псіхасацыяльных, гульняў — гэта цудоўнае дасягненне Мінесоцкай праграмы. Скажам нават гэтак: іскрынка, "цымус" яе ў тым, што тут працуюць над сабой і з сабой... цвярозыя алкаголікі.

"Я ШЧАСЛІВЫ, ШТО Я АЛКАГОЛІК"

Пасля ўсяго гэтага я не магла не пазнаёміцца з гэтымі "АА". Пошукі прывялі на вуліцу В. Харужай, на чацвёрты паверх дома якраз насупраць Камароўскага рынку. Там, у адным з пакояў, месціцца, як цяпер гаворыцца, офіс гэтай арганізацыі ў Мінску. Офіс, ці, калі хочаце, штаб, мае назву: "Асветніцкая камісія па пытаннях алкагалічнай і наркатычнай залежнасці". Узначальвае яго Станіслаў Міхайлавіч **Каўроў**.

— Мэта нашай камісіі, — гаворыць сп. Каўроў, — аказаць рэальную дапамогу алкаголікам, бо алкагалізм — хвароба душы, найперш душы, а таксама і цела, і таму толькі праз духоўнасць, праз асвету можна змяніць жыццё чалавека. Мы рыхтуем тут спецыялістаў па праграме "12 крокаў", каб яны неслі яе далей, іншым няшчасным людзям. Мы цесна супрацоўнічаем з Міністэрствам аховы здароўя, з Міністэрствам адукацыі (бо дзеці пакутуюць ад алкагалізму бацькоў найбольш), з Міністэрствам унутраных спраў. Праграма "12 крокаў" працуе і прыносіць плён. Але, на жаль, грант, які мы ў свой час атрымалі ад Фонду Сораса, скончыўся, і сёння мы не маем сродкаў нават на тое, каб заплаціць за памяшканне. Я перакананы, што праграма вартая дзяржаўнай падтрымкі, аднак пакуль што я нідзе не знайшоў яе: ні ў згаданых вышэй міністэрствах, ні ў Мінгарвыканкаме, ні ў Адміністрацыі Прэзідэнта. Усюды падтрымліваюць на словах, даюць высокую ацэнку нашай рабоце, але дапамагчы не абяцаюць. Вельмі шкада, бо мы можам адкаціцца ў гэтай безумоўна карыснай рабоце на зыходныя пазіцыі і зноў пачынаць з нуля...

Не так даўно быў я ў Варшаве на семінары. Прывёз адтуль цікавую праграму, распрацаваную ў Міжнароднай арганізацыі працы, — "Прафілактыка алкагольнай залежнасці на рабочых месцах". Яна скіравана на тое, каб прафілактычна-выхаваўчая работа праводзілася непасрэдна на прадпрыемствах, на якіх працуюць алкаголікі. І гэта натуральна. Самы пітучы ўзрост — ад 18 да 60 гадоў, гэта якраз узрост працаздольнасці, людзі гэтыя праводзяць на рабочых месцах па 8—9 гадзін штодня. І калі навучыць усю кіруючую структуру прадпрыемстваў метадам гэтай прафілактычна-выхаваўчай работы, аддача будзе відавочная. На Захадзе такія праграмы даўно працуюць. А мы толькі-толькі пачынаем. Пачынаем з завода "Ударнік". Хочацца спадзявацца, што калі справа на "Ударніку" зрушыцца з месца, дык можна будзе з цягам часу разлічваць на спонсарскую дапамогу.

— Станіслаў Міхайлавіч, ці шмат груп "Ананімных алкаголікаў" у Мінску? Як яны ўзнікаюць і як працуюць?

— Людзі збіраюцца самі. Ніхто іх сілком туды не цягне. Іх прыводзіць адна бяда — алкагалізм. Яны там сустракаюцца з сябрамі па няшчасці, дзеляцца сваімі поспехамі і падзеннямі. Праграма "АА" дапамагае практычна ўсім, хто шчыра і сур'ёзна хоча, захацеў кінуць піць. Цвярозасць для іх — вышэй за ўсё. На сёння ў Мінску працуе 8 груп. Занатоўвайце: група "Надзея" (вул. Валгаградская, 63), "Першы крок" (Стаханаўская, 19), "Чаша жыцця" (Лермантава, 38), "Другое нараджэнне" (Каржанеўскага, 8, кв. 2), "Адраджэнне" (Маякоўскага, 162), "Сёмы дзень" (Перадавая, 11). Ёсць яшчэ дзве адметныя групы — адна для блізкіх і сяброў алкаголікаў і другая — для дзяцей ад 10 да 20 гадоў, бацькі ў якіх алкаголікі. Раю вам пазнаёміцца...

Пабыла я на сходзе (ці на вечарыне) у групе "Адраджэнне". У досыць прасторным пакоі сабралася чалавек пяцьдзесят. Кожнага, хто прыходзіў, сустракалі ветліва, прыязна. Вечарына пачалася хвілінай маўчання ў памяць тых, што загінулі ад алкаголю. А пасля... А пасля пачаліся людскія споведзі. Споведзі пра скарэжаныя лёсы, пра радасць вяртання да жыцця і пра надзеі дапамагчы сабе і іншым. Усё адбывалася да трымклівасці проста і... шчыра. Чалавек падымаўся, называў сваё імя (большага ніхто не вымагаў) і расказваў, як умеў, пра сябе. Адзіная ўмова для членства ў групе "АА" — жаданне кінуць піць.

Ва ўсім, што тычыцца алкаголю, яны стараліся быць максімальна шчырымі, сумленнымі. Яны ведаюць, што ў іх ёсць свабода выбару, і калі камусьці з іх захочацца раптам напіцца, ён можа гэта зрабіць, ніхто з прысутных у зале яму не забароніць, гэта залежыць толькі ад яго самога. Важна іншае: яны разумеюць, што яны — алкаголікі, што яны ніколі не змогуць выпіваць (ці ўжываць) пакрысе, час ад часу.

Паслухайце колькі іх споведзяў.

Алег: "Я шчалівы, што я алкаголік. Шчаслівы ад таго, што зразумеў гэта. Што мне не трэба больш хлусіць. Нікому. І ў першую чаргу самому сабе. У мяне цяпер два жыцці — да і пасля. "АА" далі мне новае жыццё. У тым, ранейшым, я страціў сям'ю, працу, кватэру, начаваў у падвалах, хацеў паквітацца з жыццём. Сёння ў мяне душэўная раўнавага, мой лёс — у маіх руках..."

Саша: "Я больш не мог біцца галавою аб сцены выцвярэзніка, не мог глядзець на доктара, які, акрамя падаўлення маёй волі, не мог мне даць нічога. Не мог больш чакаць спагады ад жонкі, нічога, акрамя пагрозы здаць у мянтоўку, — ад яе, адзінай і маёй жанчыны. Нічога не мог чакаць я больш і на працы, дзе быў на кручку і дзе мяне трывалі, пакуль быў на штосьці варты. Квінтэсенцыяй майго адчаю было жаданне знікнуць з твару зямлі. Здохнуць... Я сёння тут. Я не п'ю 2 гады. Я член сусветнага братэрства "АА". Калі я спатыкнуся, упасці мне не дадуць, мяне тут падтрымаюць, пададуць руку..."

Таццяна: "Я шчаслівая, што на свеце ёсць "АА". Гэта мая другая сям'я. Першую я страціла. Тут я набыла пачуццё ўпэўненасці, тут мяне разумеюць і прымаюць такой, якая я ёсць. Шчасце — гэта калі цябе разумеюць. Не ўсе грахі можна замаліць, але я стараюся. Я сёння сябе люблю, мне прыемна прачынацца і глядзець на сябе ў люстэрка. Раней жа з люстэрка на мяне глядзела незразумелае стварэнне, агіднае, азылае... Без "АА" я не выжыла б..."

Ларыса: "Я шаснаццаты дзень цвярозая. Я піла заўсёды, калі ў мяне былі грошы. Атрымлівала аліменты на дачку, якую зараз выхоўвае мая старэнькая мама, і калі адразу ж не куплю чаго-небудзь з ежы, назаўтра ў мяне не было ні капейкі. Некалі працавала інжынерам, цяпер прыбіраю ў пад'ездах. Але цяпер я набыла веру. Мне падабаецца, што тут мы не чытаем адно аднаму натацый, не раздаем бессэнсоўных парад, не выказваем непатрэбнага спачування. Нам падабаецца думаць разам. Я і вы, мае супакутнікі, разумеем адно аднаго. Я веру ў сябе..."

Вячаслаў: "Я піў з 14 да 44 гадоў. Усё жыццё было скіравана на тое, каб здабыць выпіўку, усе справы — добрыя і дрэнныя — адзначаў выпіўкай. Перад тым, як уліцца ў гэтую чыстую плынь, я праплыў па мутных вадакрутах, брудных лужынах і каналізацыйных сцёках. Маё жыццё не мела сярэдзіны, былі толькі ўзлёты і падзенні. Усе, здавалася, былі супраць мяне: і маці, і жонкі, якіх у мяне было ажно 4, я меў 10 "падшывак", мяне хапала ад 2-х гадоў да 3-х гадзін. Цяпер я не п'ю чатыры з паловай гады, мой жыццёвы прынцып: "Не вып'еш першую чарку — не будзеш п'яны". Я трымаюся яго заўсёды, у "АА" знаходжу падтрымку..."

Усіх я не магу працытаваць, хоць і хацелася б. Але выснова напрошваецца відавочная: галоўная мэта ўсіх членаў "АА"—весці цвярозы лад жыцця самім і дапамагаць тым, хто прыходзіць да іх з просьбай аб паратунку...

НЕ САМАЦЁК — КАНТРОЛЬ!

На завяршэнне гаворкі — яшчэ колькі высноў і назіранняў псіхатэрапеўта У. Іванова, чалавека ў вышэйшай ступені дасведчанага, аўтарытэтнага спецыяліста па праблемах выслабанення чалавека ад алкагольнай залежнасці. Вось што гаварыў Уладзімір Уладзіміравіч у час гутаркі са мною:

— Барацьба з алкаголем і алкагалізмам — праблема ўсё ж вырашальная. Толькі справа тут не ў медыкаментозных сродках, накшталт моднага сёння дорагакаштуючага інтэнсіўнага купіравання запойных станаў. Не выдам сакрэту, калі скажу, што зараз ёсць прыватныя медыцынскія брыгады, якія па начах ездзяць па выкліках алкаголікаў (новых беларусаў!), ставяць ім солевыя кропельніцы, нашпігоўваюць іх псіхатропным рэчывам, роднасным па сваім уздзеянні на чалавечы арганізм з алкаголем. І гэта багацценькім алкаголікам падабаецца. Вось вам яшчэ адзін элемент колішняй гульні алкаголікаў. Як у той рэкламе: **новы** элемент! Ён п'е, атрымлівае ад гэтага задавальненне, потым не хварэе на пахмелле, не пакутуе, не шукае агурэчнага расолу, а за вялікія грошы выклікае доктара і "лечыцца". Яшчэ, бывае, і бюлетэнь на тры дні атрымае. І толькі тады, калі пляснецца на самае дно, — толькі тады ён, можа, задумаецца ці адумаецца. Ды — позна! Частка з іх гіне па-дурному ў бойках і аварыях, частка накладае на сябе рукі (узровень суіцыдальных паводзін у алкаголікаў у дзесяткі разоў вышэйшы, чым у нармальных людзей), частка памрэ ад унутраных хвароб — хвароб сэрца і цырозу печані, нехта звернецца ў групы "АА".

Справа, паўтару, не ў леках і кропельніцах. Мы ведаем, што бессэнсоўна ўкладваць дзяржаўныя рэсурсы ў прамыванне крывяносных сасудаў алкаголіка. Рэсурсы трэба ўкладваць у прафілактычныя мерапрыемствы, у добрыя, спагадлівыя тэрапеўтычныя праграмы, якія скіраваны на разбурэнне стэрэатыпу алкагольнага мыслення, на разбурэнне алкагольных гульняў. Гэтая прафілактыка павінна весціся на вытворчасці, у навучальных установах, у тым ліку ў школах і ПТВ. Укладваючы грошы ў прафілактыку, мы атрымаем куды большую аддачу, чым калі б укладвалі іх у інтэнсіўную тэрапію.

Варта таксама сур'ёзна задумацца над праблемамі вытворчасці і рэалізацыі алкагольных напояў. Еўропа, напрыклад, ужо некалькі гадоў запар ажыццяўляе праграму па зніжэнні вытворчасці і спажывання алкаголю. Тое ж назіраецца і ў ЗША. Там за апошнія 10 гадоў вытворчасць п'янкіх напояў значна скарацілася, а вось выпуск мінеральнай вады — падвоіўся, а 75 працэнтаў напояў, якія ЗША імпартуе з Францыі, скажам, з'яўляюцца безалкагольнымі.

Мы павінны памятаць, што алкаголікі складаюць у нас недзе 6 працэнтаў насельніцтва. З нашых 10 мільёнаў — гэта 600 тысяч чалавек. Гэта больш, чым насельніцтва любога нашага абласнога цэнтра. А калі адкінуць дзяцей, хворых, старых, цяжарных жанчын і тых, хто зусім не ўжывае спіртнога? Што мы ў такім разе будзем мець? Ды не будзем мець, а — маем. Маем кожнага пятага дарослага працаздольнага чалавека — алкаголіка.

Прыгадаем час, калі Гарбачоў з Лігачовым увялі ў былым СССР антыалкагольны закон і калі ў выніку яго ажыццяўлення спажыванне алкагольных напояў досыць прыкметна знізілася. І што назіралі неўзабаве? Ужо недзе праз год, у 1987—88 гадах, у 4 разы знізілася колькасць захворванняў на алкагольныя псіхозы і ў 2 разы — смяротнасць ад алкагольных атручванняў. Нагадаю яшчэ дзве лічбы. У 1984 годзе было зафіксавана ў Беларусі 1500 выпадкаў алкагольнага псіхозу, а праз чатыры гады, у 1988 годзе, калі дзейнічаў антыалкагольны закон, — усяго 400 выпадкаў. Сёння, калі ў нас зноў набрала тэмпы алкагольная вытворчасць, гэтая статыстыка зноў вярнулася да ўзроўню 1984 года і нават перавысіла яго.

Я не за сухі закон, але я ўсё ж хачу заняць аб'ектыўную пазіцыю і сказаць, што дзяржава можа і павінна ўплываць на гэтыя працэсы і не дапусціць татальнай дэградацыі нацыі. Урэшце — будзем глядзець праўдзе ў вочы — народа нашага. Сёння ж усялякі кантроль, калі зноў жа рэзаць праўду-матку, страчаны, спіртное можна купіць у любы час дня і ночы, ды і кошт яго параўнаўча танны ў агульнай харчовай карзіне. Прынамсі, пляшка гарэлкі каштуе танней, чым кілаграм мяса.

— Трэба думаць пра будучыню, — сказаў на завяршэнне мой суразмоўнік, — пра тое, як будуць жыць нашы дзеці і ўнукі. Хоць бы праз нейкіх дзесяць гадоў, у самым пачатку новага тысячагоддзя. Будзем спадзявацца, што наш урад распрацуе дзяржаўную праграму па пераадоленні алкагалізму, якая будзе працаваць многія гады. І толькі тады мы адчуем рэальныя вынікі. А грошы знайсці можна. Тыя, хто выпускае алкаголь, павінен адлічваць пэўныя працэнты на гэтую выратавальную праграму. Таму праграма барацьбы з алкагалізмам павінна быць разумнай, прадуманай і доўгатэрміновай.

Мне застаецца адно толькі падпісацца пад словамі Уладзіміра Уладзіміравіча.

Марыя МІХАЙЛАВА

ГАСЦЁЎНЯ

Падштурхнула мяне пайсці ў Дом друку на Б. Хмяльніцкага і сустрэцца там з Таісай Мікалаеўнай Бондар адно яе выказванне. Вось яно: "Канешне, каб мяне як галоўнага рэдактара часопіса трывожыла толькі нежаданне часткі беларускіх літаратараў падтрымліваць часопіс, супрацоўнічаць з ім, я не звярталася б да грамадскасці і праз яе — да кіраўніцтва рэспублікі. Але пастаянны (а ён пачаўся адразу ж пасля выхаду першага нумара часопіса) ціск апазіцыі, на жаль, стаў уплываць на арганізацыі, якія заснавалі часопіс, што не можа не выклікаць горычы і недаўмення". ("СБ", 26.08.97. N 161). Другое выказванне пісьменніцы прыгадалася, калі я ўжо пакідала Дом друку: "Чалавек — тое, на што мы асуджаны..." (З аповесці "Лісты наўздагон").

Таіса БОНДАР: "Літаратура і палітыка — розныя рэчы..."

— Таіса Мікалаеўна, дык у якім жа становішчы знаходзіцца зараз часопіс "Всемирная литература"?

— Мы жывём, хаця пагроза прыпынення фінансавання часопіса ў наступным годзе існуе. Засмучае, што беларускія літаратары амаль усе дружна выступілі супраць нашага выдання, — хутчэй, супраць таго, што ён выдаецца на рускай мове! Але ж паглядзіце самі: раней беларускіх пісьменнікаў выдавалі ў Маскве, і праз рускую мову яны ішлі ў свет... Цяпер жа нічога таго няма!.. Можа, вы не паверыце, але нават у Прыбалтыцы такія часопісы ёсць!.. Усё ж такі мы не губляем марна часу, і хочам расчысціць для нашай літаратуры выхад паза межы краіны. "Всемирная литература" на наступны год аб'явіла падпіску ў Расіі, 4 лістапада ў Маскве адбылася прэзентацыя нашага часопіса (дарэчы, у "Литгазете" ён быў ужо прадстаўлены расійскаму чытачу)... І як можна не скарыстаць такую магчымасць (якой раней бы ганарыліся!) і адмаўляцца супрацоўнічаць з намі?! Наша выданне толькі-толькі пачынае набываць свой твар, не ўсё яшчэ добра, безумоўна, праблем хапае. І мая роля, як рэдактара, — зрабіць усё магчымае, каб часопіс стаў асяродкам культуры, асяродкам духоўнасці. Вакол яго ўжо пачалі збірацца людзі духоўна арыентаваныя: прафесура, моладзь, што абараняе дысертацыі па замежнай літаратуры... А якія цікавыя аўтары з'яўляюцца ў рэдакцыі! І ўсё ж, безумоўна, наша першасная задача — барацьба за падпіску ды пошукі спонсараў...

— Таіса Мікалаеўна, а што ж тады — патрыятызм? Ці гэта ўжо зусім састарэлае паняцце?

— Патрыятызм для мяне — гатоўнасць аддаць сваю працу, свой талент дзяржаве. Не ўвесь жа ён у тым, каб бегаць з лозунгамі. Мне і ў благім сне не прысніцца абразіць свой народ, сказаць, што ён, яго мысленне не адпавядае моманту або палітычнай ідэі: народ такі, які ён ёсць... Пазняка нельга прыняць адно за зварот да народа: ты быдла, бо не размаўляеш па-беларуску. Дзякаваць Богу, мне б і ў галаву не прыйшло (ведаючы гісторыю беларусаў) абвінаваціць іх за гэту гісторыю. Лічу, што самасвядомасць можа мець толькі чалавек духоўна арыентаваны. І нельга ж не прызнаць, што для таго, каб паспрыяць росту самасвядомасці людзей, з імі трэба гаварыць. Прытым на той мове, якую яны разумеюць. Трэба паступова — усім жыццём сваім, усёй творчасцю — даводзіць, што беларуская мова — самая прыгожая ў свеце. Па-добраму, з любоўю...

— Нядаўна ў адной з газет вы пісалі пра "своеасаблівы магніт устойлівасці" беларусаў, іх жаданне міру "з усімі, нават з ворагамі гэтага міру". І далей: "І зусім не з-за "рабскай псіхалогіі", якую прыпісвае свайму народу нацыянал-радыкальная частка інтэлігенцыі! У глыбіні народнай душы, на ўзроўні геннай памяці захоўваецца код яго шляху, яго місіі". А ці не здаецца вам, што апошнім часам толькі так званая нацыянал-радыкальная частка інтэлігенцыі свядома і захоўвае гэты код?

— А чаму мы ўвесь час, гаворачы пра народ, маем на ўвазе насельнікаў Мінска? Чаму мы лічым, што мова без інтэлігенцыі памрэ? Нават пры самай шалёнай русіфікацыі беларусы захоўвалі і захавалі сваю мову. Я неаднойчы казала і яшчэ раз паўтару: нельга інтэлігенцыі лічыць сябе вышэй за народ! А трэба больш з моладдзю працаваць — дзеля будучыні нацыі! І з творчай моладдзю — у першую чаргу. Але ж і не ў надта далёкія часы такая праца вялася рэдка, а сёння ўвогуле не вядзецца...

— Дарэчы, вы ўваходзілі ў літаратуру ў так званыя "застойныя" часы...

— Так. Кожны чалавек жыве ў пэўным асяроддзі, у пэўным часе. У адрозненне ад "шасцідзесятнікаў", якіх лёгка было абвінаваціць у "двурушніцтве", у пагоні за славай любою цаной, наша пакаленне было ў літаратуры больш шчырым. Гэта лёгка праверыць, як кажуць, па тэкстах. Сённяшнія вялікія апазіцыянеры ад літаратуры заўсёды бачылі ў ёй толькі сябе: увесь час узнікала ўражанне, што думаюць адно, а пішуць зусім іншае... Сярод тых, каму яны так і не саступілі дарогу, якраз і з'явіліся літаратары, што пісалі пра шчырыя чалавечыя адносіны. Здаецца, і не сакрэт ні для каго: кожны чалавек можа пісаць толькі тое, што ў ягонай душы. І не важна, у якім пакаленні. А калі ўжо чалавек падладжваецца пад нейкі час... — і не важна — пад сацрэалізм, як раней, ці пад тую дэмакратыю, якой няма... У паэзіі можна застацца толькі ўлічваючы яе законы — ідучы ад эмоцый, на якія багатыя ў маладосці, да філасофскіх разваг — ужо сталым паэтам. Менавіта такі шлях прайшлі Куляшоў, Танк... Калі ж, будучы сталым паэтам, не задумваешся над вечнымі пытаннямі Светабудовы, трэба пісаць нешта іншае... Чытача ж не падманеш! І наша пакаленне ў гэтым больш чэснае, бо мы паэзію не эксплуатавалі, робячы яе служкаю сваёй славы. І хіба не дзіўны той факт, што пасля Максіма Танка не прыгадаць ніводнага (!) выступлення ў друку, у якім хто-небудзь назваў бы хоць адно прозвішча таленавітага маладога літаратара?!

— Дарэчы, пра пераемнасць пакаленняў... Скажыце, як вы адносіцеся да выказвання, што сапраўдная беларуская літаратура пачынаецца толькі сёння?

— Так кожнае пакаленне лічыла! Гэта нармальна. Маладыя толькі так і могуць увайсці ў літаратуру. Праз дзесяць гадоў яны ўжо так гаварыць не будуць. І самая галоўная парада маладым — не даць сябе зламаць! Бо колькі яшчэ давядзецца прайсці ўсяго ў жыцці — спакусаў шмат! Цяпер я разумею сталых пісьменнікаў, якія выбіралі адзіноцтва... У маладых усё гэта яшчэ наперадзе, і, дай Бог, каб яны вытрывалі.

— Таіса Мікалаеўна, у 94-м вы неяк сказалі: "Калі што па-сапраўднаму засмучае сёння, то адсутнасць віны, агульная адсутнасць віны..."

— Усё гэта вельмі добра выкладзена ў маім рамане "Ахвяры", рамане, на старонках якога сустракаюцца розныя пакаленні. Сёння ўсё тое, што было ўчора, адмаўляецца — і адмаўляецца адназначна. Па сутнасці ж, усе мы — ахвяры. Толькі — як можна проста перакрэсліць час, падабаецца ён альбо не? Нельга ні адну віну ў жыцці спісаць на некага. Чалавек, хоча ён таго ці не, звязаны з часам, з гісторыяй народа... Калі не — дык ён ужо, канешне, не творца. Кажуць жа, што пісьменнік — гэта інструмент Бога, і нічога ён не можа без натхнення, без памкнення прыслухацца да лепшага ў сабе. Таму якім жыццём ты жывеш, пра тое можаш і пісаць.

— Таіса Мікалаеўна, эпіграфам да аповесці "Жывыя жывуць" вы ўзялі словы Луі Арагона: "Не шукайце біяграфій у біяграфіях. Гэта... толькі рамы, шыўкі, заўсёды гатовыя разысціся, рубцы, якія ныюць у навальніцу, болі, асуджаныя якім-небудзь чортавым дожджыкам, з хмарамі на небе... Ад таго, што адчуваеш, нікуды не ўцячэш". Якое самае моцнае адчуванне вы згадваеце са сваёй біяграфіі?

— Самае моцнае адчуванне, якое жыло ўва мне з дзяцінства, — адчуванне таго, што ў мяне ёсць свой шлях, і яго я павінна знайсці і прайсці да канца. У чым толькі я сябе ні спрабавала!.. І не дзіўна. Самае складанае ў жыцці, як сёння разумею, — знайсці сваё месца на зямлі. Для мяне і адчуванне Бога — гэта адчуванне сваёй місіі на зямлі, гэта тая іскра, якая разгараецца ў душы...

— Раскажыце пра сваю сям'ю.

— Мужа я страціла 5 гадоў таму. У мяне ёсць адзін сын. У яго свая сям'я, жывём мы асобна. Але самае галоўнае, што ён — з тых людзей, якія задумваюцца над жыццём, спрабуюць узважваць свае крокі...

— І апошняе пытанне. Пытанне з разраду палітычных, бо ад гэтага нікуды не дзенешся. Славамір Адамовіч (а ён хоча ўступіць у Саюз пісьменнікаў)...

— А як жа!

— ...у інтэрв'ю газеце "Свободные новости" кінуў у ваш адрас такія словы: "...Мала прыемнага ў суседстве пад дахам саюза з Тасяй Бондар. У той час, як група пісьменнікаў пікетуе Дом літаратара, які спрабуюць перадаць у ведамства Ціцянкова, Бондар выступае ў "Советской Белоруссии": з беларускай культурай усё ў парадку, са школамі, ліцэем праблем таксама няма, ніхто нікога не цісне". Як пракаментуеце гэтыя словы?

— А што тут каментаваць! Па-першае, гэтых слоў я не пісала, у "СБ" я проста спрабавала абараніць часопіс, патрэбны не мне асабіста, а рэспубліцы. Па-другое, я ведаю цану Адамовічу і яго словам. Для таго ж, каб стаць са мной побач, яму трэба трошкі падрасці. Літаратура і палітыка — розныя рэчы, але і ў літаратуры, і ў палітыцы кожны выбірае сваю кропку адліку і бярэ на сябе сваю ношку адказнасці.

Інтэрв'ю ўзяла Раіса МШАР

Марцін КОЎЗКІ

Доля праўды

Атэізм перамагае, каб шчыра верылі ў Бога, столькі мату не было б у размовах.

●

Няясна, якія прызрыстыя? Пакуль што чыстыя. Што з імі робіцца? Скажам, калі ўробяцца. Такія цяпер падапечныя — не праглядваюцца, не прасвечваюцца. Абазначацца, аднак, безумоўна — прагаворваюцца праслухоўваемыя.

●

Да выхаду кнігі Грымэльсгаўзена ў перакладзе Сёмухі. З нараджэннем, Сімпліцысімус, крэўны Несцеркі і Швейка. Дзякуй Богу, смехалісімусаў разрастаецца сямейка. Сын сялянскі па паходжанні, колькі вымудраў за ім. Мо і Сёмухава прозвішча нейкім чынам... псеўданім? Мо і гэта транспазіцыя таго самага Сімпліцыя?

●

— Ападкі, ападкі, ападкі абрынуліся на саўгас. А яшчэ ўчора сталіца гарантавала надвор'е. — Замаўчы, няшчасны, у гэты трывожны час лепш верыць сталіцы, чым надвор'ю.

●

Не забываецца "феномен Кашпіроўскага". Усіх дурыць вось так па-мастакоўску, тут трэба быць ці злодзеем ці геніем, дакладней, можа, геніем зладзейства, так разгарнуць такое тледзейства!.. А мо ўсё ад нашае натуры, што час ад часу нам патрэбны "гуру". І ардынарны ўрач з Днепрапятроўшчыны хіба апошні з мастакоў шальмоўства?

●

— Дзед, на сонцы ёсць плямы, а на плямах ці ёсць сонца? — Малышок, бачыш вунь той плявок, дык у ім на донцы — сонца. Плямы з сонцам не цырымоняцца, вось і яно неяк бароніцца. І так бясконца — то плямы адольваюць, то сонца.

●

"Палутарку" прыдумаў нехта лоўка, разумная варыла галава. Усё тая ж васемнаццаціметроўка, адзін пакой, а калі хочаш — два. Калега запрасіў мяне на гутарку ў сваю бакоўку пры сваёй палутарцы.

●

Рэклама перадач. Усё на тэлебачанні — рэклама, рэклама ўскосна і рэклама прама. А самая адкрытая рэклама ў перадачах "Рэзананс" і "Панарама". Уключыцеся і ацаніце самі: які ў "Панарамы" рэзананс і якая ў "Рэзанансе" панарама.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЛіМ ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЗАСНАВАЛЬНІКІ

Саюз беларускіх пісьменнікаў; рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Галоўны рэдактар Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Мікола ГІЛЬ — *намеснік галоўнага рэдактара*
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ,
Жана ЛАШКЕВІЧ,
Алесь МАРЦІНОВІЧ,
Барыс ПЯТРОВІЧ — *першы намеснік галоўнага рэдактара,*
Юрась СВІРКА,
Віктар ШНІП — *адказны сакратар*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 2332-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 2332-525, 2331-985

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 2332-525
пісьмаў і грамадскай думкі — 2331-985
літаратурнага жыцця — 2332-462
крытыкі і бібліяграфіі — 2331-985
паэзіі і прозы — 2332-204
музыкі — 2332-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 2332-153
выяўленчага мастацтва, аховы помнікаў — 2332-462
навін — 2332-462
мастацкага афармлення — 2332-204
фота-карэспандэнт — 2332-462
бухгалтэрыя — 2682-667

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856.
Наклад 5823
Нумар падпісаны ў друк 27.11.1997 г. у 17.30.

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715

Заказ 7084/Г

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12